КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 40 (263) ◂ 28 кастрычніка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ВЯРБОЎКА ДАВЯЛА ДА ПСІХУШКІ**

Стар. 6

**«ХАЙ БЫ ЯНО ЛЕПШ ПАМЕРЗЛА...»**

У навукова-практычным аграпрамысловым комплексе «Конвекс-Бел» (Маладзечанскі раён) не ведаюць, што рабіць з ураджаем капусты

Стар. 5

**РУСКІЯ ІДУЦЬ!**

4 лістапада па ўсёй Расіі пройдуць так званыя «Рускія маршы», якія могуць закончыцца новымі пагромамі. Пра значэнне «Рускага маршу» для думскіх выбараў журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з маскоўскім палітолагам Дзмітрыем Кастэнкам

Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**БУДНІ БЕЛАРУСКАГА САНАТОРЫЯ**

Нарыс Марыі Мартысевіч

З НАГОДЫ

# АД БУНТУ ГАЛОДНАГА — ДА БУНТУ КАШТОЎНАСЦЯЎ

Вольга ХВОІН

**Цягам аднаго тыдня ў краіне адбылося некалькі знакавых акцый публічнага вулічнага пратэсту. Розных па сваіх мэтах, сутнасці, арганізацыі і першаснаму выніку.**

### Галодны бунт

Стыхійны страйк у Барысаве прымусіў улады пайсці на саступкі. Прынамсі пратэстоўцам было паабяцана, што іх патрабаванне будзе выкананае. Работнікі барысаўскага ўнітарнага прадпрыемства «Жыллё» 24 і 25 кастрычніка не выйшлі на працу і не сталі вывозіць з двароў кантэйнеры са смеццем. Страйк абвясцілі на знак нязгоды з нізкімі зарплатамі. Сярэдні заробак работнікаў камунальнай службы складае 1–1,2 мільёны рублёў, некаторыя атрымліваюць па 600–700 тысяч.

Кіраўніцтва такі ўзровень заробкаў тлумачыць тым, што рост тарыфаў на камунальныя паслугі стрымліваецца, а таму і аплата камунальнікаў стаіць на месцы, піша барысаўскі сайт ex-press.by.



Акцыя салідарнасці 26 кастрычніка

Пасля двухдзённага страйку, візіту на прадпрыемства прадстаўнікоў Барысаўскага райвыканкама рабочым паабяцалі падвысіць зарплату на 20 працэнтаў. Гэта пратэстоўцаў пакуль задаволіла. Паказальна, што публічны і масавы (страйкаваў не адзін чалавек, а калектыў прадпрыемства) пратэст арганізаваўся стыхійна, без удзелу апазіцыйных лідараў. Канешне, вялікае пытанне, што застанецца ў сухім астатку — нельга выключаць той факт, што саступкі будуць часовымі, што зачыншчыкаў вылічаць і ўціхую звольняць. Але «каўбасны бунт» — акурат тая дзея, якой улада насамрэч і баяцца.

Істотна і тое, што падчас выканання сваіх прафесійных абавязкаў міліцыя затрымала журналіста барысаўскага інфармацыйнага рэсурсу ex-press.by Аляксандра Зянкова. «Мясцовыя ўлады не хочуць, каб падзеі са страйкаў асвятляліся ў любым выглядзе, бо гэта можа справакаваць хвалю пратэстаў па ўсёй краіне», — гаворыць журналіст Зянкоў. Грамадства ў стане сухога пораху — збядненне правакуе агрэсію, і цяпер ніхто не ведае, што можа стаць дэтанатарам да сацыяльнага выбуху, той апошняй кропляй, якая выведзе на вуліцу работнікаў не аднаго, а дзясяткаў прадпрыемстваў.

### Няўдалы нумар

Аднаго з арганізатараў Народных сходаў, старшыню Прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП) Генадзя Фядыніча ў Нацыянальным аэрапорце Мінск знялі з авіярэйсу і дэставілі ў суд. Фядыніча аштрафавалі на 40 базавых велічыняў (1 млн. 400 тыс. рублёў).

Прафсаюзны лідар накіроўваўся ў Прагу на пасяджэнне цэнтральнага камітэту Міжнароднай федэрацыі металургаў. З нагоды затрымання Фядыніча федэрацыя выступіла з адмысловай заявай. Федэрацыя прадстаўляе інтарэсы 25 мільёнаў працаўнікоў з 200 прафсаюзных арганізацый у 100 краінах свету.

Да слова, арганізатары Народных сходаў і суполка «Рэвалюцыя праз сацыяльную сетку» (ладзілі летам маўклівыя акцыі пратэсту) мяняюць фармат правядзення акцый: народныя сходы будуць склікаць у дварах, а маўклівыя акцыі трансфармуюцца ў форму фотаакцыяў. Стаўка на масавасць, сацыяльную актыўнасць людзей не апраўдалася. Ці мова, ці метады пакуль што не знайшлі актыўнага водгуку ў грамадстве. Бізун прэвентыўных рэпрэсій пакуль што аказаўся мацней.

### Бунт каштоўнасцяў

Ад 21 кастрычніка прадстаўнікі ініцыятывы «Еўрапейская Беларусь» абвясцілі бестэрміновую вулічную акцыю ў падтрымку палітвязняў. Але вялікая праблема ў тым, што ні масавасці, ні яўных палітычных лідараў (што і не дзіва, бо турэмныя тэрміны зусім не прывідна прысутнічаюць поруч) на гэтых акцыях няма. Выходзяць адзінкі. Але і гэтых смелых, калі не сказаць адчайных людзей «пакуюць» на суткі.

Парадокс: у любой чарзе ў краме людзі клянуць уладу за сваё жабрацкае існаванне. Але мала хто звязвае дабрабыт, напоўненасць уласнай кішэні з правамі і свабодамі чалавека, з агульнай справядлівасцю палітычнай сістэмы. Людзі гатовы адстойваць свой апошні (відаць, толькі калі ён направду блізкі да апошняга) кавалак хлеба, але не каштоўнасці, выпрацаваныя заходняй цывілізацыяй стагоддзямі.

І таму нават спачуванне выклікае былы палітвязень Васіль Парфянкоў, які самотна стаіць на плошчы, без транспарантаў, партрэтаў. Магчыма, ён таксама баіцца, але стаіць у знак салідарнасці і падтрымкі са сваімі, даруючы, чытачы, за цынізм, «калегамі» — экс-кандыдатамі ў прэзідэнты, палітычнымі дзеячамі, актывістамі грамадскасці, што «чаляцца» па зонах за тое, што думаюць інакш, што змагаюцца за іншую Беларусь.

Працяг на стар. 6 ▸

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЯШЧЭ ДЭПАРТАВАНЫ

Генадзь КЕСНЕР

**У ноч на сераду, 26 кастрычніка, з Беларусі дэпартаваны яшчэ адзін расійскі журналіст. Гэтым разам «пад раздачу» трапіў карэспандэнт вядомай расійскай газеты «Московский комсомолец» Ігар Кармазін. Цікава, што рашэнне аб дэпартацыі грамадзяніна Расійскай Федэрацыі прымалася на ўзроўні раённага ўпраўлення ўнутраных спраў.**

У аўторак, 25 кастрычніка, Ігар Кармазін сустракаўся з Ірынай Халіп — жонкай экс-кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Андрэя Саннікава, палітвязня, які зараз адбывае пакаранне пазбаўленнем волі за падзеі 19 снежня 2010 года, а таксама з былым палітзняволеным Мікітам Ліхавідам. Кармазін увогуле прыехаў у Беларусь, каб падрыхтаваць публікацыю пра тутэйшых апанентаў дзеючай улады.

Адразу пасля гэтых сустрэч расійскага журналіста затрымалі і даставілі ў РУУС Партызанскага раёна Мінска. Супрацоўнікі праваахоўных органаў сцерлі дыктафонныя запісы, «адкаталі пальцы», а потым уручылі Ігару Кармазіну паперу за подпісам намесніка начальніка Партызанскага РУУС Аляксандра Гладуна, дзе адзначалася, што яму забаронены ўезд на тэрыторыю Беларусі на адзін год. Адпаведны штамп з'явіўся і ў пашпарце журналіста. Пасля гэтага Кармазіна дэпартавалі. Дарэчы, калі журналіст наважыцца парушыць забарону, яму будзе пагражаць арышт і пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў.

Па словах намесніка старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэя Бастунца, паміж Расіяй і Беларуссю існуе пагадненне, згодна з якім павінны быць створаны спрыяльныя ўмовы і абставіны для дзейнасць расійскіх і беларускіх журналістаў на тэрыторыях абедзвюх краін. «Але мы бачым, што выпадак з Ігарам Кармазіным ёсць далёка не першым, які здарыўся з расійскімі журналістамі ў Беларусі. Гэтае пытанне знаходзіцца, хутчэй, у рамках палітыкі, але не ў рамках права, таму вельмі цяжка ацэньваць гэтую падзею з прававога пункту гледжання. А вось калі пытанне аб дэпартацыі грамадзяніна іншай дзяржавы вырашаецца на ўзроўні раённага ўпраўлення міліцыі, гэта выглядае проста смешна і недарэчна», — адзначыў юрыст.

Кіраўніцтва рэдакцыі «Московского комсомольца» ужо паведаміла, што збіраецца належным чынам адрэагаваць на паводзіны беларускіх уладаў у дачыненні да карэспандэнта выдання.

АКЦЫЯ

# ЗНОЎ «СТОП-БЕНЗІН»




**У чаканні істотнага падаражання паліва на аўтазапраўках анансаваная чарговая акцыя пратэсту кіроўцаў «Стоп-бензін». Яна павінна прайсці або ў дзень падаражання, або на наступны.**

«Чыноўнікі і ўлада канчаткова загналі народ у галечу. Павышэнне коштаў на аўтамабільнае паліва канчаткова падарвала сямейны бюджэт кожнай беларускай сям'і. А самы папулярны від паліва, які выбрала большасць аўтааматараў — дызельнае паліва — зраўнялі па коште з палівам, на якім ездзяць чыноўнікі і багатыя людзі — бензінам А–95. Мы, аўтааматары, выбіралі дызельнае паліва зыходзячы з жадання эканоміі свайго беднага заробку. Мы ўжо не можам сабе дазволіць не толькі купляць паліва, але і нармальна пракарміць і апрануць сваіх дзяцей. Менавіта на нас улады хочуць выехаць з крызісу, у які самі і завялі. Кошт дызельнага паліва наўпрост адбіваецца на цане тавараў і паслуг, гэта паліва, на якім працуюць усе грузаперавозчыкі», — гаворыцца ў закліку арганізатараў акцыі пратэсту.

Па іх словах, «у бліжэйшы час плануецца чарговае павышэнне коштаў на паліва, і павышэнне будзе не на 3–5%, а на 20–40%, неабходна выказаць сваю незадаволенасць і недавер ураду. І адзіным бяспечным спосабам выказаць сваё меркаванне з'яўляецца аўтамабільная акцыя пратэсту».

Месцамі правядзення акцыі «Стоп-бензін» абраныя плошча Незалежнасці, адрэзак да Кастрычніцкай плошчы і трохкутнік — вуліцы Свярдлова, Ульянаўская і Бабруйская.

Фармат: «Пасля 17.00 рухацца да плошчы Незалежнасці з любога кірунку, разварочваючыся ў любым дазволеным ПДР месцы. Вы можаце проста катацца па праспекце. Роўна ў 17.30 удзельнікі акцыі зніжаюць хуткасць, спыняюцца і ўключаюць аварыйку. Спыняемся, але ні ў якім разе не выходзім, капоты не адчыняем, дзверы блакуем! Сігналім паўгадзіны, каб урад нас пачуў. У 18.00 акцыя скончана».

Калі плошча Незалежнасці заблакаваная, акцыя пераносіцца на той самы час наступнага дня: «Але ніхто не забараняе сігналіць там дзе стаіш, асабліва гэта тычыцца вуліцы Бабруйскай у раёне чыгуначнага вакзала — хай людзі ў глыбінцы даведаюцца, што Мінск не маўчыць — мінчане незадаволеныя».

**Паводле інфармацыі Руху «За Свабоду»**

КНІГА

# НАШ ДОСВЕД — ЯПОНЦАМ

Эла ОЛІНА

**Кніга беларускага навукоўца Уладзіміра Бабенкі аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва «Як абараніць сябе і сваё дзіця ад радыяцыі» была выдадзена ў Японіі накладам 30000 асобнікаў. Прэзентацыя кнігі паспяхова прайшла ў Токіа.**

«Цікавасць да кнігі ў японцаў вялікая, і таму я думаю, што яна ім дапаможа», — адзначыў Уладзімір Бабенка пасля вяртання ў Мінск. Ініцыятарам і аўтарам перакладу кнігі для сваіх суайчыннікаў стала спадарыня Маса Тацумі.

Тацумі жыве ў Беларусі ўжо на працягу 13 гадоў. Удзельнічала ў дапамозе беларускім дзецям па вывядзенню радыенуклідаў з арганізма. Пасля аварыі атамнага рэактара на Фукусіме–1 вырашыла перакласці навуковую літаратуру аб радыяцыі і сабраць сродкі, каб дапамагчы свайму народу.

Масака Тацумі даўно супрацоўнічае з інстытутам «Белрад» — недзяржаўнай арганізацыяй, якая займаецца радыяцыйным маніторынгам насельніцтва Чарнобыльскай зоны і прадуктаў харчавання гэтага рэгіёна, распрацоўкай сродкаў забеспячэння радыяцыйнай бяспекі і абароны насельніцтва на тэрыторыях, забруджаны радыенуклідамі, правядзеннем навуковых даследаванняў. Інстытут быў створаны акадэмікам Васілём Барысавічам Несцярэнкам у 1990 годзе.

Калектыў інстытута распрацаваў кнігі, брашуры і вучэбны відэафільм аб тым, як зменшыць памеры накаплення радыенуклідаў і прапаноўваў іх жыхарам Чарнобыльскай зоны. Уладзімір Бабенка працуе ў лабараторыі спектраметрыі выпраменьвання чалавека інстытута «Белрад». Ён пастаянна праводзіць даследаванне беларускіх дзяцей на прыборы спектральнага выпраменьвання (СВЧ) і дае рэкамендацыі па прымяненню прэпаратаў. Неаднаразова выязджаў у экспедыцыі ў забруджаныя рэгіёны, сустракаўся з жыхарамі вёсак, вучнямі школ. Шчыльна працаваў з медыкамі, выкладчыкамі, выхавацелямі, назапасіў вялізны практычны досвед, які падзяліўся цяпер з японцамі.

Спадарыня Тацумі сутыкнулася з нежаданнем некаторых колаў японскага грамадства друкаваць усю інфармацыю аб стане здароўя людзей. Ёй давялося даводзіць японцам, што вынікі даследаванняў беларускага інстытута цалкам аўтарытэтныя, распрацаваныя прэпараты кшталту «Вітапект» — эфектыўныя і могуць дапамагчы знізіць нястачы, выкліканыя радыяцыяй.

ПАРАДЫ

# НА ЧЫМ ЗЭКАНОМІЦЬ РУБЕЛЬ

Вольга ХВОІН

**Пасля ўніфікацыі абменнага курсу цэны на шэраг тавараў зноў папаўзлі ўверх. Таму цікава, што і дзе можна набыць па старых коштах і тым крыху зэканоміць.**



Ад 1 лістапада даражэе праезд у грамадскім транспарце. Цяпер за адну паездку ў сталіцы трэба будзе заплаціць 1 300 рублёў. Пакуль што можна набыць талончыкі, жэтоны, праязныя на наступны месяц па старых коштах. Многа, канешне, на гэтым ашчадзіць не атрымаецца, але ўсё адно будзе прыемна.

А 24 кастрычніка на 16% павышаныя рознічныя цэны на цукар-пясок. Лімітавая максімальная рознічная цана на расфасаваны ў спажывецкую ўпакоўку цукар складзе 7 000 рублёў за кілаграм. На цукар вагавы, упакаваны ў мяшкі ад 25 да 50 кілаграмаў — 6400 рублёў. Гэта ўжо пятае павышэнне цаны на цукар у бягучым годзе.

Набыць салодзенькага пяску пра запас не атрымалася, бо новыя цэны ўвялі без папярэджання. Затое можна заправіць машыну, заліць каністру палівам па старых цэнах, якія хутка будуць абноўленыя недзе на 25 працэнтаў у бок падвышэння.

Віцэ-прэм'ер рэспублікі Анатоль Тозік нядаўна запэўніваў, што адпускныя цэны на медпрэпараты захаваюцца на цяперашнім узроўні на працягу 1–1,5 месяца. «Рэзкага росту не будзе. Пэўныя меры мы распачалі. Вы ведаеце, што да адзінай сесіі мы куплялі медпрэпараты па курсе Нацбанку. І мы стварылі запас на 1–1,5 месяца. Гэты рэсурс будзе працаваць», — сказаў Тозік.

Можам параіць нашым чытачам жыць па прынцыпу «давярай, але правярай». То бок схадзіць у аптэку і набыць вітамінаў, лекаў не чакаючы пераацэнкі. Тым больш, што яна дакладна будзе, і, як гавораць у сталічных аптэках, пакуль нават новыя партыі імпартных лекаў завозяць у абмежаваных аб'ёмах, бо ёсць сітуацыя напэўнасці. А аптэчныя прылаўкі тым часам апусташаюць запаслівыя грамадзяне.

У шэраг стратэгічных запасаў па старых коштах могуць патрапіць алей, мука, крупы — захоўваюцца доўга, кошты больш-менш стрымліваюцца.

Калі ёсць памкненні да новага і пэўныя грашовыя запасы, то можна, напрыклад, апладзіць курсы замежнай мовы на год наперад. Але чытайце дамову — каб там нічога не ўзгадвалася пра магчымую пераацэнку, і тады вы будзеце ў выйгрышы.

Таксама прыглядайцеся да дзяржаўных буйных крамаў — некаторыя з іх заключылі «джэнтльменскае пагадненне» з мясцовымі ўладамі, і кошты падвышаюць толькі тады, як завозіцца нейкі тавар па новых накладных.

Каб не быць вялікім аптымістам, раім звярнуць увагу на такія факты. Беларусь — безумоўны лідар у СНД па ўзроўню інфляцыі. У нашай краіне за студзень-кастрычнік 2011 года цэны выраслі на 74,5%, Казахстане — на 6,2%, Расіі — на 4,7%, Украіне — на 4,2%. Толькі ў верасні інфляцыя ў Беларусі склала 13,6%, Казахстане — 0,3%, ва Украіне — 0,1%. У Расіі ж кошты, наадварот, знізіліся на 0,04%. За першыя дзесяць дзён кастрычніка кошты на тавары і паслугі ў Беларусі выраслі на 3,4%. Інфляцыя ад пачатку года на 11 кастрычніка склала 80,4%.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ШТО ТАКОЕ «ДУХОЎНАСЦЬ»?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка заклапаціўся духоўнасцю і маральным аблічам беларусаў.**

Звяртаючыся да пісьменнікаў, 25 кастрычніка на сустрэчы з членамі грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», ён папрасіў іх смела ўзнімаць у сваіх кнігах сацыяльныя, светапоглядныя і маральныя праблемы сучаснасці. «Але не апускайцеся да вульгарнага ачарнення і пошласці», — прыводзіць словы Лукашэнкі прэс-служба прэзідэнта.

Пры гэтым ён дадаў, што шэсць гадоў таму была падтрымана ініцыятыва стварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі для аб'яднання здаровых творчых сіл.

Прэзідэнт адзначыў, што дзяржава імкнецца стварыць усе ўмовы для пісьменніцкай працы. Так, за 5 гадоў з бюджэту выдзелена больш за 16 мільярдаў рублёў на выпуск звыш 500 твораў агульным накладам 2 мільёна асобнікаў.

«Ваша грамадскае аб'яднанне карыстаецца беспрэцэдэнтнай падтрымкай дзяржавы. У адказ мы чакаем ад вас толькі аднаго — яркіх і таленавітых твораў. Гэта наша агульная зацікаўленасць», — сказаў прэзідэнт.

Паводле яго меркавання, чытач чакае сур'ёзных, маштабных твораў, якія б зламалі стэрэатыпнае ўяўленне пра беларусаў як пра вечна прыгнечаны, пасіўны і цёмны народ. «Насамрэч беларускі народ выстаяў перад тварам шматлікіх трагедый, войнаў і катастроф. Менавіта характар чалавека, яго духоўныя сілы заўсёды былі ў цэнтры самых значных мастацкіх твораў. І сёння востра стаіць праблема героя-сучасніка», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Што важна адзначыць са звароту Лукашэнкі да пісьменнікаў? Па-першае, «ініцыятыва стварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі» была падтрымана дзяржавай. То бок, Лукашэнка фактычна прызнаў, што менавіта дзяржава раскалола саюз пісьменнікаў на «правільных» і «няправільных». У «няправільных» забралі Дом літаратара.

Па-другое, што «ваша грамадскае аб'яднанне карыстаецца беспрэцэдэнтнай падтрымкай дзяржавы». То бок, мы цалкам можам называць Саюз пісьменнікаў праўладнай арганізацыяй, якая дзейнічае з прынцыпу «хто дзяўчынку корміць, той яе і танчыць».

І трэцяе: «дзяржаўныя» пісьменнікі не здольныя зацікавіць чытача. «Так, за 5 гадоў з бюджэту выдзелена больш за 16 мільярдаў рублёў на выпуск звыш 500 твораў агульным накладам 2 мільёна асобнікаў», — сказаў Лукашэнка. Але, паводле дадзеных кіраўніка дзяржавы, да канца 2010 года нерэалізаваныя рэшткі сацыяльна значных кніг выдавецтва «Мастацкая літаратура» складалі амаль 50% ад усіх выпушчаных найменняў і 30% ад іх накладу.

У прынцыпе, калі я чую такія рэчы, мне адразу ўзгадваюцца браты Стругацкія і іх «Брыдкія лебедзі». А канкрэтней — размова пісьменніка Віктара Банева з былым філосафам, а на момант сустрэчы «макрацом» Зурзмансорам. «Маральныя каштоўнасці не прадаюцца, Банеў. Іх можна разбурыць, купіць іх нельга. Кожная дадзеная маральная каштоўнасць патрэбна толькі аднаму боку, красці або купляць яе не мае сэнсу. Спадар прэзідэнт уяўляе, што купіў жывапісца Р. Квадрыгу. Гэта памылка. Ён купіў халтуршчыка Р. Квадрыгу, а жывапісец працёк у яго паміж пальцамі і памёр», — казаў Зурзмансор Баневу.

Таму я не веру ні ў падтрымку «дзяржаўных пісьменнікаў», ні ў тое, што ў свеце ёсць «сацыяльна значныя кнігі». Ёсць кнігі, якія чытаюць, якія, як у савецкія часы, прадаюць «з-пад палы», якія ў Беларусі забароненыя для продажу. І ёсць халтура.

Да прыкладу, паспрабуйце ў дзяржаўных крамах набыць «Сьцяну» Васіля Быкава, «Паранойю» Віктара Марціновіча, альбо «Аляксандр Лукашэнка. Палітычны партрэт» Валера Карбалевіча. Паспрабуйце знайсці творы Алеся Адамовіча, Святланы Алексіевіч… Нездарма ж першай ініцыятывай старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі было закрыццё выдавецтва «ЛогвінаЎ», якое якраз і аддае перавагу якасным кнігам. Тым, «якія б зламалі стэрэатыпнае ўяўленне пра беларусаў як пра вечна прыгнечаны, пасіўны і цёмны народ». Значна прасцей пісаць порна-раманы пра замежнае жыццё, кампенсуючы свае сэксуальныя комплексы, чым стварыць нешта накшталт «Рыбнага горада» Наталкі Бабінай, які трапіў у шорт-ліст самай прэстыжнай літаратурнай прэміі Цэнтральнай Еўропы — прэмію «Ангелус», якую заснаваў горад Уроцлаў.

І твор Бабінай жа выйшаў не ў «Мастацкай літаратуры», а ў серыі кнігарняў «Нашай нівы»!

Раман «Сцюдзёны вырай» Віктара Марціновіча выйшаў толькі ў электронным выглядзе на сайце 34mag.net. Як кажа аўтар, гэтая кніга не магла з'явіцца ў традыцыйным выглядзе з-за цэнзуры. Але, здаецца, і з гэтай з'явай Аляксандр Лукашэнка мае намер змагацца.

Беларусь навучылася змагацца з «рэвалюцыямі праз сацыяльныя сеткі», заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з удзельнікамі пасяджэння Савета Парламенцкай асамблеі АДКБ, якое праходзіла 26 кастрычніка ў Мінску. «Мы навучыліся змагацца з гэтым злом, і мы дамовіліся пра тое, што павінны каардынаваць нашы намаганні. Тут няма ніякага страху, тут няма ніякіх забаронаў. Мы ні ў якім выпадку не закрываем інтэрнэт, блогі, старонкі ў сацыяльных сетках. Мы нікому не супрацьдзейнічаем — калі ласка, гаварыце, абмяркоўвайце. Але калі гэта супрацьзаконнае дзеянне, мы адпаведныя меры прымаем», — падкрэсліў Лукашэнка.

А тым часам на Нацыянальным прававым партале з'явіўся законапраект, які ўводзіць штраф за доступ да забароненых сайтаў. Магчымыя змены датычацца не толькі абмежавання доступу да забароненых сайтаў, але таксама рэкламы на замежных сайтах і ўвядзення штрафу за адсутнасць базы дадзеных карыстальнікаў паслуг.

«Ажыццяўленне дзейнасці па рэалізацыі тавараў, выкананню работ, аказанню паслуг на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з выкарыстаннем інфармацыйных сетак, сістэм і рэсурсаў, якія маюць падключэнне да сеткі інтэрнэт, не размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і (або) не зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку, цягне накладанне штрафу на індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычную асобу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь. Парушэнне патрабаванняў заканадаўства аб абмежаванні доступу карыстальнікаў інтэрнэт-паслуг да інфармацыі, забароненай да распаўсюджвання ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі цягне накладанне штрафу на індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычную асобу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь».

Рабіце высновы, спадары пісьменнікі.




## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ДЗМІТРЫЙ БАНДАРЭНКА



Палітзняволены Дзмітрый Бандарэнка ў калоніі ходзіць на мыліцах. Пра гэта пасля спаткання з ім распавялі Радыё «Свабода» адвакат Юры Сташкевіч і жонка Дзмітрыя Вольга Бандарэнка. Стан здароўя Бандарэнкі пагоршыўся. Ён вымушаны па 15 хвілін стаяць падчас праверкі, нахіляцца, калі запраўляе ложак. Усё гэта адразу пасля аперацыі на спіне яму забаранілі рабіць лекары. Нягледзячы на тое, што Дзмітрый Бандарэнка ходзіць на мыліцах, адвакат распавёў, што палітвязень імкнецца выглядаць бадзёра.

Начальнік калоніі Сяргей Маханькоў патлумачыў Вользе Бандарэнцы, што палітыка перавялі з санітарнай часткі ў атрад, бо надышоў час перапынку ў лекаванні. Маханькоў паабяцаў, што адміністрацыя будзе прыслухоўвацца да медыкаў у справе здароўя Бандарэнкі.

27 красавіка даверанаую асобу кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава, каардынатара «Еўрапейскай Беларусі» Дзмітрыя Бандарэнку асудзілі на 2 гады калоніі агульнага рэжыму.

У палітыка пасля арышту дыягнаставалі некалькі грыжаў дыскаў хрыбетніка і ўшчамленне спіннамазгавых нерваў. У ліпені ў Рэспубліканскай турэмнай бальніцы Бандарэнку была зробленая аперацыя на спіне.

### ВІКТАР ГАНЧАРЭНКА




За чатыры туры да фінішу БАТЭ стаў васьміразовым чэмпіёнам Беларусі па футболе, устанавіўшы рэкорд па гэтым паказчыку (у мінскага «Дынама» засталося сем тытулаў). Каманда з Барысава нязменна займае першае месца ад 2006 года.

23 кастрычніка ў 29-м туры барысаўчане выйгралі на сваім полі ў жодзінскага «Тарпеда». «Па якасці гульні гэта адна з нашых лепшых гульняў у сезоне, — прыводзіць словы галоўнага трэнера БАТЭ Віктара Ганчарэнкі рэсурс football.by. — Мы былі свежымі. Гэта звязана з тым, што мы змянілі склад у параўнанні з нядаўняй гульнёй супраць «Мілана».

Галоўны трэнер БАТЭ таксама панаракаў на няўвагу журналістаў да тытулаванай каманды ў дзень трыумфу. «Больш за ўсё мяне хвалюе, што тут мала прэсы. Ільвіная доля журналістаў, напэўна, не ведала, што мы сёння чэмпіёнам можам стаць. Крытыку такіх журналістаў я не буду больш успрымаць. І хачу загадзя папрасіць, каб заўтра з просьбай аб інтэрв'ю мяне ніхто не турбаваў. Хто хоча, той задасць свае пытанні на сённяшняй прэс-канферэнцыі. Каманда стала чэмпіёнам краіны, а няма тут ні адной тэлекамеры», — заявіў Ганчарэнка.

### СЯРГЕЙ ЛАЗНІЦА



Рэжысёр Сяргей Лазніца здымае фільм па аповесці Васіля Быкава «У тумане». Сяргей Лазніца атрымаў мноства ўзнагарод і прызоў за фільм «Шчасце маё» (у тым ліку Гран-пры кінафестывалю «Лістапад–2010»), які быў прадстаўлены і ў праграме Канскага фестывалю.

Як распавёў генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Алег Сільвановіч, агулам у праекце занятыя кінематаграфісты шасці краін.

Карціна па аповесці Быкава — адзін з найбольш магутных «артаўскіх» праектаў, у якіх заняты «Беларусьфільм». Гэта міжнародны кінапраект, які рэалізуецца сумесна з Германіяй, Нідэрландамі, Латвіяй, Літвой і Расіяй. Як патлумачыў Алег Сільвановіч, асноўныя здымкі ўжо завершаныя, фільм выйдзе ў свет у маі наступнага года. У фільме па аповесці Быкава галоўную ролю гуляе беларускі акцёр, на мантажы гуку таксама беларускі спецыяліст.

Алег Сільвановіч адзначыў, што тая сістэма фінансавання, якая была нармальнай для кінагаліны раней, цяпер відазмяняецца і знаходзіць іншыя прынцыпы і механізмы. Паводле яго слоў, змяненне ўмоў фінансавання прыводзіць да неабходнасці прыцягнення пазабюджэтных грашовых сродкаў, што дазволіць здымаць больш фільмаў. Акрамя таго, важна, каб кінапрадукт з беларускім удзелам прысутнічаў не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Кіраўнік «Беларусьфільма» таксама дадаў, што цяпер перад кінастудыяй стаіць задача зрабіць эканамічна больш адчувальным эфект акупляльнасці грашовых сродкаў.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ВОСЕНЬ У ФІЛАДЭЛЬФІІ

*Сяргей НІКАЛЮК*

**Рэформы ў расколатым грамадстве праводзяцца не з мэтай задавальнення запатрабаванняў пэўных сацыяльных груп, а ў адказ на рост дэзарганізацыі эканомікі.**

Мая службовая камандзіроўка ў Амерыку заканчваецца. З чытаннем курсу паліталогіі майму ўнуку, мяркуючы па адсутнасці прэтэнзій з яго боку, я паспяхова справіўся. На сямейнай нарадзе заключную лекцыю было вырашана прачытаць на радзіме амерыканскай дэмакратыі ў Філадэльфіі ў будынку Індэпэндэнс-хола, дзе ў 1776 годзе была прынята Дэкларацыя незалежнасці, а ў 1787-м — Канстытуцыя ЗША. Пасля заканчэння лекцыі адбылася экскурсія па горадзе з наведваннем мэрыі. Сустрэча з мэрам прайшла ў сяброўскай атмасферы, г. зн. фармальна і нічым асаблівым не запомнілася. Значна цікавей падаліся гутаркі з амерыканцамі, якія разбілі перад будынкам мэрыі намётавы лагер.

## Замужжа як індыкатар дэмакратыі

Намётавы лагер у цэнтры Філадэльфіі — адзін з элементаў агульнанацыянальнага руху «Захапі Уол-стрыт», ініцыяванага, дарэчы, канадскай пратэстнай арганізацыяй «Адбустэрс». Заможныя карані руху — не нагода абвінавацiць яго амерыканскіх прыхільнікаў у прыналежнасці да «пятай калоны», як і не падстава ліквідаваць намётавыя лагеры, якія растуць сёння як грыбы па ўсёй краіне.

Права амерыканцаў пратэставаць зафіксавана ў першай папраўцы да Канстытуцыі. Прывяду яе тэкст цалкам: «Кангрэс не павінен выдаваць ніводнага закона, які тычыцца ўсталявання рэлігіі ці забараняе свабоднае спавяданне яе, ці абмяжоўвае свабоду слова ці друку або права народа мірна збірацца і звяртацца да ўрада з петыцыямі наконт задавальнення скаргаў». Адсутнасць законаў, што парушаюць правы грамадзян, — справа важная, але ёсць яшчэ і праваўжывальная практыка. На варце амерыканскага правасуддзя стаіць судовая сістэма на чале з Вярхоўным судом, і, мяркуючы па намётавым лагеры ў Філадэльфіі, з абавязкам гаранта Канстытуцыі яна спраўляецца.

Тут будзе дарэчы гістарычная даведка. Пасля прыняцця амерыканскай Канстытуцыі вельмі хутка выявілася яе сур'ёзная загана — адсутнасць артыкулаў, якія гарантуюць грамадзянскія правы. Адпаведныя дзесяць папраўак, што атрымалі пазней нефармальную назву «Біль аб правах», былі прыняты ўжо ў 1791 годзе. Усяго ж за больш чым 200-гадовую гісторыю амерыканскай Канстытуцыі ў яе занесена ўсяго 27 папраўкак (апошняя ў 1992 годзе).

Беларусам свабода сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетаванняў, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзян, таксама гарантуецца Канстытуцыяй. У якасці гаранта выступае дзяржава (артыкул 35). Пра тое, як яна спраўляецца са сваім канстытуцыйным абавязкам, суддзя Чыгуначнага раёна г. Віцебска Алена Грабянчук растлумачыла ў кастрычніку мясцовым апазіцыйным актывістам. Яны патрабавалі, каб суд даў ацэнку дзеянням кіраўніка адміністрацыі раёна, які не задаволіў за год ніводнай заяўкі на мітынг ці пікет. Суддзя, натуральна, скаргу адхіліла.

Тут я не магу ўтрымацца, каб не даць слова «адзінаму паліталогу» (АП): «Подлинная демократия — это гарантированный государством уровень жизни. Истинная демократия — это великое достижение и достояние человечества. Демократия — если просто говорить, это то общество, где женщина может чувствовать себя женщиной, спокойно выйти замуж, создать семью, гарантированно и спокойно родить детей, воспитывать их, дать образование и так далее, и так далее — вот суть демократии».



Філадэльфія. Сяргей Нікалюк з унукам

Беларускі варыянт дэмакратыі, калі зыходзіць не з Канстытуцыі, а з яе трактоўкі АП, наяўнасць у грамадзян палітычных правоў не прадугледжвае. Здавалася б, ну і Бог з імі. Галоўнае, каб дзяржава гарантавала ўзровень жыцця. Але вось тут і ўзнікаюць пытанні. Па-першае, не зразумела, пра які ўзровень жыцця ідзе гаворка. Не ўпэўнены, што паміж большасцю беларусаў і АП тут магчымы кансенсус. Мяркуеце самі: «Нашим людям много не надо, молока купить, хлебушка, ну может мяса деткам на праздник». Па-другое, няма ніякай гарантыі, што з малака і «хлебушка» беларусам ужо хуткім часам не прапануюць перайсці на «хлебушек» і ваду.

## Або калапс, або рэформы

Усё сказанае вышэй — толькі нагода падступіцца да ключавога для сапраўднай «Азбукі паліталогіі» слова «рэформа» (лат. reformo — пераўтварэнне, якое ўводзіцца заканадаўчым шляхам). Ці здольная беларуская ўлада рэфармаваць сваё ўласнае тварэнне — «беларускую эканамічную мадэль развіцця»? Перш чым паспрабаваць даць адказ на гэта пытанне, неабходна адзначыць, што рэформы на Захадзе карэнным чынам адрозніваюцца ад рэформаў у расколатых грамадствах з незавершанай мадэрнізацыяй.

На Захадзе рэформы грунтуюцца на зваротнай сувязі паміж грамадствам і кіроўнай элітай. Яны з'яўляюцца адказам на палітычны і эканамічны ціск пэўных груп інтарэсаў. Намётавы лагер, які я назіраў у цэнтры Філадэльфіі, — элемент такога ціску. Яго канчатковай мэтай з'яўляецца не дэстабілізацыя ў краіне, а пошук найбольш эфектыўных шляхоў развіцця грамадства і дзяржавы ў сучасных дынамічных умовах. Гучыць парадаксальна, але для захавання стабільнасці сёння неабходна ўвесь час змяняцца.

За якія змены выступаюць прыхільнікі руху «Захапі Уол-стрыт»? Звернемся да макраэканамічнай статыстыкі. За апошнія 30 гадоў унёсак фінансавага сектара ў прыбыткі амерыканскіх карпарацый павялічыўся з 20 да 50 працэнтаў. Фінансавы сектар з дапаможнага пераатварыўся ў дамінантны сектар эканомікі. Але гэта толькі частка праблемы. У шматлікіх амерыканскіх кампаній адлічэнні ў бюджэт у выглядзе падатку на прыбытак меншыя, чым сума выплат выканаўчым дырэктарам. Калі ў 2009 годзе суадносіны заробку шараговых супрацоўнікаў і кіраўнікоў складалі 263 да 1, то летась выраслі — 325 да 1. Адсюль асноўны лозунг маніфестантаў: «Нас — 99%». Маецца на ўвазе, што фінансавая эліта, складаючы ўсяго 1% насельніцтва, атрымлівае львіную частку створаных у краіне багаццяў.

Чым вышэй прыбыткі, тым вышэй норма зберажэння. Фінансавыя сродкі, канцэнтруючыся ў руках невялікай часткі насельніцтва, не спараджаюць адэкватнага росту попыту на тавары і паслугі. Гэта яны складаюць аснову спекулятыўнага капіталу, ім фондавыя рынкі абавязаны перыядычным надзіманнем бурбалак, а сыравінныя тавары — коштам, што ніяк не звязаны з суадносінамі попыту і прапановы.

Ёсць праблема, ёсць і рэакцыя грамадства на яе. Ці азначае гэта, што амерыканскія заканадаўцы пачнуць актыўна на яе адгукацца, у прыватнасці, рэспубліканская большасць у Кангрэсе перастане блакаваць спробы дэмакратаў павялічыць падаткі заможным? Хутчэй за ўсё, не. Але для гэтага і існуе працэдура выбараў. Хто сказаў, што цяперашнія суадносіны прыхільнікаў і апанентаў падвышэння падаткаў у амерыканскім парламенце ёсць велічыня адночы і назаўсёды дадзеная?

А зараз вернемся на родную зямлю. Практычна ўсе каналы зваротнай сувязі паміж грамадствам і ўладай у нас ці перакрытыя, ці адсутнічаюць зусім. Групы інтарэсаў ці не развітыя, ці душацца на корані. Адзіны легальны спосаб, з дапамогай якога насельніцтва ў стане данесці свае праблемы наверх, — скаргі. Аднак іх тэматыка строга абмежавана побытавымі праблемамі. Скардзіцца ў Адміністрацыю на суддзю Алену Грабянчук бессэнсоўна.

Але не ўсё так безнадзейна. Звернемся да досведу рэформаў у СССР. Яны ініцыяваліся зверху неадназначна, але не з мэтай задавальнення запатрабаванняў пэўных сацыяльных груп, а ў адказ на рост дэзарганізацыі эканомікі. У адной з «Азбук паліталогіі» я ўжо пералічваў піруэты, якія давялося здзейсніць Леніну за сваё надзяўгае жыццё ва ўладзе. Праз пяць гадоў пасля смерці правадыра яго паплечнікі былі вымушаны зноў кардынальна змяніць курс эканамічнага развіцця. Як і яго папярэднікі, новы курс упэўнена павёў краіну ў гістарычны тупік, выйсці з якога спрабавалі ўжо пад кіраўніцтвам Хрушчова, потым Брэжнева і Гарбачова.

Ініцыятары рэформаў кожны раз спадзяваліся на паскарэнне эканамічнага развіцця, грамадства ж разлічвала на перамогу прынцыпу ўраўняльнасці, успрымаючы яго як крыніцу рознага кшталту выгод. Фактычна народ чакаў ад рэформаў цуду. Аўтар гэтых радкоў яшчэ памятае, як у канцы 50-х асноўным элементам візуальнай агітацыі стаў «рог изобилия». Пасля таго, як сваю гістарычную місію ён выканаў, яго давялося замяніць сімволікай, якая адлюстроўвае поспехі ў заваяванні космасу.

Тое, што «беларуская эканамічнай мадэлі развіцця» бліжэйшым часам не пазбегнуць рэфармавання, з кожным днём робіцца ўсё відавочней. «Зайчык» быў асуджаны даскакацца да адзінага курсу, і гналі яго не патрабаванні крэдытораў, а патрабаванні эканомікі, якая апынулася на грані поўнай дэзарганізацыі. Нядаўняе адкрыццё віцэ-прэм'ера Анатоля Тозіка з нагоды падвышэння пенсійнага ўзросту варта разглядаць у якасці арыі з той жа оперы. І ў дадзеным выпадку выбіраць даводзіцца з двух варыянтаў: або калапс пенсійнай сістэмы, або яе рэфармаванне. Улада абярэ рэформы. Сумнявацца ў гэтым не даводзіцца.

Пра тое, якім чынам ажыццяўляюцца рэформы ў расколатых грамадствах, — тэма асобнай гаворкі.

## Замест пасляслоўя

На зваротнай дарозе ад будынка мэрыі я заўважыў сярод сухога жоўтага лісця зялёную паперку. Падняў — 10-доларавая купюра. Сапраўды, Амерыка — краіна неабмежаваных магчымасцяў.




Філадэльфія. Палатачны лагер

БІЗНЭС

# НАШТО СВАРЫЦЬ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ?

Таццяна ПОКУЦЬ

**Індывідуальныя прадпрымальнікі «Гандлёвага свету «Кальцо» (Малінаўка) ужо некалькі месяцаў змагаюцца за справядлівасць. У канфлікт умяшаўся Мінаблвыканкам, але плёну гэта не дало.**

Прадпрымальнік Аляксандр Р. займаецца продажам аўтааксесуараў больш за 10 гадоў. За гэты час не па сваёй волі, але са сваёй кішэні ён быў вымушаны замяніць гандлёвую палатку на новы шапік-ралет. Прайшло некалькі гадоў — сітуацыя паўтарылася. Летам 2011 года Аляксандра ў ліку многіх іншых прадпрымальнікаў выселілі з ралету, які знаходзіўся на вуліцы, у толькі што збудаваны і названы па-моднаму «Аўтамол».

«Плата за арэнду памяшкання ўзнялася ў паўтары разы, унутры цэнтр быў недароблены, стаянка для аўто існавала толькі на паперы, але мы спадзяваліся, што пераезд сябе апраўдае. Усё ж тут не мокнеш і не мерзнеш у халады, не згараеш ад сонца ў спякоту. Мы меркавалі, што пакупнікам будзе камфортней, дык іх будзе большаць і большаць», — гаворыць Аляксандр.

Пакупнікоў, можа, і большае, але не ў новым гандлёвым цэнтры — туды яны наўпрост не даходзяць. Паводле новага размеркавання асартыменту тавараў на кірмашы (пацвярджаецца загадам ад 28 ліпеня 2011 г. генеральнага дырэктара Барыса Барынгольца) гандаль новымі запчасткамі і аксесуарамі мусіць ажыцяўляцца выключна ў будынку «Аўтамола». Аднак на практыцы сітуацыя кардынальна іншая: некаторым прадпрымальнікам дазволілі паставіць новыя ралеты і застацца на старым месцы.

«Просім праверыць законнасць будоўлі новых гандлёвых аб'ектаў на тэрыторыі, дзе размяшчаўся стары аўтарынак. Па сутнасці, адных прадпрымальнікаў выгналі са сваіх гандлёвых месцаў, а другім прапанавалі альтэрнатыву ў выглядзе ўсталявання новых шапікаў на адкрытай пляцоўцы. Узнікае пытанне: хто матэрыяльна зацікаўлены ў працягу вулічнага гандлю новымі запчасткамі і аксесуарамі на адкрытай пляцоўцы, нягледзячы на тое, што ён мусіць быць перанесены ў гандлёвы цэнтр?» — прадпрымальніца Алена І., адна з падпісантаў скаргі, зачытвае першы зварот да Барыса Батуры, старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. Першы, таму што быў і паўторны аналагічны зварот пасля таго, як прадстаўнікі аблвыканкама выехалі на месца разабрацца ў канфлікце, і… нічога не змянілася.




Прадпрымальнікі арганізавалі некалькі абмеркаванняў праблемы з кіраўніцтвам аўтарынку, у прыватнасці са згаданым Барысам Барынгольцам і ягоным намеснікам спадаром Ткачовым. Падчас сустрэчаў адміністрацыя публічна паабяцала ліквідаваць незаконны гандаль новымі запчасткамі на вуліцы яшчэ да 11 верасня. Незаконны, бо, паводле адказу Мінаблвыканкама, у дамовы прадпрымальнікаў, якія засталіся працаваць на вуліцы, былі ўнесеныя змены, і яны не маюць права гандляваць новымі запчасткамі. Ужо канец кастрычніка, а яны гандлююць.

Дарэчы, прадпрымальнікі двойчы пісалі скаргі вядомаму бізнэсмэну Юрыю Авяр'янаву, кіраўніку праўлення «Гандлёвага свету «Кальцо» (які нейкі час быў у кіраўніцтве Беларускага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў) — адказаў не дачакаліся.

Алена паказвае інтэрв'ю гендырэктара Барынгольца ў адным з бізнэс-часопісаў: «Гэта як здзек з нас». Чытаю: «Мы вывучылі вопыт функцыянавання замежных аўтарынкаў і пераканаліся, што яны арганізаваны больш цывілізавана. Да таго ж, наведнікі нашага рынку за апошнія гады заўважна змяніліся — узровень іх даходаў вырас, яны сталі больш патрабавальныя да якасці абслугоўвання. Таму мы вырашылі перамясціць прадпрымальнікаў, якія гандлююць новымі і запаснымі запчасткамі і аксесуарамі, з шапікаў у сучасныя павільёны».

«Развялі нас, як хлопчыкаў», — падсумоўвае Аляксандр. — «Загналі ў цэнтр, дзе пустуе палова месцаў, паднялі арэндную плату, пакупнікоў няма — круціся як хочаш. На вуліцы ж гандлююць не толькі запчасткамі, а і маслами на разліў, глушыльнікамі, буйнымі кузаўнымі часткамі. Навошта пакупнікам ісці да нас, калі яны заадно ўсё купяць там?»

— «А навошта вы тады пайшлі ў цэнтр?» — «А як жа не пойдзеш, калі адміністрацыя мае права проста не заключаць дамову і наогул пагнаць цябе з працы?»

У сітуацыі Аляксандра апынулася мінімум паўсотні прадпрымальнікаў — столькі подпісаў людзей, якія не пабаяліся публічна выказаць сваю пазіцыю, я налічыла пад зваротамі да адміністрацыі кірмашу і абласных чыноўнікаў.

Паводле Аляксандра, апошні раз прадстаўнікі аблвыканкама наведалі кірмаш 24 кастрычніка: «Сказалі, пацярпіце да сакавіка, там проста не працягнуць кантракты з «непаслухмянымі» прадпрымальнікамі. А хто перашкаджае перапыніць дамовы зараз? Адміністрацыя мае на гэта права. Шмат разоў нас прасілі пачакаць і пацярпець, але штораз падманвалі».

Па чутках, каб атрымаць магчымасць гандляваць новымі запчасткамі і аксесуарамі на ажыўленай і прыбытковай пляцоўцы на вуліцы, дзе пакупнікоў у дзесяткі разоў болей за пусты цэнтр, прадпрымальнікі заплацілі міма касы па 10–15 тысяч долараў за месца. Так гэта ці не — пра гэта чытайце ў наступным артыкуле.

**P.S.** Імёны прадпрымальнікаў змененыя, кіруючыся матывамі бяспекі. Паводле нашай інфармацыі, некаторым з пратэстоўцаў ужо паступалі пагрозы пра верагоднае пазбаўленне працоўнага месца.

Працяг будзе

ГАСПАДАРЧАСЦЬ

# «ХАЙ БЫ ЯНО ЛЕПШ ПАМЕРЗЛА...»

**У навукова-практычным аграпрамысловым комплексе «Конвекс-Бел» (Маладзечанскі раён) не ведаюць, што рабіць з ураджаем капусты. Гародніна ўрадзіла, але захоўваць яе няма дзе: адмысловага сховішча гаспадарка не мае, захоўваць у буртах забараніў кіраўнік дзяржавы. А попыту на капусту няма.**



Фота аўтара

Ураджай у НП АПК «Конвекс-Бел» збіраюць наёмныя работнікі ад цэнтру занятасці Маладзечна

Дырэктар НП АПК «Конвекс-Бел» Уладзімір Паўлюкоўскі распавёў, што цяпер капусту выбіраюць з поля наёмныя работнікі. Напрыклад, людзі прыязджаюць з Маладзечна ад цэнтру занятасці насельніцтва. За дзень работніцы (а на полі ў асноўным працуюць жанчыны) атрымліваюць пяцьдзесят тысяч беларускіх рублёў, а таксама магчымасць набраць з сабою гародніны.

Капусту выбіраюць ды звозяць у бурты. Іншага сховішча ў гаспадарцы няма, бо на яго будаўніцтва спатрэбіліся б мільярды рублёў. Але захоўваць гародніну ў буртах забараніў Аляксандр Лукашэнка. «Палітычная справа», — заўважае кіраўнік «Конвекс-Бел».

Нагадаю, у верасні Аляксандр Лукашэнка, наведваючы з рабочай паездкай Мінскую вобласць, запатрабаваў забяспечыць захаванасць ураджаю. «У гэтым годзе будзе злачынствам, калі мы не будзем належным чынам захоўваць бульбу, гародніну, лён, ягады і іншае. Усё, што можам потым прадаць па высокіх коштах», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што яшчэ ў мінулым годзе было жорстка пастаўлена пытанне па захоўванню агародніны і пладовай прадукцыі: «Было сказана, што ў гэтым годзе нічога ў буртах не захоўваем. Гэта ідэалогія!» Гэтае гароднiннае пытанне Лукашэнка даручыў старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандру Якабсону ўзяць пад жорсткі кантроль.

А яшчэ ў маі гэтага года, наведваючы родную вёску, Аляксандр Лукашэнка заявіў кіраўніку Мінсельгасхарча Міхаілу Русаму: «Па гародніне попыт будзе шалёны. Таму, дзе толькі можна, там і саджайце».

За беларускім лідарам паўтарае і прэм'ер Мясніковіч. Падчас рабочай паездкі ў Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці ў кастрычніку ён запэўніў, што беларускай гародніны на прылаўках крам у Беларусі стане больш. Па словах прэм'ера, ужо сёння Беларусь не мае патрэбы ў імпарце бульбы ці мукі. Між тым, у краіне актыўна працуюць над павелічэннем аб'ёму вырошчвання гародніны.

Парадокс у тым, што гародніны вырасла і праўда многа. Вось капусту названая гаспадарка згодная прадаваць па мінімальных коштах — пяцьсот рублёў за кілаграм! Але няма ахвочых. «З Мінску прадукцыю браць не хочуць, з Расіі таксама сёлета перакупшчыкі не ездзяць, відаць, сваё нарасло, — гаворыць Уладзімір Паўлюкоўскі. — У нас тысяча тон капусты, галандскія сарты — качаны па пяць-восем кілаграмаў стаяць, а падзець яе няма куды! Хоць бы памерзла, дык перааралі б і без наступстваў. Бо так работнікам плацім, транспарт працуе, а хіба ж яна захаваецца доўга ў буртах?»

Пытаюся, чаму яны самі на Расію не возяць. «Дык у нас жа няма транспарту, мы вырошчваем, а як нам везці ў Маскву ці Хабараўск?» — недаўменна паціскае плячамі кіраўнік.

Уладзімір Паўлюкоўскі гаворыць, што дзяржава спускае заданні, колькі мусіць быць засеяна плошчы пад якія культуры, і гаспадаркі паказчыкі выконваюць. А вось куды потым падзець ураджай, ужо нікога не хвалюе. Да слова, не толькі капуста нікому не патрэбная, але і іншая гародніна. Буракоў сталовых нарасло пяцьсот тон, пакуль пакупнікі знайшліся толькі на дзвесце. Паводле слоў Паўлюкоўскага, сельская гаспадарка — прыбытковая справа. Але калі ёсць збыт, а не толькі закопванне грошай у зямлю.



Ураджай на палях ля вёскі Новае збіраюць курсанты Акадэміі МУС РБ

ПРАТЭСТ

# АД БУНТУ ГАЛОДНАГА — ДА БУНТУ КАШТОЎНАСЦЯЎ

◂ Працяг. Пачатак на стар. 1.

Але нават гэтыя адчайныя-адважныя адзіночкі — пагроза для ўладаў. Бо са сваім каштоўнасным пратэстам на вуліцу выйшаў адзін чалавек, заўтра — двое, а праз тыдзень — сто тысяч рабацяг з МАЗу пабачыць у гэтым магчымасць заявіць пра сваю незадаволенасць цэнамі і заробкамі не ў курылцы, а на плошчы ля Дому ўрада.

### Катастрофы ў краіне няма

Што гаворыць наконт адзінак і тысяч незадаволеных сацыялогія? Паводле даследавання Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), трэці квартал гэтага года быў багаты на падзеі, што паўплывалі на грамадскае меркаванне. «Гэта найбольш ёмiста перадае змена афіцыйнай ацэнкі з «крызісу ў краіне няма», на «катастрофы ў краіне няма». Гэта значыць, факт наяўнасці ў краіне крызісу ўладай прызнаецца, проста казаць пра гэта не прынята. Праехалі», — пішуць аналітыкі НІСЭПД.

У верасні на пытанне: «Ці лічыце вы, што беларуская эканоміка знаходзіцца ў крызісе?», сцвярджальна адказала 87,6 % рэспандэнтаў. У чэрвені доля такіх адказаў была на 6,1 пункта менш — 81,5%.

«У верасні, насуперак чаканням, не адбылося далейшага падзення індэкса матэрыяльнага становішча, больш за тое, ён, хай і нязначна, але павялічыўся. Магчыма, гэта звязана з адаптацыяй насельніцтва да ўмоў, якія пастаянна пагаршаюцца, па савецкім прынцыпе: перажылі голад, перажывем і багацце, — аналізуюць настрої грамадства эксперты НІСЭПД. — Здольнасць бачыць святло ў канцы тунеля — выключная прэрагатыва лаяльных да ўлады беларусаў. Іх перавага ў гэтым пытанні перад апазіцыйна настроенымі грамадзянамі наглядная: 19,8% на 2,1%. У 9,4 разы!»

А вось так рэспандэнты расставілі свае прыярытэты ва ўмовах крызісу.

Беларус жыве хлебам надзённым, праблемы палітычныя — на перыферыі яго інтарэсаў.

А гэта меркаванне ў дынаміцы. Пытанне «У якім напрамку развіваецца цяпер палітычнае жыццё Беларусі?» задавалі на піку эканамічнага крызісу 2009 года і гэтай восенню. Доля рэспандэнтаў, якія абралі варыянт адказу «развіццё дэмакратыі» скарацілася ў 2,1 разы, а варыянт «нарастанне хаосу, анархіі, пагрозы дзяржаўнага перавароту» — павялічылася ў 3,3 разы.

Упэўненасць у стабільным жыцці знікае. Але застаецца без адказу пытанне: калі ўласны дабрабыт і сістэма агульнапалітычных, сацыяльных каштоўнасцяў перасякуцца ў плоскасці беларускага грамадства?

**РАЗМЕРКАВАННЕ АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ: «ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ ХВАЛЮЮЦЬ ВАС АСАБІСТА БОЛЬШ ЗА ЎСЁ?», % (МАГЧЫМЫ БОЛЬШ ЗА АДЗІН АДКАЗ)**

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Вы ў апазіцыі да ўлады? | |
|---|---|---|---|
| | | Так | Не |
| Магчымасць далейшага падзення ўзроўню жыцця | 62,9 | 79,3 | 54,0 |
| Незабяспечанасць будучыні дзяцей | 45,5 | 41,4 | 46,9 |
| Адсутнасць валюты ў абменных пунктах | 38,6 | 39,8 | 39,5 |
| Цэны на бензін | 28,7 | 33,9 | 26,7 |
| Магчымасць страты працоўнага месца | 27,1 | 35,3 | 20,4 |
| Магчымасць пераменаў | 14,6 | 17,4 | 11,0 |
| Узровень карупцыі ў дзяржаве | 13,4 | 17,4 | 11,0 |
| Магчымасць страты незалежнасці Беларусі | 12,2 | 17,4 | 11,0 |

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ВЯРБОЎКА ДАВЯЛА ДА ПСІХУШКІ

Тацціяна ШАПУЦЬКА

**Мне ўдалося адшукаць Улада Міхайлава — таго самага інфарматара, які ў 2007 годзе даў рэзанансныя інтэрв'ю польскім СМІ наконт сваёй супрацы з КДБ.**



Нагадаем, агент Вектар (менавіта такі нік яму прызначылі ў КДБ) паехаў у Польшчу па праграме Каліноўскага, адкуль даносіў беларускім спецслужбам пра нашых студэнтаў. Пасля прызнання ў вярбоўцы Улад Міхайлаў публічна папрасіў прабачэння ў сакурснікаў і сяброў і выказаў спадзяванне, што нікому не нашкодзіў.

Зараз экс-агент жыве ў родным Гомелі і без доўгіх угавораў пагаджаецца распавесці акалічнасці свайго жыцця пасля таго скандалу.

*— Улад, у апазіцыйнай тусоўцы гуляюць чуткі, што ты патрапіў у псіхіятрычную бальніцу...*

— Гісторыя доўгая. У сакавіку 2007 года (прызнанне было дадзенае зімою 2007-га) я выехаў з Польшчы на дыпламатычнай машыне. Калі я прыехаў у Гомель, з-за гісторыі з вярбоўкай я вельмі моцна пасварыўся са сваімі сябрамі. Пайшоў на мост — хацеў скочыць, скончыць жыццё самагубствам. Не паспеў — мяне затрымала міліцыя. Даставілі ў РАУС і прапанавалі: ці ідзеш дадому, ці едзеш у шпіталь. Я не мог пайсці дадому — мне было вельмі дрэнна, таму выбраў лягчы на абследаванне ў шпіталь. Мне вызначылі дыягназ «параналідальная шызафрэнія», паставілі на ўлік. Я прабыў там недзе 4 месяцы. Пасля пайшоў вучыцца — паступіў у гомельскі ўніверсітэт.

Летам 2008 года я прыйшоў у гомельскі КДБ пісаць заяву наконт маёй вярбоўкі — хацеў даведацца, на якой падставе мяне вербавалі, хто даў ім такое права. Да мяне выйшаў чалавек з палітычнага аддзела, які нават пачаў дапамагаць мне — дыктаваў, як правільна пісаць. Ён усё ведаў і без маіх аповедаў. Калі я сказаў, што трэба выпускаць Аляксандра Казуліна, ён закрыў мяне ў пакоі, і тут прыехала брыгада з псіхушкі. Мяне гвалтоўна скруцілі і прывезлі ў бальніцу — паклалі на 3 месяцы. Пасля шпіталя я паспрабаваў атрымаць палітычны прытулак праз амбасады ЗША і Германіі, але не выйшла.

**Калі я сказаў, што трэба выпускаць Аляксандра Казуліна, ён закрыў мяне ў пакоі, і тут прыехала брыгада з псіхушкі. Мяне гвалтоўна скруцілі і прывезлі ў бальніцу — паклалі на 3 месяцы. Пасля я паспрабаваў атрымаць палітычны прытулак**

*— Чаму ты хацеў з'ехаць?*

— Я баяўся. Мне ўвесь час тэлефанавалі нейкія людзі, якія крычалі ў слухаўку «Мы цябе даб'ем» і іншую такую лухту. Не ведаю, хто гэта быў. Скідваў — пачыналі званіць на хатні тэлефон.

Я абвясціў галадоўку, напісаў пра гэта ў сваім ЖЖ. Я хацеў, каб КДБ даў нейкія тлумачэнні датычна маёй вярбоўкі і датычна таго, што яны выклікалі на мяне псіхушку, калі я прыйшоў пісаць заяву і быў у абсалютна адэкватным стане. Пасля прымусовага лячэння, калі мяне проста закалолі рознымі лекамі і закармілі таблеткамі, мне стала і фізічна, і псіхалагічна значна горш. Я прабыў без ежы і пітва 4 дні, болей не змог.

*— Ці была якая-небудзь рэакцыя з боку КДБ на тваю галадоўку?*

— Ніякай. Я не вытрымаў, узяў малаток і пайшоў на стаянку ля будынка КДБ. Я выбіў лабавое шкло ў сямі машынах супрацоўнікаў КДБ, біў адну за адной. Выбеглі людзі з КДБ, мяне затрымалі і адвезлі ў аддзяленне міліцыі. Спачатку я быў у ізалятары часовага ўтрымання, пасля мяне пасадзілі ў гомельскае СІЗА №3. Завялі крымінальную справу за хуліганства (ч.1 арт. 339). У СІЗА я сядзеў у камеры з маладымі адмарозкамі, якія ўвесь час збівалі мяне, здзекаваліся, шмат чаго было... Аднойчы, калі збівалі, паламалі нос. Я прабыў у СІЗА 4 месяцы.

***

З турмы экс-агента выпусцілі — праўда, не на волю, а прызналі неадэкватным і паклалі ў псіхіятрычны шпіталь на паўтары гады. Зараз Улад Міхайлаў таксама знаходзіцца на прымусовым лячэнні, але дома, з абавязкам раз на 2 тыдні прыязджаць на ўколы. Вучобу Улад кінуў. З-за хваробы афіцыйна працаваць Уладу забаронена — цішком ўладкоўваўся ахоўнікам, гандляваў дыскамі. Спрабуе выкупіць віну за супрацу з КДБ — стварыў сайт незалежных навінаў ploshcha.com.

Год вярбоўкі КДБ скончыўся для 25-гадовага Улада Міхайлава 2-й групай інваліднасці па дыягназе «паранаідальная шызафрэнія».

## КАЛОНКА ЮРЫСТА

# ГРОШЫ, МАЁМАСЦЬ, ЗЯМЛЯ



**Прапануем вашай увазе адказы вядомага юрыста і праваабаронца Алега Волчака на пытанні, што паступілі ў грамадскую прыёмную.**

- *У мяне на руках рашэнне раённага суда пра выплату адказчыкам (страхавая кампанія) страхавога пакрыцця. Днямі абласны суд у касацыйным парадку пакінуў рашэнне суда без зменаў. Што параіце рабіць далей, каб як мага хутчэй атрымаць ад страхавой кампаніі грошы?*
  *Фралоў С.А.*

Рэкамендую вам звярнуцца ў службу судовых выканаўцаў суда, які вынес першапачатковае рашэнне, з заявай пра распачацце выканаўчай вытворчасці.

Судовы выканаўца на падставе рашэння суда, якое ўступіла ў сілу, распачне выканаўчую вытворчасць і спагоніць са страхавой кампаніі належныя вам выплаты.

- *Ці падпадае падзелу маёмасць, якая была набытая ў шлюбе і прададзеная пасля разводу да падачы іску ў суд?*
  *Аляксандрава М.І.*

У пункце 2 Пастановы Пленума Вярхоўнага суда РБ ад 22.06.2000 г. №5 «Аб практыцы ўжывання судамі заканадаўства пры разглядзе спраў пра скасаванне шлюбу» адзначана: у склад маёмасці, што падпадае падзелу, уключаецца агульная маёмасць сужэнцаў, якая маецца ў іх у наяўнасці на дзень разгляду справы або знаходзіцца ў трэціх асобаў. Калі да разгляду справы сужэнцы ўжо не вядуць супольную гаспадарку, то суд дзеліць толькі тую маёмасць, якая з'яўлялася іх агульнай сумеснай уласнасцю да часу прыпынення вядзення агульнай гаспадаркі.

У адпаведнасці з Кодэксам пра шлюб і сям'ю, можна ў любы час заявіць іск пра тое, што маёмасць была нажытая сумесна падчас шлюбу, і, адпаведна, улічваючы роўнасць сужэнцаў у адносінах, прад'явіць іск пра частку гэтай маёмасці.

Суду важна даказаць, што маёмасць з'яўляецца сумесна нажытай.

- *Я з дзіцём зарэгістраваная і пражываю ў бацькоў. Мае бацька і маці не разведзеныя. За бацькам лічыцца штраф, прызначаны судом. Плаціць яго бацька не збіраецца. Ці могуць судовыя выканаўцы апісаць маёмасць маю і майго дзіцяці, і ці з'яўляюся я з дзіцем асобнай ад бацькоў сям'ёй?*
  *Наркевіч Т.Ф.*

У адпаведнасці з арт. 59 Кодэкса пра шлюб і сям'ю, сям'я — гэта аб'яднанне асобаў, звязаных паміж сабой маральнай і матэрыяльнай агульнасцю і падтрымкай, вядзеннем супольнай гаспадаркі, правамі і абавязкамі, якія вынікаюць са шлюбу, блізкага сваяцтва, усынаўлення. Так што вы з'яўляецеся асобнай сям'ёй. Вашу маёмасць (і вашага дзіцяці) судовыя выканаўцы апісаць не маюць права, але паспрабаваць могуць (у парушэнне закона, зразумела). Штраф з'яўляецца пакараннем індывідуальным. Не хвалюйцеся, але і актыўна адстойвайце сваю пазіцыю. Калі ёсць дакументы, якія пацвярджаюць, што гэта маёмасць набытая менавіта вамі (квіткі, дамовы, гарантыйныя талоны, сведкі), загадзя іх падрыхтуйце.

- *Падкажыце, на якіх умовах праходзіць аўкцыён у сельскіх выканкамах на куплю ўчастку? Ці вяртаюць задатак, якая мінімальная колькасць удзельнікаў, ці можа адзін заяўнік атрымаць участак?*
  *Сасноўская В.А.*

Указам Прэзідэнта РБ ад 5.05.2009 г. №232 «Аб некаторых пытаннях правядзення аўкцыёнаў (конкурсаў)» у пункце 1.2 устаноўлена, што пры арганізацыі і правядзенні аўкцыёнаў (конкурсаў) — удзельніку, не які выйграў, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, задатак павінен быць вернуты на працягу пяці працоўных дзён з дня правядзення аўкцыёну (конкурсу).

Паводле Пастановы Савета Міністраў РБ ад 26.03.2008 г. №462, зямельны ўчастак здымаецца з аўкцыёну па рашэнні камісіі ці арганізацыі да пачатку правядзення аўкцыёну ў выпадку адсутнасці ўдзельнікаў аўкцыёну або калі на зямельны ўчастак прэтэндуе толькі адзін удзельнік аўкцыёну.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 31 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**07.30, 08.25** Дзелавое жыццё.
**08.30** Культурныя людзі.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка».
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**12.10** Прыгодніцкая камедыя «Марлі і я» (ЗША).
**14.15** Здароўе.
**14.45** «Косава. Маленькі горад з вялікай гісторыяй». Дакументальны фільм.
**15.10, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Авантурная меладрама «Добрая жанчына» (Вялікабрытанія-Італія).
**17.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.50** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Арэна.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Камандзіроўка.
**22.00** Прыгодніцкая драма «Больш Бэна» (Вялікабрытанія).
**23.45** Дзень спорту.
**00.00** Дак. цыкл «У пошуках праўды».

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Аляксандр Зацэпін. «У агнядышнай лаве кахання…».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адкрыты фармат».
**22.10** Прэм'ера. «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Прэм'ера. «Лёс на выбар».
**00.10** «След».
**01.40** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Вялікі горад».
**11.15** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Прошаная вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм«Брат». Расія, 1997г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Канцэрт «Gven Stefani. Harajuku Lovers Live».
**12.05** Рэальны свет.
**12.40** Авантурная камедыя «Сястрычка Бэці» (ЗША-Германія).
**14.45** Навіны надвор'я.
**15.15** Жаночая ліга.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.50** Ваенны баявік «Замах».
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. Прамая трансляцыя.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**23.30** Авертайм.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**00.55** Ваенны баявік «Замах».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**12.55** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 00.15** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**23.25** Тэлесерыял «Я цябе ніколі не забуду».
**00.25** Прэм'ера. «Хроніка аднаго пакарання смерцю. Хрушчоў супраць Рокатава».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Кажам і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Серыял «Марскія д'яблы. Лёсы».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** Серыял «Сталіца граху».
**01.15** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45, 12.30, 17.30, 20.30, 00.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). Фінал.
**11.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**14.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Мужчыны. Адвольная праграма.
**15.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**16.00** Снукер. Мастэрс. Шанхай (Кітай). Фінал.
**18.30** Футбол. Часопіс.
**19.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Браціслава (Славакія).
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.30** Футбол. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона «Свабоды».
**08.10** «Малая Масква», серыял: 3 серыя.
**08.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.15** Беларускія лёсы: «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**09.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.05** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**10.30** «Пупэнда», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**12.25** Дакументальная гадзіна: «Банахавы прасторы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**13.15** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**13.10** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**14.10** «Пупэнда», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**16.05** Дакументальная гадзіна: «Банахавы прасторы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**17.00** «Таямніца Сагалі», серыял: 3 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Дакументальная гадзіна: «Банахавы прасторы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**18.55** Беларускія лёсы: «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**22.00** «Пупэнда», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**23.50** Аб'ектыў.
**00.15** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 1 ЛІСТАПАДА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**12.10** Драма «Рускія браты» (СССР).
**13.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.45** Камандзіроўка.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм.
**15.55** «Асобны чалавек». Дак. фільм.
**16.20** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.20** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**18.20** Сфера інтарэсаў.
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Актуальнае інтэрв'ю.
**19.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. БАТЭ - Мілан. Прамая трансляцыя.
**22.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**22.45** Драма «Памятай мяне» (ЗША).
**00.50** Дзень спорту.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм.
**23.20** «Анатоль Папанаў. Ад камедыі да трагедыі».
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм«Брат». Расія, 1997 г.
**10.40** «Справа адмысловай важнасці».
**11.40** «Прошаная вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Апошняя справа Ламаркі». ЗША, 2002 г.
**15.50** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «07-ы змяняе курс». Расія, 2007 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** СТБ прадстаўляе: «Таямніцы нараджэння энергіі».
**23.30** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант 2». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія). Заключная серыя.
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**12.30** Авертайм.
**12.55** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**13.20** Рэальны свет.
**13.55** «Дзіўныя прыгоды Дэніса Караблёва». Камедыя. 1-я і 2-я серыі.
**16.20** Медычныя таямніцы.
**16.55** Ваенны баявік «Замах».
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія). Заключная серыя.
**20.00** Жаночая ліга.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Беларуская часіна».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Арсенал - Марсель. Прамая трансляцыя.
**00.40** Спорт-кадр.
**01.05** Ваенны баявік «Замах» (Беларусь-Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**23.25** Тэлесерыял «Я цябе ніколі не забуду».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Бітва за «Салют». Касмічны дэтэктыў».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Кажам і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА.
**22.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.05** Серыял «Сталіца граху».
**00.45** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Матаспартыўны часопіс.
**10.00** Футбол. Часопіс.
**11.00** Снукер. Мастэрс (Кітай). Фінал.
**12.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**13.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Жанчыны. Адвольная праграма.
**14.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). Фінал.
**16.00** Снукер. Фінал.
**17.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Жанчыны. Адвольная праграма.
**18.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**20.00** Футбол. Часопіс.
**21.00** Бокс.
**22.00** Бокс. Чэмпіянат свету па версіі WBA. Германія.
**00.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**00.15** Ралі. Ралі-рэйд. Егіпет. Агляд.
**00.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**01.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Жанчыны. Адвольная праграма.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Непахаваныя», маст. фільм, 2004 г., Польшча–Славакія–Венгрыя.
**09.40** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**10.10** «Таямніца Сагалі», серыял: 3 серыя.
**10.35** Еўропа сёння.
**11.05** Невядомая Беларусь: «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**11.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**12.00** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**12.30** «Гняздо», серыял: 9 серыя.
**13.25** «Непахаваныя», маст. фільм, 2004 г., Польшча–Славакія–Венгрыя.
**15.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.35** «Таямніца Сагалі», серыял: 3 серыя.
**16.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**16.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 6 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Эксперт.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 14 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.40** Невядомая Беларусь: «Дзень памінання», дак. фільм, 2011 г., Польшча.
**22.10** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**22.50** Басанож па свеце.
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 2 ЛІСТАПАДА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**12.10** Драма «Наш бронецягнік» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**13.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм.
**15.45** «Міхась Пташук». Дак. фільм.
**16.10** «Сівая легенда Уладзіміра Караткевіча». Мастацка- публіцыстычны фільм.
**16.45** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.45** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.50** «Кропка адліку. Славацкі серпантын». Відэаэстужка АТН.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Ліён - Рэал. Прамая трансляцыя.
**00.50** Дзень спорту.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм.
**23.20** Асяроддзе пасялення.
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «07-ы змяняе курс». Расія, 2007 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Прошаная вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** « Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Сэрцаед». Францыя - Манака, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.55** «Хірамант 2». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Баявік «Бой з ценем» (Расія). 1-я серыя.
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Валенсія - Байер.
**12.35** Рэальны свет.
**13.10** Спорт-кадр.
**13.40** Героіка-прыгодніцкі фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (СССР).
**15.10** Жаночая ліга.
**16.15** Медычныя таямніцы.
**16.50** Ваенны баявік «Замах» (Беларусь-Расія).
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Беларуская часіна».
**22.35** Баявік «Бой з ценем» (Расія). 1-я серыя.
**23.35** Рэальны свет.
**00.05** Ваенны баявік «Замах» (Беларусь-Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**23.25** Тэлесерыял «Я цябе ніколі не забуду».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Гістарычны працэс».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Кажам і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Серыял «Марскія д'яблы».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Серыял «Сталіца граху».
**00.30** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**09.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**11.15** Снукер. Фінал.
**12.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.40** Футбол. Ліга Еўропы. Жанчыны. 1/16 фіналу. Першы матч.
**14.00** Live. Футбол.
**16.00** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Польшча. Дзень 3-і.
**17.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**18.00** Live. Футбол.
**20.00** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**20.40** Абранае па серадах.
**20.45** Конны спорт. FEI Classics Series.
**21.45** Конны спорт. Кубак свету (Францыя).
**22.45** Навіны коннага спорту.
**22.50** Гольф. Тур PGA. The CIMB Asia Pacific Classic.
**23.50** Гольф.
**00.20** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.25** Ветразевы спорт.
**00.55** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**01.05, 01.45** Футбол.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 14 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**09.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 6 серыя.
**09.25** На колах.
**09.55** Рэпартэр.
**10.15** Асабісты капітал.
**10.35, 15.05** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 2.
**10.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**10.55** Беларусы ў Польшчы.
**11.10** «Ранча», серыял: 1 серыя.
**12.00** «Арол», серыял: 14 серыя.
**13.00** На колах.
**13.25** «Тры шалёныя нулі», серыял: 6 серыя.
**13.55** Эксперт.
**14.20** Асабісты капітал.
**14.35** Два на два (тэледыскусія).
**15.15** «Дзённік «Народнага альбома», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**16.15** Беларусы ў Польшчы.
**16.30** Рэпартэр.
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 6 серыя.
**17.30** Невядомая Беларусь: «Дзень памінання», дак. фільм, 2011 г., Польшча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**18.45** «Манастыр», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Хто ёсць кім?: «Крыстына Шацікава – Рыжая».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю права.
**21.45** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 13 серыя.
**22.20** Два на два (тэледыскусія).
**22.45** Аб'ектыў.
**23.10** Гарачы каментар.

## 3 ЛІСТАПАДА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.20** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**10.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна - Расія).
**12.10** Драма «Наш бронецягнік» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.30** «Планета гольфу: Украіна». Відэастужка АТН.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Прэм'ера. «Я - часавы вандроўнік. Якуб Колас. Паэт і чалавек». Дак. фільм.
**16.10** Здароўе.
**16.40** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія). Заключная серыя.
**17.45** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў.
**22.30** Меладрама «Смяцяр» (Расія).
**00.30** Дзень спорту.
**00.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. «Шчаслівыя разам». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм.
**23.20** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Сэрцаед». Францыя - Манака, 2010 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Прошаная вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Акулы ў Малібу». Аўстралія, 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант 2». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Баявік «Бой з ценем» (Расія). 2-я серыя.
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
**12.35** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**13.00** Страсці па культуры.
**13.45** Героіка-прыгодніцкі фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (СССР).
**15.20** Жаночая ліга.
**16.20** Медычныя таямніцы.
**16.55** Ваенны баявік «Замах» (Беларусь-Расія).
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.00** Баявік «Бой з ценем» (Расія). 2-я серыя.
**19.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Прамая трансляцыя.
**21.55** КЕНО.
**22.00** Тэлебарометр.
**22.05** Час футболу.
**22.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ.
**00.35** Ваенны баявік «Замах» (Беларусь-Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Вясна ў снежні».
**23.25** Тэлесерыял «Я цябе ніколі не забуду».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Паядынак».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.30** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Кажам і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы. Лёсы».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.45** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.
**01.40** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету. Часопіс.
**10.00** Футбол.
**11.00** Снукер. PTC (Players Tour Championship). Польшча. Дзень 3-і.
**12.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**12.40** Футбол.
**14.15** Футбол.
**16.00** Снукер. PTC (Players Tour Championship). Дзень 3-і.
**17.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**18.00** Live. Футбол.
**20.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Покер.
**01.00** Футбол.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 13 серыя.
**08.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**08.45** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 6 серыя.
**09.15** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.45** «Татальны кантроль», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**11.15** Хто ёсць кім?: «Крыстына Шацікава – Рыжая».
**11.30** Маю права.
**11.50** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**12.05** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**12.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 13 серыя.
**13.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**13.45** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.30** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 6 серыя.
**15.00** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**15.25** «Татальны кантроль», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 10 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новы час», дак. фільм, Боснія і Герцагавіна.
**18.40** «Малая Масква», серыял: 3 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**22.30** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №10 (62) (кастрычнік)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


## Анонс


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё кастрычніка .............. с. 2.
«ЭСЭ»: развагі Густава МУРЫНА і Ігара ТУМАША .............. с. 3.
«ПОСТАЦІ»: Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК — пра Клаўдзія ДУЖ-ДУШЭЎСКАГА .............. с. 4–5.
«ПАЭЗІЯ»: вершы Сяргея ПРЫЛУЦКАГА .............. с. 6.
«ПРОЗА»: «Ахілес і Барбара» Анкі УПАЛЫ .............. с. 7.
«ФОРУМ»: «Герадоцінкі, або Штурханіна пачуццяў» Леаніда ДАЙНЕКІ .............. с. 8–9.
«ВОЖЫК»: фельетон Кузьмы ВЯСЁЛАГА .............. с. 10.
«ПЕРАКЛАД»: быліцы Зьбігнева Влодзімежа ФРОНЧАКА .............. с. 11.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: «Білет на Армагедон» Алеся КОМСІЧА .............. с. 12.
«УСПАМІНЫ»: «Віленскія метамарфозы» Алега АНЦУКЕВІЧА с. 13–14.
«КРЫТЫКА»: развагі ЛеГАЛа пра новы нумар часопіса «Дзеяслоў» .............. с. 15.
«КАЛЕЙДАСКОП»: агляд літнавінаў замежжа, конкурсы .............. с. 16.


**АПОВЕД**

# КРУМКАЧЫ

Андрэй РАСІНСКІ

Ветэран хацеў перастраляць крумкачоў. Груганнё кружылася і білася, і клекатала; крумкачыны шоргат крылаў замінаў ветэрану. І ляцелі сцятыя чорнымі літарамі аркушы — у пошуках чарговага адрасата.

…Адной цудоўнаю раніцай літаратарка прыйшла на працу; вахцёрка чамусьці паглядзела на яе з-пад ілба. Маўчалі калегі, быццам хацелі сказаць нештка. Шапталіся сакратаркі: як толькі літаратарка паварочвалася, яны заціхалі; блукалі зляканыя ўсмешкі, начэпленыя дзеля галачкі.

Роднае гняздо раптам нагадала літаратарцы магілу, дзе стаяла вада. У інстытуцкі дворык заехаў абшарпаны аўтобус, падобны на катафалк.

— Ганна Казіміраўна, вас кліча дырэктар!

Дырэктар доўга кашляў і не ведаў, з чаго пачаць. Потым развярнуўся і сказаў:

— І не надакучыла вам, даражэнькая, быць белай варонай?

Дырэктар інстытута лічыўся вялікім ліберaлам. Ён нават размаўляў зрэдку па-беларуску — калі афіцыйных асобаў не было побач.

— Мы цярпелі, калі вы цягнулі пісьменнікаў, чыё зацверджанне дасюль не пацверджана. Мы цярпелі, калі вы плявузгалі ў сеціве… гэта самае… і без Інстытута. Але сёньняшні цудоўны цуд…

Літаратарка маўчала.

— Самі пра грахі свае здагадаецеся ці мне падказаць?

З глыбіняў падначаленай памяці выплыла: чыесьці ваенныя мемуары жанчына папракнула за стылёвыя хібы. Грэх быў у гэтым.

— Вы лепей паслухайце, што пра вас пішуць, — абураўся дырэктар: «Літаратурная жаба, якая сваімі вушамі засланяе святло сапраўднай праўды пра вайну…». Вы ведаеце, адкуль да нас прыйшоў гэты ліст? Спушчаны ён…

— Адкуль?

Дырэктар з клёкатам закаціў вочы:

— Хіба не ведаеце, у якой дзяржаве вы жывяце!?

Літаратарка ведала, але прамаўчала.

— Значыць, так. Зараз вы паедзеце да ветэрана і папросіце ў яго прабачэння. Аўтобус ужо замоўлены. З вамі будуць таварышы, — кіраўнік цяжка ўздыхнуў. — Аднаго я не магу зразумець, Ганна Казіміраўна. Вось вы дарослы чалавек. Ну навошта вы атруцілі сабаку старога? А потым яшчэ тэлефанавалі няшчаснаму — і гучна брахалі ў слухаўку?

— Аляксандр Платонавіч! Вы самі хіба верыце ў тое, што гаворыце?



Стары і птушка. Малюнак Алега Кастагрыза

Дырэктар не верыў, але быў на пасадзе.

— Ідзіце! І майце на ўвазе…

Ветэран літаратарцы не адчыніў, колькі тая ў кватэру не грукала. Толькі за дзвярыма кашляў і выў злы сабака. Прасіцелька азірнулася на калегаў. Перабіралі нагамі літаратары і тыпографы. Захапілі нават аднаго грузчыка для саліднасці. Але дзвярэй усё роўна ніхто не адамкнуў.

Увечары літаратарка плакала ў кампаніі псіхіятаркі.

— Гэта манюка! Яму і трох гадоў не было, калі вайна скончылася! А я толькі пра стыль узгадала!

— Можаш заўжды разлічваць на мяне, — сказала псіхіятарка, адсунуўшыся далей ад сяброўкі.

Неўзабаве псіхіятарку запрасіў да сябе галоўны лекар.

— Нам, канешне, усё роўна, з кім вы сябруеце, але вы працуеце ў дзяржаўнай установе, — сказаў ён развжліва. — Я не збіраюся вас дзяўбсці. Прэміяльную ведамасць пасуныце мне…

— Я ні з кім такім не сябрую, — ад усёй душы прызналася псіхіятарка.

— Да нас дайшлі сігналы, што вы пляцеце змовы супраць вельмі паважанага чалавека.

Псіхіятарка здзівілася:

— Людзям сталага веку часам патрэбная прафесійная дапамога… ці не так? — удакладніла яна.

— Вось вы паедзеце да дарагога ветэрана, — згадзіўся доктар, — і папросіце ў яго прабачэння. Гэта ваш прафесійны абавязак перад айчынным псіхіятрыяй.

Лекарка ўсё яшчэ думала, як паступіць з важным пацыентам, калі дзверы ветэранскай кватэры адчыніліся і кашчавая сухая рука кінула яе на падлогу.

— На калені, — прахрыпеў пацыент. — Вочы ў "ветэрана" былі бліскучыя і чырвоныя.

Псіхіятарка адчула на сваёй скроні рулю пісталета.

— Пах! — сказаў "ветэран" і сагнуў закарэлы палец у сталёвым напарстку, прыстаўлены да чужой галавы. — Пах!

— Я мог бы забіць цябе, як забіў сваю маці. Але ідзі з мірам. Я ўсё дарую.

Псіхіятарка дзяўбла падлогу ў канвульсіях.

«Ветэран» заплюшчыў вочы.

Шоргат крумкачыных крылаў стаў мацнейшым; клёкат біў у вушы. Чарноцце засланіла святло — і затапіла свядомасць.

**ВЕРШАСЛОЎЕ**

# ПЕРАМЕН!

Віктар ЦОЙ

*Заміж святла — выцвіласць шкла,*
*замест агню — дым.*
*У сетцы календара выкрасліць дзень.*
*Чорнае сонца згарае датла,*
*дзень дагарае з ім.*
*На расплаўлены горад падае цень.*

***Прыспеў:***
*Перамен! — прагнуць сэрцы здаўна.*
*Перамен! — просяць вочы святла.*
*Ў нашым рогаце, ў нашых слязах*
*і ў пульсацыі вен…*
*Перамен! Чакай перамен.*

*Электрычнасць і ўночы працягвае дзень,*
*і з запалкамі зноў занятад,*
*але ў кухні сіняй каронай гарыць газ.*
*Цыгарэты ў руцэ,*
*чай на стале —*
*дужа просты расклад.*
*І больш нічога не трэба —*
*ўсё знаходзіцца ў нас.*

***Прыспеў.***

*Зоркім вокам ніхто не пахваліцца з нас*
*і умелымі рухамі рук.*
*Нам не трэба таго, каб адно аднаго*
*паважаць.*
*Цыгарэты ў руцэ,*
*чай на стале.*
*Кола замкнулася тут.*
*І вось нам становіцца страшна*
*нешта змяняць.*

***Прыспеў:***
*Перамен! — прагнуць сэрцы здаўна.*
*Перамен! — просяць вочы святла.*
*Ў нашым рогаце, ў нашых слязах*
*і ў пульсацыі вен…*
*Перамен! Чакай перамен.*
*Пе-ра-мен! Прага да перамен.*



**Пераклаў з расійскай Анатоль Івашчанка**

ПАЛІЦА

## НОВЫ ЗБОРНІК ПАЭЗІІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

**У выдавецтве мінскага касцёла Святых Сымона і Алены (Чырвонага касцёла) выйшаў новы зборнік вершаў Рыгора Барадуліна «Аніма».**

Складальнікамі кнігі выступілі ксёндз-пробашч касцёла, кандыдат гістарычных навук і магістр тэалогіі Уладзіслаў Завальнюк і Ала Сакалоўская, якая таксама з'яўляецца рэдактарам зборніка.

«Аніма» (па-лацінску — душа) стала дзясятай кнігай вершаў Барадуліна, якую Чырвоны касцёл выдаў за апошнія шэсць гадоў.

«Аніма» — тэматычны зборнік, падкрэсліла рэдактар, дадаўшы, што ў ім сабраныя кананічныя малітвы ў паэтычнай інтэрпрэтацыі аўтара, біблейскія балады, псалмы, вершы-малітвы, а таксама вершы пра сэнс жыцця, пра вялікую любоў да бацькі, маці, роднай зямлі.

«У сваіх вершах Барадулін кажа пра тое, што чалавек не можа жыць толькі зямным, свецкім, не паглыбляючыся ў сябе, у духоўнасць, — патлумачыла А. Сакалоўская. — Вонкавы свет — гэта абалонка, шалупіна, ён часовы. Веліч жа чалавека — у яго багатым унутраным свеце, таму што дух вечны. А Барадулін — высокадухоўны чалавек. Усё, пра што ён піша, мае душу».

Зборнік «Аніма» выйшаў накладам 500 асобнікаў і на сённяшні дзень прадаецца ў кніжным кіёску Чырвонага касцёла. Аднак рэдактар кнігі адзначыла, што ў хуткім часе гэты зборнік з'явіцца ў «Акадэмкнізе» (пр-т Незалежнасці, 72) і ў «Кніжным салоне» (вул. Калініна, 5).

БелаПАН



САЮЗ

## КАСТРЫЧНІЦКАЯ РАДА

**10 кастрычніка прайшло чарговае паседжанне Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў. На парадку дня разглядаліся наступныя пытанні: прыём у Саюз новых сяброў, якія прайшлі Прыёмную камісію; арганізацыя і правядзенне чарговага З'езда СБП; рознае.**

Па рэкамендацыі Прыёмнай камісіі Саюза беларускіх пісьменнікаў да разгляду сябраў Рады былі прадстаўленыя наступныя кандыдатуры: У. Ахроменка, М. Гірко, В. Дашук, С. Егарэйчанка, Л. Завея, У. Мароз і А. Фядута. Па выніках таемнага галасавання ўсе кандыдаты былі прынятыя ў сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Уладзіслаў Ахроменка** нарадзіўся 29.01.1965 у Гомелі. Празаік, кінасцэнарыст, драматург. Жыве ў Мінску і Чарнігаве.

**Віктар Дашук** нарадзіўся 16.09.1938 у в. Валокі Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. Празаік, нарысіст, кінарэжысёр-дакументаліст. Жыве ў Мінску.

**Сяргей Егарэйчанка** нарадзіўся 17.10.1988 у Мінску. Скончыў гістфак БДУ. Празаік. Жыве ў Нясвіжы.

**Марат Гірко** нарадзіўся 06.02.1934 у м. Смалявічы Мінскай вобласці. Паэт. Жыве ў Мінску.

**Людміла Завея** нарадзілася 4.11.1955 у п. Руднік Джэзказганскага раёна Карагандзінскай вобласці. Паэтка. Жыве ў Мінску.

**Уладзімір Мароз** нарадзіўся 11.06.1953 у м. Косава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Паэт, празаік. Жыве ў Мінску.

**Аляксандр Фядута** нарадзіўся 3.11.1964 у Гродна. Літаратуразнавец, эсэіст. Жыве ў Мінску.

З уступленнем у старэйшую творчую арганізацыю краіны новых сяброў павіншаваў старшыня СБП Алесь Пашкевіч.

Асноўным пытаннем восеньскай Рады СБП была арганізацыя і правядзенне чарговага З'езда Саюза беларускіх пісьменнікаў. Рада прыняла рашэнне правесці яго ў снежні 2011 года і прызначыла Арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні пісьменніцкага форума.

У Аргкамітэт увайшлі:

Алесь Пашкевіч (старшыня аргкамітэта), Эдуард Акулін, Барыс Сачанка, Рыгор Сітніца, Міхась Скобла.

У «Розным» былі абмеркаваныя надзённыя пытанні жыццядзейнасці творчай арганізацыі.

Прэсавая служба СБП

## ЛІТАРАТАРАМ — СВАБОДУ!

**...Два члены Саюза беларускіх пісьменнікаў знаходзяцца ў няволі. Гэта празаік і грамадскі актывіст Павел Севярынец ды літаратуразнаўца, празаік-эсэіст і праваабаронца Алесь Бяляцкі.**



Павел Севярынец



Алесь Бяляцкі

Сакратарыят і Рада СБП ад імя ўсёй найстарэйшай творчай арганізацыі Беларусі — Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) — неаднакроць выступалі з патрабаваннем неадкладнага вызвалення вязняў-літаратараў (сярод іх — і сябра Рады СБП, найвядомага паэта сучаснасці Уладзіміра Някляева) і дэкларавала палітычную матываванасць арыштаў сваіх калегаў.

З беларускімі пісьменнікамі салідарызаваліся іх еўрапейскія калегі: члены Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады (каля сотні еўрапейскіх пісьменніцкіх арганізацый), Расійскі ПЭН-цэнтр і, у прыватнасці, творцы Нямеччыны (амаль пяцьдзясят пісьменнікаў, сярод якіх два лаўрэаты Нобелеўскай прэміі па літаратуры Эльфрыда Елінэк і Герта Мюлер, а таксама старшыня Нямецкага саюза пісьменнікаў Імрэ Торак, старшыня нямецкага ПЭН-клуба Ёгана Штрасер, старшыня Акадэміі мастацтваў Клаўс Штаек ды дзясяткі іншых вядомых літаратараў (яны — як раней паведамляла «Літаратурная Беларусь» — звярнуліся з адкрытым пісьмом да кіраўніка Беларусі).

Нядаўна з падобным патрабаваннем аб вызваленні вязняў выступіла на прэс-канферэнцыі ў Брусельскім офісе Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Шырын Эбадзі — і запатрабавала неадкладнага вызвалення Алеся Бяляцкага.

«Алесь Бяляцкі павінен быць неадкладна вызвалены і атрымаць магчымасць працягваць сваю мужную і легітымную працу, так патрэбную людзям яго краіны і ўсяго рэгіёну», — заявіла лаўрэат Нобелеўскай прэміі.

Шырын Эбадзі, якая прыехала ў Брусель паводле запрашэння кіраўніка Еўракамісіі Жазе Мануэля Барозу, узяла ў рукі партрэт Бяляцкага і сказала: «Гэта фатаграфія майго беларускага калегі Алеся Бяляцкага. У гэты момант ён знаходзіцца ў турме. Мяне вельмі засмуціла вестка пра тое, што дзве дзяржавы, члены Еўрапейскага саюза, Летува і Польшча, дапамаглі беларускім уладам арыштаваць Алеся Бяляцкага».

Нобелеўскі лаўрэат нагадала, што «сітуацыя праваабаронцаў па ўсім свеце застаецца крытычнай». Паводле яе слоў, прыкладам з'яўляецца арышт Бяляцкага, «які ўсё яшчэ неабгрунтавана знаходзіцца пад вартай». «Дыктатары трымаюцца адзін за аднаго, тое ж павінны рабіць і мы! Міжнародная супольнасць павінна не толькі выкарыстоўваць усе наяўныя ў іх распараджэнні сродкі па абароне правоў чалавека і дэмакратыі, але і ўзмацняць іх, рашуча і згуртавана», — заявіла Эбадзі.

Нагадаем, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека ды член Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Бяляцкі, кіраўнік закрытага беларускімі ўладамі праваабарончага цэнтра «Вясна», які ўжо два месяцы знаходзіцца пад арыштам, вылучаны на Нобелеўскую прэмію міру за заслугі ў сферы праваабарончай дзейнасці.

Літаратар і праваабаронца знаходзіцца пад арыштам з 4 жніўня. Яму высунута абвінавачанне на падставе часткі 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры). Падставай для крымінальнага пераследу літаратара-праваабаронцы стала інфармацыя аб яго рахунках у замежных банках, перададзеная беларускім уладам Мінюстам Летувы і Генпракуратурай Польшчы. Улады гэтых краінаў публічна папрасілі прабачэння ў Бяляцкага і яго сваякоў, а таксама прыпынілі кантакты з Беларуссю ў межах дагавораў аб прававой дапамозе.

Вызвалення Алеся Бяляцкага патрабуюць і міжнародныя праваабарончыя структуры, кіраўніцтва Еўрасаюза, ЗША і шэрагу іншых дэмакратычных краін.

MEMORIA

## СПАЧЫЎ АНАТОЛЬ КАЗЛОВІЧ

**14 кастрычніка пасля цяжкай хваробы на 66-м годзе жыцця памёр беларускі журналіст, пісьменнік, сцэнарыст, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў Анатоль Казловіч.**



Анатоль Мікалаевіч нарадзіўся ў вёсцы Горск Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Любімаму Палессю, яго лёсу і людзям ён прысвяціў шматлікія нарысы і кнігі.

Анатоль Казловіч працаваў у «Сельской газете», кіраваў аддзелам нарыса і публіцыстыкі часопіса «Нёман», амаль чвэрць стагоддзя быў уласным карэспандэнтам маскоўскай «Литературной газеты» па Беларусі, арганізаваў і рэдагаваў фермерскую газету «Новая зямля», праваабарончае выданне «Круг», працаваў першым намеснікам галоўнага рэдактара газеты «Народная воля».

Дэбютаваўшы ў юнацтве вершамі, Анатоль Казловіч стаў вядомы як майстар мастацка-дакументальнай прозы. Ён — аўтар паўтара дзясятка кніг, сцэнарыяў шэрагу дакументальных фільмаў. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча Беларускага ПЭН-цэнтра.

Нават у застойныя савецкія гады Анатоль Казловіч змог пісаць вострую публіцыстыку, праўдзівыя псіхалагічныя нарысы. Яго журналісцкія публікацыі і кнігі вызначаюцца яркім стылем, філасофскім поглядам на жыццё, тонкай іроніяй.

Сакратарыят СБП і «Літаратурная Беларусь» выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім пісьменніка.

**РАЗВАГІ**

# АДЧУВАННЕ

Густаў МУРЫН

**Гэта толькі адчуванне, якое звычайна не грунтуецца толькі на факце. Гэта як бы наша сненне пра ідэальнае жыццё ў ідэальным свеце. Эльдарада, зямля абяцаная, зямля ўрадлівая і багатая, вольны кантынент, карацей — рай. Кожны з нас малюе свой адмысловы вобраз таго раю (хоць скажу, што і гэтым разам я схільны верыць у масавую прадукцыю і спажывецкі густ), але ў нас аднолькавае адчуванне яго. Спакавацца ды ісці, бо няма ж нічога лягчэйшага, як пакінуць агонію будзённых звычак і выправіцца ў невядомую дарогу па ўяўлены ідэал. Такое пачуццё спадзявання многім з нас знаёмае і да нясцерпу вабнае. Яно нас, цікаўных, радуе і суцяшае. Дык рушайма ж!**



Ад любоўнай замілаванасці з першага позірку найлепшы лекавы сродак — другі позірк. Гэтак сама як турысты або службова камандзіраваныя, мы не ўглядваемся ва ўсё, вырачыўшы вочы, як упершыню; мы ўжо акцэнтуем, што адкрываем толькі шматкроць адкрытае да нас. Што і тыя там, у раі, маюць свае людскія праблемы. Што і ім таксама ёсць на што паскардзіцца. І, што самае дзіўнае, яны таксама мараць пра свой саснёны рай, які — там недзе... Так, за півам у лонданскім джаз-клубе ці перад усюдыісным Макдональдсам у Парыжы нас нечакана праціне думка, такая старая і барадатая, што й паўтараць яе ўголас няварта. Што дома я — дома. І баста. Без тлумачэнняў. Што тут я толькі прыхадзень, а там — дома. Тут я адно госць, а там, дома, магу быць і госцем і гаспадаром. Карацей, пачынаем думаць пра вяртанне дамоў. Пачынаем адчуваць, як падчас першай мусовай аўтапсіі ў школьным класе па анатоміі, чаго мы нагледзеліся ўдосыць — а цяпер пара дадому!

Мы вяртаемся дамоў і, перапоўненыя ўражаннямі, распавядаем. Шчыра кажучы, у словацечыве захаплення мы можам не заўважыць, што яны (нашы родныя) не надта слухаюць нас (вандроўнікаў), а калі і слухаюць, дык на паўвуха. У іх свае (цяпер ужо нашыя) штодзённыя клопаты. Не паспяваем расказаць, як тыя штодзённыя клопаты робяцца нашымі. І мы з прывычным уздыхам уступаем у наш наступны будны дзень, у плынь усяго нашага нармальнага дамашняга быту. І тлумімся ў трамваях ці ў метро, пераймаемся мясцовымі ці сусветнымі навінамі, спрачаемся...

Калі памяць нам добра паслужыць, дык неўзабаве адгукнецца. І пачне ўзгадваць, падсоўваць прыклады, параўнанні. Накладвацца на свежае, тутэйшае, перамешваць і ўзмацняць адчуванне — што там лепей, — няўмольна працінацца на паверхню. І мы зноў выпраўляемся ў дарогу. І вяртаемся спаць. Гнаныя маятнікам адчування роўнавялікай сілы процілеглых полюсаў.

Зрэшты, потым мы пачуваемся шчасліва на вышыні дзесяці тысяч метраў у самалёце, які нясе нас да нашага цудоўнага новага раю ці вяртае назад, у наш наноў спазнаны дом. Мы раптам разумеем, што рай — гэта не што там іншае, як адчуванне, якое прыходзіць да нас на вышыні дзесяці тысяч метраў над зямлёй. І няважна, што кожны нават самы доўгі палёт канчаецца прызямленнем. Так што міжкантынентальныя самалёты перавозяць не толькі пасажыраў, але й тоны незарэгістраваных і незадэклараваных мрояў і адчуванняў. Не дзіва, што час ад часу яны разбіваюцца.

**Пераклад са славацкай**
**Алесі Сёмуха**

# НОВАЯ ПОЛЬШЧА ВАЧЫМА СТАРОГА БЕЛАРУСА

Ігар ТУМАШ

*І таму, Ездра, пустым пустое, а поўным поўнае.*
*3 Ездра 7:25*



Вазіў беларускіх дзяцей у летні хрысціянскі лагер пад Гданьскам на беразе змрочнай Балтыкі, папрацаваў там выхавальнікам. І хачу падзяліцца ўражаннямі. Аб Польшчы сённяшняй — члене Еўрасаюза. Акрамя таго, хачу падзяліцца ўспамінамі аб Польшчы ўчарашняй — частцы нашага візантыйскага архіпелага, якой была яна з пасляваеннага часу і да канца 1990-х.

Паміж гэтымі двума Польшчамі розніца настолькі велізарная, што нават думаецца: акрамя каталіцызму іх нічога не аб'ядноўвае. А што, цалкам лагічна. Бо паміж Княствам Літоўскім і савецкай Беларуссю таксама практычна нічога агульнага...

Ранейшая Польшча раўнялася на Савецкі Саюз (камуністычны лад лічу вышэйшай фазай развіцця візантызму). І працягні Польшча ў садружнасці яшчэ гадоў пяцьдзясят, то і палякі пачалі б, перапрашаю, пераладжваць касцёлы пад склады і свінарнікі, масава співацца і таксама адмаўляцца ад польскай культуры і мовы. І мне добра памятаецца, што такія тэндэнцыі ў Польшчы існавалі.

На пачатку 1990-х я суправаджаў на польскія рынкі групы «чаўнакоў». У часы Грамадзянскай вайны падобны занятак называўся «мяшочніцтвам» (і за яго перыядычна расстрэльвалі), у канцы ХХ стагоддзя — «турызмам». У параўнанні з Беларуссю, Польшча здавалася тады досыць убогай, хоць народ жыў забяспечана, але жылы фонд краіны быў састарэлым, вузкія польскія дарогі — у калдобінах. Уражваў хіба што ідэальны парадак рамантычных могілак...

Самымі папулярнымі беларускімі таварамі былі там —ды які лён? — спірт, гарэлка і цыгарэты. Бо спірт у Польшчы не прадаваўся насельніцтву прынцыпова, акцызы на гарэлку і цыгарэты былі значна вышэй нашых. Сакрэт тагачаснай папулярнасці спіртнога ў Польшчы, як думаецца, такі: палякі хаваліся ў алкаголь ад рэальнасці, для іх алкагалізм станавіўся такой жа рэлігіяй, як і для савецкіх людзей.

Бо Касцёл, хоць і павольна, але пад ціскам «самага перадавога вучэння» (у асобе спецслужбаў і рэпрэсіўных адміністрацыйных органаў) губляў у польскім грамадстве свае вышыні. З улікам таго, што пры сацыялізме цяжка быць барахольшчыкам, што — акрамя гарэлкі — магло заняць месца Касцёла? Хіба што наркотыкі і гвалт.

Але ж усё роўна Касцёл Польшчу выратаваў. Каталіцызм — канфесія вельмі сур'ёзная, моцным і жывучым робяць яго Хрыстовы шчырасць і цеплыня.

Паварот ад бязбожнага сасуда да еўрапейскага хрысціянства можна лічыць подзвігам Касцёла, які знаходзіўся ў глухой абароне. (Палякі разумеюць гэта выразна, у нас жа польскія змены прыпісваюць «інтрыгам» ЦРУ).

Увогуле, прыехаў я ў Польшчу еўрапейскую. Упершыню з «ліхіх» (на самай справе вольных) 1990-х. Ведаў, што краіна змянілася, аднак і думаць не мог, што ў такой ступені. Прычым меней усяго зменаў чакаў я ад традыцыйна млявага Памор'я.

Беластоцкі край сапраўды мала змяніўся. (Карыстаючыся выпадкам, хацеў бы выказаць сардэчную падзяку польскаму народу за тое, што беларусы, дух беларускі ў Беластоцкім ваяводстве захаваліся ў цэласнасці. Нібы зубры ў Белавежскай пушчы, выжыла наша нацыянальная закваска на польскім паўночным усходзе. Нас берaглі, нам нічога небяспечнага для нашай крыві не навязвалі, нам дапамагалі.)

Далей па шляху праз Мазовію зменаў выяўлялася ўсё больш. Пейзажы за вокнамі нашага мікрааўтобуса сталі нагадваць нямецкія або галандскія. (Ды і самі палякі таксама — немцаў ці галандцаў.)

Пасёлак Конты Рыбацкія здаўся мне тыповай галандскай вёскай. Вылізаныя катэджы пад чарапічнымі дахамі, марудлівыя жыхары, пругкае марское паветра і хвоі, якія падступаюць з усіх бакоў. Вось так!

А гадоў гэтак праз дваццаць... Што Нарвегія, што Румынія, Польшча — усюды будзе аднолькава. Так што калі Беларусі атрымаецца павярнуцца да Захаду тварам, гэта значыць памяняць сістэму сазлучаных сасудаў, то і яна стане па-сучаснаму еўрапейскай. Ды куды дзенецца! Ціхія, законапаслухмяныя, старанныя беларусы цалкам упішуцца ў еўрапейскі кантэкст. Калі ўжо албанцаў вось-вось прапішуць...

Не, Еўрасаюз не калгас, як абзываюць яго заказныя ці недасведчаныя публіцысты. Зусім наадварот — бо кожная краіна жыве індывідуальнай гаспадаркай. Агульныя адно парадкі. Але ж заснаваныя тыя парадкі на хрысціянскіх каштоўнасцях. (Нашаму чалавеку, вядома, дзіўна будзе чуць, што самы галоўны дэмакрат свету — Гасподзь Бог, які даў чалавеку запаведзі, але пры гэтым — волю выбару. Увогуле, дэмакратыя — гэта хрысціянства, аўтакратыя — паганства. Як вынік, дэмакратычныя краіны квітнеюць, аўтакратычныя — у бездапаможным існаванні.)

За дзесяць гадоў членства ў Еўрасаюзе Польшча стала цалкам цывілізаванай краінай, палякі — добрапрыстойнымі, забяспечанымі людзьмі.

Аб тым, што ў іх атрафавалася ранейшае варварскае мысленне, мог бы засведчыць жывёльны свет Памор'я. Паміж пасёлкам і морам на дзясяткі кіламетраў уздоўж берага цягнулася лесапалоса шырынёй да кіламетра. Па гэтай паласе вольна разгульвалі... статкі дзікоў, казулі. І лес быў цнатліва чысты. Гэта значыць: ніякіх піф-паф, парубак, маёвак з папойкамі.

Дарэчы, піць у Польшчы практычна перасталі, курыць палякі сталі нашмат менш. Наркаманіі ў іх і датуль амаль не было. Здаровае грамадства — здаровыя звычкі. Беспрацоўе нізкае, сярэдняя зарплата пад тысячу эўра, кошты — прыкладна нашыя. І гэта яшчэ не мяжа, уся Польшча нагадвае цяпер гіганцкую будаўнічую пляцоўку...

Аб стратах няма чаго і сказаць. Ну, жуйка «Прыгоды Болека і Лёліка» знікла, падобных на пыласосы «Фіятаў» не стала... Плакаць відавочна няма аб чым.

Раней Польшча была досыць крыміналізаванай дзяржавай, бо ні адно людское скопішча без паліцыянтаў не абыходзілася. У апошнюю паездку паліцыянтаў бачыў разоў два здалёк.

Тлумачэнне простае. Лепшы паліцыянт — страх Гасподні. Пры камуністах страх меншаў, колькасць паліцыянтаў даводзілася павялічваць. Новая Польшча вярнула сабе рэпутацыю адной з самых набожных хрысціянскіх краінаў свету. Такі прыклад. У Контах Рыбацкіх каля тысячы жыхароў. На такую колькасць насельніцтва было два касцёлы, і ў нядзелі яны былі запоўненымі. А якія ў Мінску суадносіны — адзін пустуючы культавы будынак на 100 000 жыхароў? (Але пры гэтым адмаўляецца ў рэгістрацыях абшчынам пратэстантаў. Не надта вітаюць каталікоў. Фактычна пад забаронай традыцыйная ўніяцкая царква.) У такім разе хутка і дывізіі АМАПа для утрымання парадку мала будзе. Бо маргіналізуецца чалавек без жыцця духу.

Вяртаючыся дадому ў Беларусь, дзеці плакалі.

Больш дадаць няма чаго.

ПОСТАЦЬ

# КЛАЎДЗІ ДУЖ-ДУШЭЎСКІ

## РАЗДЗЕЛ З КНІГІ «У ВІЛЬНІ І БОЛЬШ НІДЗЕ»

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

**Польскі даследчык Томаш Блашчак назваў Клаўдзі Дуж-Душэўскага ковенскім архітэктарам. І гэта праўда.**



Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Дзяржаўны сакратар Беларускай Народнай Рэспублікі К. Дуж-Душэўскі — архітэктар менавіта ковенскі, і ягоны шлях у архітэктуру пачаўся з 1921 года, калі ён эміграваў у Летуву.

У 1921 годзе за сувязь з камуністам Эдмундам Русецкім палякі арыштавалі яго і тры тыдні (па іншых звестках — два тыдні) трымалі ў турме на Лукішках…

З Э. Русецкім будучы «ковенскі» архітэктар пазнаёміўся ў 1912 годзе ў Вільні — тады Э. Русецкі быў выпускніком агранамічнай школы, а ён, К. Дуж-Душэўскі, якраз скончыў віленскую рэальную школу і паступіў у Пецярбургскі горны інстытут.

Новая сустрэча адбылася ў Петраградзе ў 1916 годзе, калі Э. Русецкі служыў у царскім войску, а К. Дуж-Душэўскі ўзначальваў беларускі рух — быў старшынём саюза студэнтаў, кіраваў касай узаемнай дапамогі, арганізоўваў хор і нават пакланяўся Мельпамене: удзельнічаў у першай пастаноўцы «Паўлінкі» (выконваў ролю Сцяпана Крыніцкага).

Пасля лютаўскай рэвалюцыі Э. Русецкі далучыўся да бальшавікоў, а К. Дуж-Душэўскі завяршаў вучобу.

У студзені 1919-га адвучыўся і праз два месяцы 12 сакавіка быў прызначаны ў Менску на пасаду губернскага геолага, і — што цікава! — у нашай сталіцы яго прывецілі зноў жа Э. Русецкі (на той час — намеснік народнага камісара земляробства Беларусі)!

Працаваць у Менску давялося нядоўга, усяго паўтара месяца — 15 красавіка 1919 года К. Дуж-Душэўскага камандзіравалі ў Вільню…

Што гэта была за камандзіроўка, можна даведацца з пратакола допыту спадара Клаўдзія ад 28 студзеня 1947 года.

Допыт праводзіў начальнік 4 аддзялення следчага аддзела міністэрства дзяржаўнай бяспекі Літоўскай ССР старшы лейтэнант Данільчаў.

Спадар Клаўдзі паказаў, што ў красавіку 1919-га яго жонка, маці і сёстры жылі ў Вільні, і ён з дазволу Э. Русецкага паехаў туды сустрэць разам з сям'ёй Вялікдзень і закупіць для лабараторыі апаратуру…

Дык вось, 20 красавіка 1919 года ён прыбыў у Вільню, а ўжо назаўтра, 21-га, места Гедыміна было занята польскім войскам.

Новая ўлада загадала ўсім, хто мае вялікія грошы, здаць іх.

У К. Дуж-Душэўскага было 15000 рублёў, аднак жа не панёс іх у польскі скарб, а праз паўтара года, восенню 1920-га, вярнуў камандзіровачную гатоўку ў менскую касу камісарыята земляробства.

Зрабіў гэтак (як заўважана, праз паўтара года!) з вяртаннем у Менск бальшавікоў, а пакуль што ў красавіку 1919-га тут, у Вільні, трэ было нейк уладкоўваць сваё жыццё, таму паступіў на работу ў фінансавую калегію саюза кааперацыі і працаваў там да снежня 1919-га.

Аднак жа час вымагаў рашучых — нацыянальна-палітычных учынкаў!

У траўні гэтага (1919) года стаў чальцом Беларускага Нацыянальнага Камітэта (БНК) і быў абраны старшынём Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны…

Ён становіцца значнай фігурай, шмат ездзіць, сустракаецца з Пілсудскім, нямецкім міністрам Эрцбергерам, кіраўніком місіі ЗША ў Польшчы сенатарам Маргентаў, прадстаўніком англійскай місіі ў Рызе палкоўнікам Талентам, савецкім пасланнікам Літвінавым, а таксама ж па даручэнні Антона Луцкевіча ў лістападзе 1919 года прадстаўляе нашу краіну на канферэнцыі прыбалтыйскіх дзяржаў у Тарту, дзе мае гутарку з фінскімі і эстонскімі дыпламатамі, у выніку чаго Фінляндыя і Эстонія прызналі Беларускую Народную Рэспубліку…

Псеўдагісторыкі лічаць: ніякай БНР не існавала, але гэту «няіснуючу» БНР акрамя Фінляндыі і Эстоніі прызналі яшчэ Турцыя,

> **Ён становіцца значнай фігурай, шмат ездзіць, сустракаецца з Пілсудскім, нямецкім міністрам Эрцбергерам, кіраўніком місіі ЗША ў Польшчы сенатарам Маргентаў**

Балгарыя, Чэха-Славакія, Летува, Латвія і нават Нямеччына…

Вось гартаю дыпламатычныя пашпарты спадара Клаўдзія, вывучаю візы: нямецкія, летувіскія, латвійскія, эстонскія, польскія…

Так і карціць спытацца ў псеўдагісторыкаў: гэтыя візы існуюць у паветры ці ў пашпарце грамадзяніна БНР?!

Аднак вярнуся да Эдмунда Русецкага: ён ведаў пра дзейнасць свайго сябра і — камуніст! — ухваляю яе.



Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Малюнак Анатоля Крывенкі (1942, Мінск)

Недзе ў канцы 1920 года пад чужым імем ён з'явіўся ў Вільні, а К. Дуж-Душэўскі якраз вярнуўся з Рэвеля.

Такім чынам яны сустрэліся, Э. Русецкі нават некалькі дзён пажыў у сям'і Душэўскіх.

Гэтага было дастаткова, каб жандарская канцылярыя западозрыла, што — магчыма — Дзяржаўны сакратар БНР атрымаў з камуністычнага Менска нейкую шыфроўку.

Аднак жа даказаць гэта не ўдалося, мусіць, з той прычыны, што не паспелі арыштаваць Э. Русецкага, таму 7 лютага 1921 года (сведчыць «karta zwolnienia» № 369/21, падпісаная следчым рэферэнтам) К. Дуж-Душэўскага адпусцілі з правам выезду…

Цікава тое, што сувязь спадара Клаўдзія з Э. Русецкім непакоіла не толькі польскіх жандараў — камуністычных таксама.

І нават праз 31 год, калі Э. Русецкага ўжо даўно не было на свеце — сталіністы яго расстралялі ў 1938-м.

1 красавіка 1952 года пра былога намесніка наркама земляробства Беларусі загаварыў начальнік аддзялення следчай часці міністэрства дзяржаўнай бяспекі Літоўскай ССР маёр Каплан.

Ён пачаў свой чарговы допыт К. Дуж-Душэўскага ў 21 г. 30 хв. з пытання: «Калі вы ўпершыню пазнаёміліся з Русецкім?».

І атрымаў адказ: «У Вільні ў 1912 годзе…».

Завяршаючы допыт у 2 гадзіны ночы, ужо 2 красавіка, зноў жа спытаўся: «Што вам апавядаў Русецкі аб сваёй сувязі з польскімі разведвальнымі органамі?».

Адказ быў просты: «Пра гэта ён мне нічога не казаў!».

На тым жа допыце раскрылася й такая цікавая акалічнасць: па выхадзе з польскай вязніцы К. Дуж-Душэўскі сустрэўся з Э. Русецкім і пачуў, што, магчыма, ён быў арыштаваны праз яго, бо менавіта ж да яго, Русецкага, з Менска йшоў і не дайшоў сувязны — пры затрыманні палякі знайшлі ў сувязнога віленскі адрас К. Дуж-Душэўскага.

За такую сваю неабачлівасць Э. Русецкі папрасіў прабачэння і, мяркую, калі ўмеў прасіць прабачэння, то, мусіць жа, быў неблагім чалавекам…

Дык вось, 7 лютага 1921 года па выхадзе з Лукішак Дзяржаўнаму сакратару БНР стала ясна: у Вільні жыць не дадуць!

І тут збольшага паспрабую разабрацца ў блытанай карціне выезду з Вільні.

Адам Станкевіч на допыце 29 верасня 1949 года паведаміў: у 1922-м К. Дуж-Душэўскі ў ліку 33-х беларусаў і летувісаў быў высланы польскай уладай у Летуву як непажаданы элемент.

Трэба аднак удакладніць: быў высланы ці выехаў сам?

І ці ў 1922 годзе?

Гартаю жыццяпіс К. Дуж-Душэўскага; гэты жыццяпіс з летувіскай на расійскую пераклаў у Вільні 17 снежня 1951 года памочнік оперупаўнаважанага 3 аддзялення 2 аддзела міністэрства дзяржаўнай бяспекі Літоўскай ССР малодшы лейтэнант Андрушкявічус.

У дакуменце адзначана: «…20 верасня 1920 г. разам з апошнімі летувіскімі войскамі я паехаў у Летуву, таму што не хацеў зноў заставацца на тэрыторыі, захопленай палякамі…».

Як бачна, не ў 1922 годзе адбыўся выезд, а ў 1920-м, і нават акрэслены дзень — 20 верасня!

А вось паказанні спадара Клаўдзія за 28 студзеня 1947 года, якія дэталізуюць сказанае ў жыццяпісе: «…калі ў верасні 1920 г. палякі зноў аваладалі Вільняй, то габрэйскі гандляр Ютан прапанаваў мне месца на сваёй падводзе, і за некалькі дзён мы й даехалі ў Коўню…».

І апошняе сведчанне.

13 снежня 1946 года старшы следчы следчага аддзялення Ковенскага аддзела міністэрства дзяржаўнай бяспекі Літоўскай ССР лейтэнант Огнеў атрымаў ад спадара Клаўдзія такое прызнанне: «…20 верасня 1920 г. разам са сваім знаёмым па рабоце ў саюзе кааперацыі Ютанам я выехаў з Вільні ў Летуву і з таго часу жыў у Коўні…».

З таго часу!

Гэта значыць — з 20 верасня 1920 года!

Тады як жа быць з нелегальнай сустрэчай з Э. Русецкім, якая (нагадаю) адбылася недзе ў канцы 1920-га?

І не ў Коўні адбылася, а менавіта ў Вільні!

І як жа быць з арыштам у пачатку 1921 года зноў жа ў Вільні?!

Трэба думаць, К. Дуж-Душэўскі пасля 20 верасня 1920 года наведваўся ў Вільню да сям'і (таемна!), тады ж быў узяты пад варту, і 7 лютага 1921-га (ці на які дзеньдругі пазней) ужо канчаткова пакінуў места разам з жонкай Аленай…

У Вільні засталася маці, а ён абраў сталае жыхарства ў эміграцыі, вядома ж, ведаючы, што эміграцыя — гэта перш за ўсё сацыяльная няпэўнасць.

Ён вывучыў летувіскую мову; ён не збіраўся жыць на чужы кошт, рыхтаваў сябе да таго, каб архітэктурнай працай пазбавіцца гэтай самай сацыяльнай няпэўнасці…

У 1927 годзе паспяхова скончыў ковенскі ўніверсітэт і абараніў дыпломную работу «Праект Дома Імя Басанавічуса» (кіраўнік праекта з'яўляўся прафесар Міколас Сангайла).

У Менску (у архіўным касцёле Святога Яззэпа) захоўваецца копія гэтага дыплома; яна заверана ковенскім натарыусам Іпалітасам Бараўскасам 28 студзеня 1929 года.

Натарыус адзначаў: у арыгінале папраўак няма, копія слова ў слова адпавядае арыгіналу, адрас уладальніка дыплома: Коўня, вуліца Міцкевіча, д. 15…

Аднак (падказвае іншы дакумент) больш дакладная нумарацыя — 15/23, што значыла: дом знаходзіўся на рагу, а кватэра 10.

З дапамогай Асты Раманюк у дыпломнай копіі я прачытаў:

«Ад Імя Летувіскай Рэспублікі

Ковенскі Універсітэт, Рэктар, Сенат і Прафесары гэтым сведчаць, што ў той час, калі Рэктарам быў Ардынарны Прафесар кафедры Дзяржаўнага права Міколас Рамерыс; калі Дэканам Тэхнічнага Факультэта быў Экстраардынарны Прафесар кафедры Будаўнічай механікі Казімірас Васіляўскас, — Клаўдзі Дуж-Душэўскі, народжаны ў мястэчку Глыбокае Віленскай акругі, прайшоў усе навукі будаўнічага аддзялення Тэхнічнага Факультэта, добра здаў усе іспыты, добра выканаў і абараніў дыпломны праект «Дом Імя Доктара Басанавічуса ў Вільні», атрымаў усе правы дыпламаванага інжынера. Гэта Універсітэт сведчыць сваёй пячаткай, подпісамі Рэктара і Дэкана. 5 снежня 1927 г. …».

Спадар Клаўдзі абараніў дыплом у групе выпускнікоў, якая складалася з дзевяці асоб, і гэта значыла: у 1927 годзе Летувіская Рэспубліка пабагацела на дзевяць новых інжынераў; яны займелі права праектаваць і выконваць работы па сваёй спецыяльнасці.

Дэкан К. Васіляўскас адзначаў у газетнай нататцы: усе дыпламанты (а гэта летувісы, адзін габрэй і адзін беларус) добра ладзілі між сабою…

Атрымаўшы дыплом, К. Дуж-Душэўскі з палітычнага беларускага будаўніка ператвараецца ў сацыяльнага летувіскага!

У пасведчанні пад нумарам 2471, якое выдадзена 3 сакавіка 1928 года будаўнічай інспекцыяй міністэрства ўнутраных спраў, можна прачытаць: «… Клаўдзі Дуж-Душэўскі зарэгістраваны ў Будаўнічай Інспекцыі будаўнічым інжынерам з пасведчаннем Тэхнічнага Факультэта Універсітэта Летувы № 362 ад 16 снежня 1927 г. …».

Дык які ён — дыпломны праект інжынера К. Дуж-Душэўскага?

Ён хацеў узвесці будынак на два паверхі ў стылі позняга рэнесансу!

Што да асаблівасцей, то на атыку збудавання, паміж выявай слупоў Гедыміна і гербом «Пагоня», значыўся надпіс: «Палац Басанавічуса».

Усё-ткі не дом (няхай сабе й з вялікай літары, як сказана ў дыпломе), а палац!

Крыху ніжэй ішлі словы: «Шчаслівыя вы, часы Адраджэння, і вы, таленавітыя дзеці Бацькаўшчыны!».

Словы завяршаліся датай: MCMXXVII (1927 год).

Міжволі згадваецца атык Вострай Брамы — слупоў Гедыміна на ім няма, але ён таксама рэнесансны і таксама ж упрыгожаны «Пагоняй»!

У лік памяшканняў палаца ўваходзілі — бібліятэка, лекцыйная зала, чытальня, музей, выставачныя пакоі.

Бібліятэка, у фондах якой мелася быць 150000 тамоў, складалася з адной залы ў падвале і дзвюх на першым паверсе.

Лекцыйная зала мела форму амфітэатра і размяшчалася на 400 душ.

Плошча музея раскінулася на 500 кв.м., у чытальні магло змясціцца 150 чытачоў, а наогул жа ва ўсім будынку адначасова маглі знаходзіцца 800 чалавек…

Кубатура ж палаца адпавядала 35000 куб.м.

На той час 1 куб.м. каштаваў 75 літаў, то выходзіла, што агульны кошт будоўлі складаў 2625000 літаў…

Але галоўнае ўсё ж не гэта!

Галоўнае тое, што праект К. Дуж-Душэўскага меў сваю палітычную асаблівасць: палац Басанавічуса задумваўся да ўзвядзення на пляцы Лукішкі ў Вільні!

Міжваенная Вільня, як вядома, належала Польшчы; паміж Летувой і Польшчай адносіны ўсё з-за таго ж віленскага пытання былі вельмі складаныя, таму мара пабудаваць менавіта ў Вільні Дом у гонар Басанавічуса (бацькі летувіскага адраджэння!) была не проста палітычна смелая, а нават у немалой ступені й правакацыйная…

Ці ведала польская ўлада пра творчы намер К. Дуж-Душэўскага?

Вядома ж, ведала.

Ковенскія газеты пісалі пра дыпломны праект нашага палітыка, і дэфензіва, безумоўна, гэтыя газеты чытала.

Аднак жа палякі з таго вялікай праблемы не рабілі — ва ўсякім разе ў Вільню пускалі.

І К. Дуж-Душэўскі бываў у Вільні (і ўжо не таемна, а легальна) — напрыклад, у 1929 годзе, калі захварэла маці, і ў 1930-м, калі маці памерла.

6 красавіка 1933 года аддзел бяспекі Віленскага ваяводскага кіраўніцтва за подпісам ваяводскага радцы В. Рэйса выдаў даведку, паводле якой грамадзяніну Летувы К. Душэўскаму давалася магчымасць перайсці летувіска-польскую мяжу ў пункце Завясы.



Клаўдзі Дуж-Душэўскі і Кастусь Езавітаў. 1919 год

У даведцы значылася мэта пераходу: развязаць сямейна-маёмасныя справы, і быў акрэслены тэрмін — на тэрыторыі Польшчы дазвалялася знаходзіцца два тыдні…

Бываючы такімі наездамі ў Вільні, К. Дуж-Душэўскі, трэба думаць, не раз і не два прыходзіў на Лукішскі пляц, зацікаўлена ўглядаўся ў бліжэйшыя дамы, вывучаў іх, суадносіў маштаб свайго твора з навакольнай архітэктурай…

Вядома, дыпломная мара 1927 года не магла здзейсніцца — палякі нізашто не далі б у Вільні пабудаваць «Дом Басанавічуса»!

Аднак жа мара ўшанаваць знанага дзеяча суседняй культуры заставалася і жыла, дарэчы, не толькі ў душы спадара Клаўдзія!

У душах іншых беларусаў таксама!

Часам агалошваліся прапановы пабудаваць менавіта ў Вільні помнік Басанавічусу яшчэ пры жыцці самога Басанавічуса!

Так, у 1926 годзе віленскія беларусы адзначалі 75-годдзе вучонага, і Адам Станкевіч, вядомы літвафіл, падаў думку: добра было б, каб у Вільні яму, вялікаму летувісу, быў пастаўлены помнік!

Антон Луцкевіч палічыў заяву А. Станкевіча несамавітай, бо ў ёй чулася няхай сімвалічнае, але ўсё ж такі «дараванне» Вільні ковенскай Летуве.

«…беларусы ў справе Вільні зацікаўлены не менш, чым летувісы!» — пісаў А. Луцкевіч.

Вядома, прычынай неспадзяванай спрэчкі тут з'яўляўся не сам Басанавічус, не ягоная асоба, а ўсё тая ж Вільня!

А да вялікага летувіса адносіны ў А. Луцкевіча былі самыя паважлівыя: у 1927 годзе ён прысвяціў яго памяці некралог, у якім назваў доктара Басанавічуса «…бацькам летувіскае Навукі…» і «…найвыдатнейшым павадыром адраджэнскага руху сярод летувісаў…».

Няма ніякага сумнення, што такія словы мог бы сказаць і сам К. Дуж-Душэўскі, бо невыпадкова ж філасофскую прастору Басанавічуса — Літву — іменаваў сваёй радзімай…

«…не пакідаючы беларускую работу, я застаюся беларусам, а таксама ж імкнуся быць і добрым грамадзянінам маёй радзімы Літвы… Да Літвы стаўлюся, як да сваёй радзімы, і хачу быць карысным і добрым грамадзянінам, але ва ўнутраныя справы Летувы не ўмешваюся, бо хачу быць тактоўным да краіны, якая дала мне прытулак…» — так натаваў у жыццяпісе і, пэўна ж, такія пачуцці дапамагалі яму будаўніча аздабляць Летуву.

На архітэктурнай ніве К. Дуж-Душэўскі працаваў шмат і з вялікай асалодай; умеў добра зарабляць і шчодра дапамагаў беларускім установам…

Часопіс «Калоссе» пісаў у 1938 годзе:

«…Музей (Беларускі Музей імя Івана Луцкевіча. — Л. Д.-М.) атрымаў ад старога беларускага дзеяча з Коўна інжынера-архітэктара Кляўдыюша Душэўскага паведамленне, што са сваіх заробкаў ён пастанавіў выплачваць даволі значную суму штомесячна на дапамогу Музею.

Як ведама, Музей, пазбаўлены дзяржаўнае дапамогі ад чэрвеня 1938 года, утрымліваецца выключна за складкі сяброў і прыхільнікаў Музею. Сума, здабываная штомесяц гэтым шляхам, пакрывала дагэтуль толькі выдаткі на аплату музейнага памяшкання ў дзяржаўным гмаху і на неадкладныя бягучыя патрэбы. Дапамога інжынера Душэўскага дасць магчымасць хоць мінімальнае аплаты ахвярнае працы музейных работнікаў.

Гожа адзначыць, што інжынер Душэўскі ўжо каля 20 гадоў жыве ў Коўне і сваёй фаховай працай здабыў для сябе паважныя матэрыяльныя падставы быту, каторыя далі яму магчымасць не толькі пабудаваць для сябе пекны дом у сталіцы Летувы, але, як бачым, і дапамагчы са сваіх заработкаў беларускай культурнай установе. Пажадаем, каб за ягоным прыкладам пайшлі і другія заможныя Беларусы, лічба каторых з году ў год узрастае…».

Так, К. Дуж-Душэўскі зароблenae аддаваў, пакідаў сабе толькі неабходнае.

Для Беларусі распрацаваў малюнак нацыянальнага сцяга і, можна сказаць, асновы нацыянальнай дыпламатыі, рэдагаваў часопісы й газеты, стварaў падручнікі і слоўнікі, кіраваў грамадскімі арганізацыямі…

А для Летувы стварaў матэрыяльныя каштоўнасці: кінатэатры, радыёстанцыі, халадзільныя ўстаноўкі, беконныя фабрыкі, прыватныя дамы для ковенскіх дактароў, адвакатаў, інжынераў, а найбольш — двух і трохпавярховыя паштовыя будынкі і дамы адпачынку для паштавікоў, як, напрыклад, летні дом у Нідзе.

А яшчэ праектаваў помнікі ў гонар 10-й гадавіны летувіскай незалежнасці — у сваёй працы пра «ковенскага» архітэктара Т. Блашчак згадвае помнік, усталяваны ў Акмяне…

Смяротная небяспека часта навісала над спадаром Клаўдзіем, а ён — і страціўшы спакой! — усё адно заставаўся людскім, інтэлігентным.

Калі памёр, развітальнае слова прысвяціў яму Віктарас Ражайціс — дацэнт Ковенскага палітэхнічнага інстытута, эксперт па будаўнічых канструкцыях.

В. Ражайціс гаварыў пра К. Дуж-Душэўскага як пра майстра, які меў шырокі кругагляд, як пра асобу высокай эрудыцыі і шляхетнасці…

**2011 г., Менск.**

**Цалкам кнігу можна будзе прачытаць у часопісе «Дзеяслоў».**

**Для Беларусі распрацаваў малюнак нацыянальнага сцяга і, можна сказаць, асновы нацыянальнай дыпламатыі, рэдагаваў часопісы й газеты, стварaў падручнікі і слоўнікі, кіраваў грамадскімі арганізацыямі…**



Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Фотаздымак з пашпарта грамадзяніна БНР

ВЕРШЫ

# ГЕРОЙ ЭПОХІ СТАБІЛЬНАСЦІ

Сяргей ПРЫЛУЦКІ



## Клуб Мёртвых

у памерлых свае цяжкасці і інтарэсы
але пра іх не пішуць у кнігах не кажуць
у прэсе

напрыклад самагубцы пікетуюць
райскую амбасаду
патрабуючы роўнасці й допуску
да райскага саду

яны маюць сваю Самагубчую Лігу
праз якую прасоўваюць змены ў Святую
Кнігу

там таксама ёсць зборы й прызывы
ў войска
дызерціраў — абодва бакі —
наказваюць жорстка

спустошыўшы кволыя душы, іх
высылаюць назад — у свет жывых

свет мёрвых — ён быццам лятучы
галандзец
дае табе шанец і забірае шанец

там гастарбайтары з пекла ствараюць
таемныя ложы
але кожны жыхар парадызу да іх варожы

у сваю чаргу жыхары парадызу,
зануранымя ў тугу,
бяруць экскурсійныя туры
на востраў граху

і калі скажам віктар пятровіч
знаёміцца ў пабе
за порцыяй віскі з шыкоўнай бабай

і калі скажам віктар пятровіч,
нябесны насельнік,
пакідае ў выніку ў пекле сваё насенне

то абедзьве сістэмы згубіўшы сваіх
адэптаў
ператвараюцца ў два ўяўных канцэпты

то бок паміраючы ты без ніякіх віз
патрапляючы ўверх патрапляеш і ўніз

## мантра

калі сэрца трымціць быццам бомж
пад картонкай
і трывога ніяк не выходзіць вонкі,

уяві, што ты мёртвы, ты мёртвы,
ты мёртвы
у труне, у новым касцюме і ботах

уяві што ты труп, жаўнер
тагасветнае роты,
сам-насам з сабой, з зямлёю
засыпаным ротам

бо згадка твая бы рэфлекс запаволенай дзеі
мо й не адразу, але ад яе лягчэе

кожнага ранку па тратуарах і пляцах
механічныя робаты смутку імчаць
на працу

запіваючы печыва каваю ці кампотам
уяві сябе кожным з іх, то бок — мёртвым

гуляючы ў мачо, у прадажнага патрыёта
пералятаючы атлантыку самалётам

ля станка выціраючы лоб ад поту
замры на імгненне, пачуйся мёртвым

уяві, засынаючы п'яным васем пад плотам,
што цябе не было — нарадзіўся мёртвым

у чаканні найгоршага, на вяршынях адчаю
гледзячы ворагу ў вочы, стоячы
перад зграяй

адолей страх, не будзь ідыётам
не забывайся, памятай — мёртвы, мёртвы

## восень блатных патрыярхаў

у горадзе напружаная крымінальная
абстаноўка
але знешне ўсё ціха навокал —
аптычны падман
гаспадыні выбіваюць аб турнікі цыноўкі
гаспадары напіваюцца або паляць план

цыганскія кланы захапілі ўсе
стратэгічныя рынкі
мянты — прадажныя сукі, мэр —
стары наркаман
братва метадычна скупляе
ў вайскоўцаў скрынкі
рыхтуючы табару буфанаду і балаган

ціхі памежны горад заходняе беларусі
ад скрухі ў піўнухах рабочыя рэжуць
рабочых
на лецішчах — сходкі аўтарытэтаў у духу
«Хроснага бацькі» ды іхнія сінія вочы

блішчаць як раса на шырокіх летніх
тэрасах
у кожнае з бандаў свае вызначальныя
знакі
у адных — пінжакі ад Brioni і жонкі
ад цінта браса
у другіх — шал ад бога і дзманы
ў цёмных бараках

спаленыя дыскатэкі крамы перастрэлкі
ў барах —
рамантыка ды й толькі як напішуць
пра гэта потым
як палае жыццё ты бачыў не толькі
ў марах
і як смерць разносіць сваім падпісчыкам
пошту

апусцелі рынкі вакзалы тэнісныя корты
без іх першабытнае злосці вітальнае смагі
бы вялікія мёртвыя рыбы да мора мёртвых
плывуць па вадзе браткі і цыганскія
патрыярхі

## пацаны

штовечар пад вокнамі пад'езда бухаюць
пацаны
у кожнага патрыманая тачка спартовыя
штаны

усім па дваццаць максімум дваццаць пяць
недзе а трэцяй начы яны пачынаюць біцца
або спяваць
рэпертуар стандартны «шансон» і брат
яго «рускі рок»
асабліва душэўна рве струны нейкі Санёк

б'юцца ў асноўным дзеля чыстага інтарэсу:
чувак упадзе з першага ці з другога разу?
часам да іх далучаецца інвалід Валера з
5-й кватэры
«Валера, бля!» — крычаць пацаны, — «бля,
Валера!»

абдымаюць яго, як брата, наліваюць
гарэлкі,
просяць распавесці пра зону, 90-я, пра пе-
растрэлкі

«гаўно гэта ўсё», — кажа Валера, — «я й
сам не рады
што трапіў па малалетцы ў тыя
расклады»

карацей звычайная моладзь краіны пубэр-
татнага веку:
аблічча Тайсана, душа Чыкаціла, розум
Швейка

аднойчы яны замовілі шлюху, студэнтку-
завочніцу
набухалі й расклалі акурат на дзіцячай
пляцоўцы ў пясочніцы

і пакуль маладой і прыгожай па чарзе
карысталася ўся кампанія
у доме насупраць бліснулі два біноклі і
шэсць цыгарэт (сёмай была мая)

потым па выкліку нейкай старой кашолкі
прыехаў мянтоўскі бобік пачаліся раз-
боркі

каго вырубілі адразу, каму перад тым
разбілі нос аб арэлі
«толькі рэктару не званіце», — маліла
заплаканая работніца панэлі

яе галас напэўна распалохаў усіх наваколь-
ных жулікаў,
на балконы ў начнушках і майтках вывалі-
ла цікаўная публіка

нейкі мужык нават выпаў спрасоння з
другога паверху
а калі ўсіх забралі, чамусьці стала стра-
шэнна адзінока і ціха

над асеннім узлескам бязгучна лёталі
начніцы,
недзе ўдалечы ў цягніку засыналі стамлё-
ныя праваднiцы

гаслі вокны ў дамах, у халодным паветры
чуўся водар азону
й недапалкі, бы першыя кроплі, павольна
падалі ўніз
у сухія далоні газонаў

## гатэль мілосці

у выніку ты пераехала ў іншы горад
мы абодва пра гэта ведалі і чакалі
зрэшты свет — адзін вялікі гатэль
і не важна ў чыім нумары або спальні
глушыцьмем партвэйн
і шукацьмем рэшткі любові
бо рэшткаў па ёй ніколі не застаецца

я ўсё яшчэ помню цела твайго
раскошныя залі
але цяпер мы нібы два вандроўных сюжэты
з адкрытым фіналам
дзве аднолькавых кнігі
ў розных мілосных архівах

адцяпер час плыве паўз нашыя сны
быццам вялікая іржавая баржа
і ніхто не ведае што рабіць
з гэтай тлустай нафтай страхаў
і мёртвай флорай словаў

самагубцы скачуць з мастоў
пакідаючы блізкім замест развітальных
лістоў
нясплачаныя крэдыты
рэшта спасціглае даўняе майстэрства
дольчэ віты
і толькі мы між імі — пасярэдзіне —
быццам шруб у нажніцах

і тысячы каханкаў
ляжаць у тысячах ложкаў
іхнія абдымкі — перадсмяротныя
сутаргі
іхнія слёзы — вада ў лёгкіх кахання
бо каханне кажуць жыве тры гады
але нават іх не хопіць
каб вычуць твой стогн

таму застаецца адно лавіць дыханне
цалаваць чужыя валасы
чужыя сцёгны
каб прачнуцца назаўтра сам-насам
з водарам чужога цела
якi таксама хутка сыйдзе
ляткі й бязыменны

## герой эпохі стабільнасці

Беларусь а давай выгадуем табе нацы-
янальнага супергероя
Дзед-Барадзед будзе хросным Паца-Ваца
нябесным патронам
а сам ён стане снайперам на перадавой
чарговае пяцігодкі

напярэдадні абвесцім прышэсце а потым
глядзіш і другое
дамо яму ў памочнікі амапаўцаў чалавек
дванаццаць
каб разганялі ў нашых сэрцах адчай а ў
жылах кроў

мая нямая беларусь ты ляжыш між усхо-
дам і захадам
як прастальытка між двума заклапоча-
нымі кліентамі
твае ногі як шлагбаўмы твой гімн як
штучны аргазм

твая галава — вялікая аграрная
кунсткамера —
адгнівае і крышыцца быццам зубы
гераіншчыка
папусціся мая алкагалія і марш
на аналізы

бо магчыма твой 007 ужо тут у тваім
міжчассі
недзе ў глыбінях тваіх чорных
правінцыяў
сядзіць і няспешна шмаруе заржавелы
затвор гісторыі

## Фуга лета

чорнае вока месяца чорнае вока сонца
засохлы калодзеж горла з пяском на донцы
толькі й чуе што зумкат залётных
навінаў
па горадзе бы грузавік барочны жнівень
развозіць пернасці гнілі й малочны пыл
пот сцякае па скуры нібы акрыл

чорная спальня вільготная коўдра ночы
лета сцеле твой ложак лягае побач
шэпча на вуха: дыхай гэтаю цемрай!
але ў акваланту мозгу няма ні халеры
вусціш такая што лепей цябе б не было
хочацца піць але ўстаць западло

чорны трыснёг цела чорная мята сэрца
ляжы бервяном: вось аблокі табе вось
месяц
больш нічога няма акрамя нябеснае карты
акрамя гэтай спёкі гусцейшай за нафту
вырубаюцца сэрцы лядоўні нават клазэт
стаіць бы мастацкі аб'ект

чорныя сцёгны чырвоныя плечы світання
ровары юных шкаляраў у цені каштанаў
плывуць і знікаюць не пакідаючы следу
у мокрай футболцы джынсах і брудных
кедах
у ложку побач з табой бы аптычны падман
лета-атрута лета-пякельны-шайтан

НАЧЫРКІ

# АХІЛЕС І БАРБАРА

Анка УПАЛА

***

Антычны філосаф Зянон казаў, што хутканогі Ахілес ніколі не здолее нагнаць марудную чарапаху. Я думаю, і спрабаваць не будзе. Проста не пабяжыць. Нават Ахілес не пабяжыць... Навошта бегаць за чарапахамі, калі можна паглядзець навіны, прыбрацца ў пакоі ці скласці надзвычайна патрэбную справаздачу для адміністрацыі Ленінскага раёна. Можна таксама змайстраваць што-небудзь сваімі рукамі ці зарабіць грошай. А можна займацца самаадукацыяй ці, калі не патрапляеш, паступіць на ўніверсітэт на другую вышэйшую альбо, прыкладам, у акадэмію якую-небудзь, лепей за ўсё юрыдычную. Альбо бізнэсоўцам можна пайсці працаваць, гандляваць памідорамі. Таксама можна.

Не. Думаю, што і Ахілес не пабяжыць за чарапахай, калі толькі...

— Хадзем дадому, Ахілес! — Барбара бярэ Ахілеса пад руку, і яны выходзяць за шкляныя дзверы крамы хатніх жывёлін. Чарапаха сумна глядзіць на іх і задумліва размінае лапы.

**16 сакавіка**

Ахілес лічыць, што самая жахлівая рэч у свеце — гэта хранометр. Унутры атамны дзеля асаблівай дакладнасці, а звонку — птушачка з хаткай. Такое сабе «ку-ку». Сядуць Ахілес з Барбарай на кухні паснедаць альбо гарбаты папіць, альбо кавы. Кадабру частуюць: яна так смешна гарбату п'е праз трубачку. З бабуляй, бывае, гаворку завядуць, калі яна адновіцца з попелу. А тут — «ку-ку»!! Час класціся спаць! Альбо бегчы на працу! Альбо на чыгуначны вакзал... у дзіцячы садок... на самалёт... на аўтобус... на сустрэчу з Адэлаідай Сабакаўнай... у Дублін...

Вар'яцкі дом, праўда-праўда. Не-не, нават і не ўгаворвайце мяне. Трэба прадаваць хранометр.

**18 сакавіка**

Сёння па радыё згадалі закон сусветнага прыцягнення. Ахілес шукаў яго ў Канстытуцыі, але не знайшоў. «Кепская Канстытуцыя», — зрабіў выснову Ахілес. «Мая лепей», — супакоіла яго зграбная Барбара.

**23 сакавіка**

Французскага пісьменніка Ларошфуко спачатку звалі François VI, duc de La Rochefoucauld — вельмі складана. Ён з-за гэтага моцна перайма́ўся, бо ніхто не мог запомніць і правільна запісаць яго імя, нават бацькі і супрацоўнікі пашпартнага стала. У François VI, duc de La Rochefoucauld пачалася дэпрэсія, і ён прыйшоў да Ахілеса тапіцца ў ягонай ванне. Пашкадаваў Ахілес французскага пісьменніка і папрасіў сваіх сяброў Карла і Фрыдрыха дапамагчы François VI, duc de La Rochefoucauld, але двайняты былі занятыя: у іх акурат на той дзень была запланаваная сусветная рэвалюцыя і бабах-фаербах з воплескамі апасля. Тады Ахілес пайшоў у дом мастацкай прыдумкі да Кірылы і Мяфодзія. І тыя ўрэшце прыдумалі пісаць вось так: «Ларошфуко», вельмі зразумела, і яшчэ шмат розных літараў напісалі, цэлы альфабэт. Кірыла сказаў, што гэты набор трэба назваць «кірыліцай». Так было ўратаванае жыццё Ларошфуко.

**25 сакавіка**

Злавіў Ахілес залатую рыбку, а яна яму і кажа: «Выканай, дружа, тры мае жаданні! Жаданне першае: хачу мець залатыя зубы!»

Разважыў Ахілес: няправільная рыбка нейкая, і проба ў яе на пузе расплывістая; і паклаў яе назад у акварыюм.

**27 сакавіка**

Дворнік Муаўр мае Хонаванутру. Гэта не хвароба, а хатняя жывёла. Іншымі словамі, звычайны кот. У гэтага ката шыкоўнае доўгае футра, дрэнны характар і сваякі ў Варшаве. Кожную нядзелю яны тэлефануюць Хонаванутры з Варшавы з самага ранку, і Муаўр заве ката да тэлефона: «Хонаванутра-хонаванутра-хонаванутра!» — узнімае ўвесь дом на вушы, а кот усё адно яго не чуе, бо раніцай у нядзелю спіць, як нежывы. Вось і сёння Хонаванутра не паразмаўляў з варшаўскімі сваякамі.

**28 сакавіка**

— Буль-баб-уб! Ля-уб-аб! Бубба-аб! Аб-уб-буб! — бубніла бабуля і хадзіла туды-сюды па Ахілесавай кватэры.

— Я вас праводжу, — адразу ветліва сказаў Ахілес, калі знайшоў яе ў сябе дома і прыемна ўразіўся.

**31 сакавіка**

Сядзіць Ахілес у лазенцы на бруднай бялізне і ловіць у ванне рыбу: у акварыюуме больш не спрабуе: залатая рыбка ўвесь час выцягваецца: то царства новае, то бігудзі, а то і залаты прас патрабуе. А ў Ахілеса няма.

Дык вось, сядзіць ён з вудай. Батарэя прыемна цурчыць, яркая лямпачка і свеціць, і грэе, у люстры ўсё гэтае хараство адбіваецца — так добра! А тут лёска як затузаецца! Пацягнуў Ахілес вуду — і выцягнуў боты з зубамі! Ну, вы ўсе дзе-небудзь такія ды бачылі, хоць бы і ў музеі: зяпы разяўленыя, іржавымі цвічкамі пачвякваюць, есці просяць. Пабеглі боты на кухню наўпрост да лядоўні. Бяжыць за імі хутканогі Ахілес, а дагнаць не можа. Замкнуліся боты ў маразільнай камеры, і дастаць іх адтуль ніяк немагчыма, толькі храбусценне за дзверкай чуваць. Вось тут Ахілес і здагадаўся, што гэта не простыя боты, а боты хуткаеды. Мусіў Ахілес іх разам з лядоўняй выкідваць з вакна, бо інакш з'елі б яны яго.

**33 сакавіка**

Кобра Кадабра вельмі добрая. Кадабра шые, Кадабра пляце кручком паласатыя шкарпэткі, галоўным чынам таму, што ўсё астатняе на ёй дрэнна трымаецца. А хто не ўяўляе, як Кадабра пляце, дык вельмі проста — хвосцікам. Кадабра ўвогуле шмат дапамагае Барбары па гаспадарцы: падлогу памыць альбо бялізну — усё можа, усё ўмее, такая чароўная.

Паколькі ўсе справы на сёння былі зробленыя, Кадабра маркоцілася дома ў адзіноце, і таму пачала забаўляць сябе, элегантна паплёўваючы з форткі на галовы мінакам. Яна ціха смяялася ад задавальнення, калі спроба заканчвалася ўдала. Кожны свой поспех Кадабра адзначала крыжыкам на падваконні. Ага, дворнік зноў здымае свайго ката з дрэва. Агонь па дворніку! Хі-хі — круціць галавой і думае, што гэта верабей не стрымаўся у палёце!

У такіх няўрымслівых гульнях Кадабра прабавіла дзве гадзіны, пакуль Барбара не вярнулася з цырульні. Потым яны разам глядзелі тэлевізар і смяяліся з Муаўра, які прыйшоў пахваліцца, што ад птушынага памёту ў яго раптоўна зняло шматгадовы рэўматызм.

**35 сакавіка**

Зранку Барбара села на булачную дыету. Запісвайце, спадарыні: булка, булка-булка-булка, булка-булка-булка-булка, з усіх сіл, як мага доўга. Ужо ўвечары Барбара не магла глядзець на булкі і лёгка паабяцала сабе ніколі больш іх не есці. Напрыканцы наступнага тыдня мусіць з'явіцца талія.

**37 сакавіка**

Прачнуўся Ахілес апоўначы і чуе, што нехта ходзіць па кватэры: лёгенька гэтак, туп-туп-туп у камору. А потым ужо назад, толькі крокі цяжкія, ажно падлога прагінаецца: рып-рып-рып да дзежнае шафы.

— Зноў бабуля, — падумаў Ахілес, — у вартаўніка, мабыць, гуляе, — павярнуўся на іншы бок і спакойна заснуў.

З узыходам сонца ўзняўся Ахілес, і — да шафы, каб апрануцца. Адчыняе яе, а там абрусок ляжыць згорнуты. А ў ім чаго толькі няма: абаранкі, цукерачныя абгорткі, дзвадцаць тысячаў паўнаважкіх рублёў дробнымі купюрамі, рэшткі кашы і нават курыныя костачкі.

Вось яно што! Абрус-самабранак у доме завёўся! Прадукты, грошы, вопратку, бытавыя прыборы сам бярэ, сам есць, ужывае, носіць, прадае. Але ж ад яго і карысць бывае: у суседзяў возьме — у дом прынясе. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі самабранак няправільны, а так... Калі яго ў час не спыніць не стрымаць, ён палову дома вынесе!

Узяў тады Ахілес абрусок і ўладкаваў працаваць на мытню. І нават вядома, што гэты абрус потым даслужыўся да самага галоўнага мытніка ў краіне — вельмі шмат дабра збіраў. Нават у яго былі і пагоны. А ў кватэры такому не месца.

**39 сакавіка**

Божа мой, што такое «пасатыжы»? Пасатыжы-пасатыжы-пасатыжы... Ведаю гісторыю пра пасатыжы і, можа, калі-небудзь раскажу.

У Ахілеса дома пасатыжы не жывуць, яны жывуць у адміністрацыйных будынках і ўначы выпаўзаюць, каб каго-небудзь пршчыкнуць, прыщіснуць ці адкусіць каму-небудзь нагу.



Фота М. Сёдэрберг

Там жа гняздуюцца веражбей і вымарадак. Птушкі нібыта. Веражбей той — а-яй! Замовы ўсялякія практыкуе і праклёны непрыемныя. Кладзе людзям кнопкі ў абутак ды іголкі засоўвае ў шпалеры. Бывае, што і сурокі наводзіць. Са сваіх вачэй і наводзіць з распрыўкрасных. Міргне на цябе, ты нутром і адчуваеш, што ў цябе малако пракісла. Тады трэба яму грошы плаціць, каб ён сурокі зняў. Ну вось, рублік заплоціш — і ідзі дадому весяліся. Кожны раз, атрымліваючы рубель, веражбей збянтэжана чырванее — зарабляе.

Вымарадак той яйкі адкладвае: на тое падарыла яму матухна-прырода вялікі яйкаклад. Вось паўсюль адкладвае, дзе яго не прасілі. У вопратку, у ракавіну. Добра, калі ў смецьніцу, але ж і ў ложак адкладвае. Непрыемна. Мокра зноў-такі, і шкарлупіны вострыя: спаць нязручна, калі не выкідаць. А яечню з гэтых яйкаў гатаваць не надумай, бо сам тады ў вымарадка ператворышся! Кшталту, як хто з капытка пап'е, той — у казлянятка... Так і тут.

**47 сакавіка**

Барбара выкапала пастку на мышэй акурат ля пад'езда. Так усё добра замаскіравана, і сырок пллаўлены пакладзены. Першы трапіў у яе Ахілес. Не праз сырок, вядома. Цёмна было, таму і не заўважыў. Усю ноч у яме прасядзеў. Зверху яшчэ мышэй нападала. Тыя таксама праз няўважлівасць. Апошнім прыгожа паваліўся ў яму дворнікаў кот Хонаванутра. Гэта было адзінае асэнсаванае падзенне, інсцэніраванае пад выпадковае. Мышэй пад раніцу ў ямцы значна паменела, а ў хонаванутрына пуза павялічылася. Апошнія дзве мышы, што засталіся, Хонаванутра паклаў пад галаву, каб ямчэй было спаць, пакуль яго не прыйдзе выратоўваць гаспадар. Хонаванутра салодка плюшчыў вочы, а мышы ў яго пад галавой не спалі і шмат думалі пра рознае, хоць і не варушыліся. З раніцы Хонаванутра высадзіў іх на паверхню планеты, і хісткай хадою яны пайшлі дахаты, трымаючыся за лапкі. З таго часу Хонаванутра не есць мышэй, і Муаўр мусіць выдаткоўвацца на пакупны корм. А мышы — тыя што... Размнажаюцца сабе. Вось і ладзь пасля гэтага пасткі на іх.

**51 сакавіка**

Неяк раптоўна ў цэнтры пакоя вырас энта... энкапліт. Адкуль насенне — незразумела. Энкаліптавае насенне можна адшукаць толькі ў Аўстраліі, адкуль выводзіць свой радавод бабуля Барбары. І калі Ахілес глядзіць на тое, як высока часам скача яна па канапе з сумкай паштальёна, ён дае ёй веры.

Сам Ахілес у Астрале не быў, але ў Кадабры было зялёнае пластмасавае вечка ад бутэлечкі з энта-хта-нта... з настойкай на лісці гэтага дрэва, карацей. Яна яе на дварэ знайшла і ўвесь час нюхала, а потым згубіла. І пасля гэтага раптам усё вырасла. І ў пакоі стала цесна, таму што энтапілт — гэта такое асаблівая шкоднае дрэва, якое толькі нюхаць прыемна, а калі яно расце ў вас ужо практычна на галаве, хочацца яго хутчэй выселіць, пакуль яно не выселіла вас. Ну, бабулі, вядома, падабаецца і Кадабры таксама: зеляніна ў кватэры, прырода зноў-такі. Аднак. Ахілес перасадзіў яго ў ліфтавую шахту — і цяпер там энкапцілавы рай. Ліфт не працуе, але па энтапілту лазіць можна. Усе суседзі вельмі задаволеныя.

**52 сакавіка**

З нагоды гэтага дрэва ў дом прыйшла спецыяльная жанчына з жыллёва-камунальнай службы і абвясціла, што за энтапціл у ліфтавай шахце будзе спаганяць камунальныя плацяжы, паколькі жыллёва-камунальная служба (то бок цётачка вось гэтая) яго выявіла. І ў паперцы-квітанцыі будзе пазначана асобным пунктам: «Карыстанне энкаліфтам». І пагражае гэтая спецыяльная жанчына кулаком з квітанцыямі ды стукае па дрэве нагой у пантофлі на вострым абцасе, ад чаго на энтапцэле казліныя капыткі ўтвараюцца. І жанчына гэтая, у пантофлі Адэлаіды Сабакаўны, начальніцы Ахілеса, родная сястра Маніока.

Выйшаў тады ад усіх жыхароў дома найпаважаны прадстаўнік — бабуля — ды і кажа: «Зараз будзе біг барабум!». Затым Бабуля спрытна зрабіла сальта назад і з ба-бумам самаліквідавалася на вачах удзячнай аўдыторыі. Цалкам аўтаматычна Маніока Сабакаўна апошні раз усадзіла абцас у дрэва, і не паспеў асесці попел ад Бабулі, спецыяльная жанчына ўцякла назад у сваю нару.

Бабуля аднавілася на наступны дзень у вентыляцыі дома. Там яе чакалі торт і катлеты. Катлеты ёй вельмі пасуюць, калі яна іх есць, у сэнсе яны ёй да твару. Такія справы.

ЗАПІСЫ

# ГЕРАДОЦІНКІ-11, або

Леанід ДАЙНЕКА

***

*Ах, паэзія, п'янкое віно,*
*Лекі ад злых дэпрэсій!*
*Ларыса Генію валачэ бервяно*
*Па зімовым сібірскім лесе.*
*Снег па пахі. Найедкі пот.*
*Аўчаркі на дыбкі ўсталі.*
*Яшчэ будуць Мао Цзэ Дун і Пол Пот.*
*Ужо ёсць — Сталін.*
*Зрабіцца б вавёркай, узляцець на кедр*
*І грызці-грызці арэхі.*
*Нізкі паклон вам за пакутаў букет,*
*Вялікія гуманісты чэхі.*
*Вы здалі паэтку, як здаюць багаж,*
*У рукі Цанавы-кАта.*
*І сон спакойна-радасны ваш.*
*І пеніцца піва кашлата.*
*Але, вядома ж, невіноўны Чэх,*
*Што ўзяў на душу крывавы грэх.*
*Ён помніць, як курчыўся ў полымі Гус.*
*Ён — нявольнік, як і беларус.*
*Ведае мудры чэшскі народ,*
*Што хутка скончыцца гульня без правіл.*
*І зашыецца ў норы цэкісцкі зброд.*
*І народзіцца Вацлаў Гавэл.*

***

*Жыву я як жыве*
*Уся мая краіна —*
*Разлад у галаве,*
*Пачуццяў штурханіна.*
*Ці мы адзін народ?*
*Ці дурні-асталопы?*
*Ці нам паўзці на Ўсход?*
*Ці бегчы да Еўропы?*
*Як быдла ў хлеў, ісці?*
*Трымаць жыццё за лейцы?*
*Быць азіятам ці*
*Рабіцца еўрапейцам?*
*Душа ў тузе дрыжыць*
*Нязводнай і суровай:*
*З якою верай жыць?*
*Якой маліцца мовай?*
*Ліцвінскі сын Лявон*
*Па прозвішчу Дайнека —*
*Б'ю ў ЕЎРАПЕЙСКІ звон,*
*Склікаю ЧАЛАВЕКАЎ!*

## У Краіне Лядовых Палацаў

*Уладзіміру Някляеву*

*Як, скажы, да цябе дагукацца?*
*Ці не згінуў ты, родны народ?*
*У Краіне Лядовых Палацаў*
*Не душа ў пашане, а лёд.*
*Дык ці трэба, паэт, надрывацца?*
*Верш твой злую сцяну не праб'е.*
*У Краіне Лядовых Палацаў*
*Клюшка з шайбай важней за цябе.*
*Ці напішаш ты мемуары?*
*Кроў цячэ і з вачэй, і са шчок.*
*Па паэтавым светлым твары*
*Хвошча чорны цяжкі дручок.*
*Ах, як подла і як балюча!*
*Дзе паэтаў білі вось так?*
*Спіць Няміга. Маўчыць Уручча.*
*І паўзе, як звер, аўтазак.*
*Вас пабілі. І вас аблаялі.*
*І на снезе ў святле ліхтароў*
*Кроў Някляева, кроў Някляева…*
*Хіба можна забыць гэту кроў?*

***

*Нам вяшчалі: «Лимит революций исчерпан».*
*І ўсюды пануюць згода і мір.*
*Але грымнуў Туніс аўтаматнымі чэргамі.*
*Але выбухнуў гнеўнаю плошчай Каір.*

*І паўстала лівійская ДжамахірЫя,*



*Што ў Кадафі жыла ў залатой турме.*
*Разбураюцца сцены гнілыя старыя.*
*Вецер волі шырока і ярасна дзьме.*
*Праз Сахару рэха пайшло. Праз экватар.*
*Паляцела праз джунглі. Праз акіян.*
*Звонкі пошчак паўсюль! Гэта ломяцца краты.*
*Гэта б'е рэвалюцыя ў свой барабан!*

## Плошча

***«На широкой площади убивали нас».***
***Эдуард Багрыцкі***

*Не засні ў паняверцы,*
*Крокам крылатым руш —*
*Семдзесят тысяч сэрцаў,*
*Семдзесят тысяч душ!*

*Вер вось такім імгненням!*
*Сэрца ў кулак вазьмі!*
*Тут устаюць з каленяў.*
*Робіцца тут людзьмі.*
*Вецер сцягамі палошча.*
*Плошча!*
*АМАП дручкамі хвошча.*
*Плошча!*
*Дручок балючы рабрысты.*
*Зяўнеш — галаву знясе!*
*Сёння ўсе дзекабрысты!*
*Сёння снежаньцы ўсе!*
*Мроі! Нябесныя знакі!*
*Мужнасць! Надзея! Народ!*
*Чорныя аўтазакі*
*Прагна ашчэрылі рот.*
*Цвёрдагранітны Ленін*
*Моўчкі глядзіць з вышыні.*
*Радасць! Натхненне! Маленне!*
*Вера ў лепшыя дні!*
*2010 год!*
*Плошча!*
*Радзіма!*
*Народ!*

***

14 студзеня 2011 года. Прэзідэнт Туніса на сваім самалёце ўцёк з краіны, прыхапіўшы з сабою ўвесь залаты запас нацыянальнага банку. Радасны народ святкуе перамогу — вуліцы аж кіпяць! Пажылая жанчына-мусульманка, узняўшы руку, натхнёна крычыць у кінакамеру:

— Гэта заклік да народаў усяго свету! Не бойцеся дыктатараў! Не бойцеся дыктатараў!

А хтосьці з палітычных кулінараў хацеў, каб такія, як яна, сядзелі дома і варылі боршч. Рэвалюцыя перамагла! Шаноўная спадарыня-мусульманка і сапраўды пойдзе зараз варыць боршч ці што там яны вараць у сваім Тунісе.

***

20 гадоў таму рухнуў Савецкі Саюз. Асабіста я не праліваў і не праліваю слёзаў, бо заўжды быў прынцыповым ворагам імперый, у якія б фарбы яны не фарбаваліся. Імперыя (у нашым выпадку расійска-савецкая імперыя) не можа быць добрай, не можа дэмакратызавацца. Яна можа толькі разваліцца. Ёй непатрэбен беларускі паэт Някляеў, як былі непатрэбныя Каліноўскі, Ластоўскі, Пазьняк… Яна быццам той вечна галодны воўк, які, вядома ж, невіноўны ў тым, што яму пастаянна хочацца есці і дзеля гэтага патрэбна некага забіваць. Такім ваўка стварыла прырода. А ўспомніў я пра распад савецкай імперыі ў звязку са словамі Станіслава Шушкевіча. Вось гэтыя словы: «Гістарычная каштоўнасць Белавежскага пагаднення ў тым, што Расія ўпершыню прызнала незалежнасць Беларусі (!), прызнала перад усім светам».

***

*Ішоў Паўлюк.*
*Упаў у люк.*
*Ішоў Максім.*
*Упаў за ім.*
*Ляжаць, крычаць,*
*Ды ім — каюк.*
*Ніхто не гляне*
*Ў гэты люк.*
*Глухі Іван*
*Умельцам быў —*
*Узяў і люк той*
*Заварыў!*
*І толькі чутна —*
*О-ё-ёй!*
*То нехта еньчыць*
*Пад зямлёй.*

***

Камяніца… Навальніца… Бліскавіца… Чараўніца… Крыніца… Таямніца… Маладзіца… Мілавіца… Якая прыгожая беларуская мова!

***

*Мне старасць б'ецца пад рабро.*
*Цішэй, спакойней крочу, бо*
*У класікі не абяруць,*
*Пенсію не адбяруць.*

***

Аказваецца, на мангольскай мове слова Манголія азначае — Краіна Непераможных. Вось так.

***

*Мы жывем у краіне адмоўных эмоцый,*
*Быццам бульба гнілая ў дзіравым кашЫ.*
*Тут рукам і сэрцам не хапае моцы.*
*І святога палёту не хапае душы.*

***

20 студзеня 2011 года ў 11 гадзін 38 хвілінаў (люблю дакладнасць!) скончыў працу над раманам «Той, каго ўдарылі па шчацэ», дзясятым па ліку. Калі не памыляюся, на сённяшні дзень я між беларускіх пісьменнікаў напісаў сама больш раманаў, хоць ніколі не гнаўся за колькасцю. Проста, у смак пісАлася, адчуваў радасць ад працы. Між гэтых раманаў восем на гістарычную тэматыку. Тут мяне таксама пакуль што ніхто не абагнаў. Калі параўноўваць літаратурную справу са спортам, то напісанне раманаў — забег на вельмі доўгую дыстанцыю. Бяжыш, пакуль не заколіць пад дыхаўку. Не ведаю, ці сяду зноў за пісьмовы стол, бо, шчыра сказаць, стаміўся. Няпросты быў лёс маіх раманаў. Іх жорстка крытыкавалі. Іх стараліся не заўважаць. Я не ўлазіў у загадзя сканструяваныя афіцыйнымі крытыкамі абоймы. Мяне таўклі ў крытычных артыкулах, а я пісаў, бо не мог не пісаць. І гэта не графаманства. Гэта — покліч нябёсаў.

Мой брат па беларускай літаратуры, хай цяжка, хай нявыкрутна, хай балюча і крыўдна — пішы! Мы, калі паклікаў нас Бог, павінны сказаць пра свой род, пра свой народ, пра месца нашага народу і нашай краіны на гэтай горкай трывожнай зямлі.

Але й найвялікшую радасць прынеслі мне мае раманы. За іх я атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Кастуся Каліноўскага, Літаратурную прэмію імя Івана Мележа, дыплом і залаты медаль лаўрэата прэміі імя Валянціна Пікуля, якія мне ўручыла Міжнародная асацыяцыя пісьменнікаў баталістаў і марыністаў за цыкл гістарычных раманаў.

Вядома, я радуюся, што людзі хоць і не густа, але чытаюць мае творы. А яшчэ я радуюся, што ўвёў ва ўжытак пяць літаратурна-гістарычных паняццяў: баявы кліч палачанаў «Рубон!», імя нашай старадаўняй Бацькаўшчыны «Ліцвінія», «Ордэн Святога Палямона», «Зеўс» — Згуртаванне еўрацэнтрыстаў і назву мініяцюраў «Герадоцінкі». Гэта, паверце, нямала для гістарычнага белетрыста, якім я сам сябе лічу.

***

У газеце чытаю невялікі артыкульчык і подпіс пад ім: Вера Філенка, капірайтар. Што за прафесія такая? Праз два дні сустракаю старую знаёмую цётку Нюру, якая (добра ведаю) пасля выхаду на пенсію падрабляе — падмятае тэрыторыю каля прыватных шапікаў.

— Кім працуеце? — пытаю дзеля прыліку.

— Падмятайтарам.

***

Бываюць здарэнні, на першы погляд, неістотныя і дробязныя, якія запамінаеш, тым не менш, на ўсё жыццё.

Спякотным летам 1957 года я паехаў са сваёй Змітраўкі на Урал, у горад Ніжні Тагіл. Было мне сямнаццаць. Быў я неўладкаваны і рамантычны. Паступіць у Клайпедскую мараходку не атрымалася, на шахту ў Данецку мяне не ўзялі, бо не меў васямнаццаці, і я рвануў на Урал, які паэт Твардоўскі (памятаеце?) называў «опорным краем державы, становым хребтом». «Опорный» край аказаўся надта ж суровым краем. У тое лета грымелі жахлівыя навальніцы з градам і чырвонымі маланкамі. Каля тагільскага вакзала, дзе я туляўся і начаваў, вецер ламаў тоўстыя старыя таполі, ламаў з пранізлівым трывожным трэскам. За два тыдні галоднага бадзячага жыцця я ўшчэнт знясілеў. Скончыліся апошнія грошы. Скончыліся мізэрныя харчы. Я ішоў і хістаўся. У вачах скакалі яркія бліскаўкі. Адно неадольнае дзікае жаданне жыло ўва мне: хоць штонебудзь кінуць на зуб. (У той час у мяне быў яшчэ поўны набор уласных белых вострых зубоў — трыццаць два!). І тут каля цэнтральнага ўваходу ў вакзал я ўбачыў дзябёлага барадатага мужычка, якіх у гэтых мясцінах называюць чалдонамі. Чалдон паважна сядзеў на лавачцы, расклаўшы перад сабой на газеціне цэлую гару акуратна нарэзанага сала і хлеба (апетытныя пахкія лусты!) і са смакам еў. Мяне быццам громам ударыла. Я, вельмі начытаны беларускі вясковы юнак, прагна праглынуў сліну, падышоў да мужычка і, стараючыся прамаўляць чыста па-расейску, стараючыся не збіцца на беларушчыну, сказаў:

# ШТУРХАНІНА ПАЧУЦЦЯЎ

— Дяденька, дайте мне, пожалуйста, поесть.

Чалдон вельмі ўважліва зірнуў на мяне, не спяшаючыся, дажаваў хлеб з салам, не спяшаючыся, выцер чырвонай хусцінкаю тлустыя пунсовыя вусны, не спяшаючыся, паклаў хусцінку ў кішэню і даў мне паесці. Даў малюсенькі кавалачак чорнага хлеба. Кавалачак быў тоненькі-тоненькі, аж свіціўся. Сам жа чалдон зноў налёг на сала. Вось табе і «широта русской души»!

* * *

Чаму сённяшнія беларускія ўлады не любяць бел-чырвона-белы сцяг? Чым гэты колер так рэжа ім вока? Здаецца ж, сцяг прыгожы, яркі, запамінальны. Кажуць, пад ім у другую сусветную вайну маршыравалі паліцаі. Але ж і ўласаўцы маршыравалі пад бел-сіне-чырвоным трохкалорам, які, тым не менш, з'яўляецца дзяржаўным сцягам Расійскай Федэрацыі. Значыць, справа не ў гэтым.

Думаецца мне, рэзкая нелюбоў да бел-чырвона-беліка выклікана тым, што дужа ж ён падобны на польскі бел-чырвоны сцяг. Вось каб ён быў бел-сіне-белы, падобны на расійскі, тады б яго шанавалі, цалавалі, прысягалі на ім.

Узнікае заканамернае пытанне: чым Расія лепшая за Польшчу? Нагадаю, што з Польшчай мы, беларусы, жылі ў шчыльным саюзе цэлых 408 гадоў — з часоў Крэўскай вуніі (1387 год) да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795 год). З Расіяй — 196 гадоў. З трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795 год) да знікнення з палітычнай мапы свету СССР (1991 год). Нагадаю, што ў Польшчы ёсць горад Мінск, Мінск-Мазавецкі. У Расіі Мінску няма.

* * *

У газетах вычытаў, што пасля брутальнага разгону АМАПам народнай дэманстрацыі 19 снежня 2010 года каля Дома Урада частка дэманстрантаў (чалавек трыццаць) шукалі ратаванне ў Чырвоным касцёле. Грукаючы жалезнымі шчытамі, на людзей няўмольна насоўвалася сцяна АМАПа. Людзі хорам прамаўлялі «Ойча наш», затым пачалі стукацца ў касцельныя дзверы, прасіць, каб іх упусцілі ўнутр Божага храма. Але знутры дзверы ніхто не адчыніў, хоць у касцёле, яўна, былі служкі культу. А міліцыянты шлі-падыходзілі ўсё бліжэй. І нарэшце ўзвіліся цяжкія дручкі.

Аб чым гэта я? Я аб тым, што яшчэ ў глыбокай даўніне (у той жа Грэцыі) самы люты злачынца мог, ратуючыся, забегчы ў малітоўню, дакрануцца рукою да алтара, і ён, злачынца, рабіўся недатыкальным. Я аб тым, што ў мінскім Чырвоным касцёле маецца абраз Маці Божай Нястомнай Дапамогі. Я аб тым, што заснавальнік Чырвонага Касцёла Эдвард Вайніловіч адчыніў бы дзверы, упусціў бы перапалоханых людзей, выратаваў бы іх, а там — будзь што будзе, а там, як кажуць, Бог — бацька. Але не адчынілі. Зрабілі выгляд, што не заўважылі. Не мы ім суддзі. Суддзя ім — Бог!

* * *

*Вясна… І, ветрам напятыя,*
*Хмары над горадам ходзяць.*
*Ніводнага мёртвага атаму*
*Не знойдзеце вы ў прыродзе.*
*Вясна… І нават на могілках*
*Промень гуляе юны,*
*Дрэвы растуць, спяшаюцца,*
*Карэнні ўрываюцца ў труны.*

* * *

«Чалавечы чэрап — самая непрыступная крэпасць». Так сказаў мудра-афрыстычны Карл Маркс. Гэта не перашкодзіла ягоным вучням-паслядоўнікам скрышыць на найдрабнейшы друз мільёны й мільёны такіх крэпасцяў.



З жонкай Зінаідай

* * *

*Маньяк*
*П'е каньяк.*
*Гуманіст*
*Грызе лаўровы ліст.*

## Парадокс

*Не лайдакі, не беззямельцы мы.*
*Вось парадокс, што дзівіць нас:*
*Кіруюць намі, еўрапейцамі,*
*Неўязныя ў Еўразвяз!*

* * *

У турэмнай камеры вязень ходзіць і ходзіць ад сцяны да сцяны. Сукамернік кажа яму:

— Думаеш, калі ты ходзіш, дык ты не сядзіш?

* * *

Мудрыя словы майго бацькі : «Трэба рабіць. Ляжачага хлеба нідзе няма».

* * *

Матчына крыло і ў мароз цёплае.

* * *

Жыццё — выпадковасць. Смерць — заканамернасць. Дык вып'ем, панове, за выпадковасць!

* * *

На працягу некалькіх апошніх гадоў я так захапіўся Вялікім Княствам Літоўскім, так даастатку аддаўся яму, нырнуў у ягоную глыбіню, увайшоў у ягонае магнітнае поле, што пачалі адбывацца смешнаватыя недарэчнасці. Разглядваючы новы электравыключальнік, які мы купілі для свайго лецішча, я радасна-здзіўлена сказаў жонцы:

— І тут яно!

— Што? — не зразумела Зіна.

— Вялікае Княства Літоўскае. Глядзі — на пластмасе выштамплевана: ВКЛ.

Жонка ўзяла электравыключальнік, крутанула ў руках:

— Усё зразумела. Табе трэба крыху адпачыць, трэба выключыцца. Якое Княства? ВКЛ —включить. ВЫКЛ — выключить. Так што выключайся, даражэнькі.

* * *

— Спадар дырэктар, прызначце мяне вашым намеснікам, і я горы за вас звярну, я буду правай вашай рукою!

— Добра, спадар Падхаліловіч, вельмі добра. Але маецца малюсенькая няўвязачка — я ад нараджэння ляўшун.

* * *

— Паважаныя рэдактары радыё і тэлебачання, прашу выканаць для маёй жонкі Марусі і для мяне народную песню «Санников остаётся с нами!». Выбарнік з шасцідзесяцігадовым стажам дзед Базыль.

* * *

Апошнім часам ва ўсіх, хто здольны думаць і цвяроза аналізаваць палітычную сітуацыю, рэзка знізіліся надзеі на Расію як на дэмакратычную краіну. Наша магутная ўсходняя суседка цвёрда пакрочыла імперскай дарогаю СССР. На сваіх межах яна падтрымлівае самыя адыёзныя, самыя жорсткія рэжымы. Будзь хоць султанам, хоць ханам, залівай крывёй падуладную табе зямлю, — абы танчыў пад расійскую дудку. Што гэта? Неакаланіялізм? Расізм?

Даю паважанаму спадарству адказ на пытанне. Гэта — нешта вельмі блізкае да імперскага расізму. Гэта — Расіізм!

У звязку з гэтым хачу нагадаць шаноўнаму спадарству вядомы верш Фёдара Цютчава, апалагета расійскай імперскай выключнасці:

*Умом Россию не понять.*
*Аршином общим не измерить*
*У ней особенная стать —*
*В Россию можно только верить.*

Вось якім я пачуў гэты верш з вуснаў украінскага паэта, калі мы сядзелі з ім у рэстаране ўладзівастоцкага гатэля «Золотой Рог», а за вакном бушаваў цыклон, што наляцеў з Японіі:

*Умом Россию не понять.*
*Аршином общим не измерить.*
*У ней особенная стать —*
*Россию можно только херить.*

Як кажуць — без каментару.

* * *

*Родныя словы гучаць увушшу.*
*Родныя гукі гояць душу.*
*Як ні стараўся, забыць іх не змог,*
*Хоць пратаптаў можа сотню дарог.*
*Там, дзе сінеюць Вольса і Друць,*
*Родныя словы са мною памруць.*
*Мой захаваюць голас і зрок.*
*Ружай праб'юцца праз белы пясок.*

## Слабадушным

*Разлюбілі тое, у што верылі.*
*Сіл на новы паход не стае.*
*Пад драпежным крылом Імперыі*
*Пахавалі галовы свае.*

## Сумненне

Ці ў той рацэ шукаю броду?
Ці той агонь нясу народу?

* * *

Не стыкуюцца страсць і старасць,
Хоць зусім падобныя словы.

## Люцыя Рэва, або Рэвалюцыя

У яе дужа рэдкае імя і прозвішча — Люцыя Рэва. Нязводная старадаўняя шляхетнасць струменіцца ад яе ва ўсе бакі. Тыя, хто ведаюць яе, называюць гэту хударэнькую блакітнавокую жанчыну Рэвалюцыяй. Яна пенсіянерка. Яна ходзіць на ўсе акцыі дэмакратаў, начапіўшы на свой чорны берэцік бел-чырвона-белы бант. Разы тры падчас разгону дэманстрацый ёй даставаў цяжкі амапаўскі дручок. Ды яна толькі ўсміхаецца. Яна верыць у непазбежную перамогу беларускай дэмакратыі.

— А як жа інакш? — кажа яна мне. — У нас, на Беларусі, ніколі не было цароў. У нас шляхта (а шляхты было каля пятнаццаці адсоткаў ад усяго насельніцтва дзяржавы) абірала караля. І кароль-вялікі князь служыў Гаспадарству. Ледзь што не так — яму выспятка пад зад і ўсё. І гуляй хлопец, рабі, што хочаш. Хочаш — пасві гусей. Хочаш — рэжся ў карты ў дурня.

Добра ўсведамляць, што жыве на нашай зямлі спадарыня Люцыя Рэва. Вось яна адзяе на галаву берэцік з бел-чырвона-белым бантам. Вось выходзіць са сваёй аднапакаёўкі і на плошчы ўліваецца ў гудлівую шчыльную калону дэманстрантаў. Блакітныя вочы ззяюць шчасцем і радасцю.

Удачы табе, Люцыя Рэва! Удачы ўсім тваім аднадумцам!

ФЕЛЬЕТОН

# ЦЭБАР

Кузьма ВЯСЁЛЫ

Намеснік губернатара Леанід Цэбар вельмі любіў павучаць сваіх падначаленых. Нават цяпер, едучы з чарговай нарады ў службовай «Вольве», ён ніяк не сунімаўся — вучыў вадзіцеля ідэалагічнай дысцыплінаванасці на дарозе.

«Ты не проста чалавека вязеш, Вася, ты вязеш чы-ноў-ні-ка, — гаварыў Леанід Аляксандравіч, пагладжваючы жывот, які ледзь не ўпіраўся ў лабавое шкло. — Гэта так званая апазіцыя можа шастаць туды-сюды без справы па дарогах ды вуліцах, перашкаджаючы вялікаму дзяржаўнаму будаўніцтву. А мы, чыноўнікі, выкарыстоўваем магістралі толькі па прамым прызначэнні. У ідэалагічных, так сказаць, мэтах. Наездзішся па пільных патрэбах за дзень так, што ажно жыць не хочацца. Але паміраць нельга. Тым больш без указанняў зверху».

Вадзіцель няспынна ківаў галавой, пагаджаючыся з жалезнымі аргументамі шэфа, які ад усхваляванасці ажно ўзмакрэў, з-за чаго зняў пінжак. Паправіўшы на носе-бульбіне акуляры ў берыеўскім стылі, намеснік губернатара працягваў: «Гляджу з акна аўтамабіля на лясы, палі, людзей — і душа радуецца, ажно на месцы ўседзець не магу ад усведамлення таго шчасця, якое чакае наш народ наперадзе. А хто працуе дзеля гэтага? Мы — чыноўнікі. Зранку да вечара, а то і да ночы. Стараемся, пакутуем, але з абранага шляху не збочваем. Бо ён адзіна правільны ва ўсім свеце».

У тым, што шлях сапраўды правільны, Цэбар не сумняваўся, асабліва пасля абавязковага вячэрняга прагляду цэнтральнага тэлебачання і стараннага вывучэння галоўнай газеты краіны. Тэлевізійныя перадачы і газетныя рэпартажы, напоўненыя нястрымным жыццёвым задорам і бесклапотным шчасцем, унушалі гонар за сваю радзіму, прымушаючы радавацца кожнаму пражытаму дню, асветленаму вобразам Самога. Пасля ўзнёслых тэленавінаў і вясёлых перадавіц намеснік губернатара быў гатовы да самых неверагодных здзяйсненняў, галава поўнілася новымі задачамі, а душа прагла яшчэ большых кар'ерных вышыняў ды ўзлётаў.

У начальнікі Цэбар выбіўся дзякуючы пратэкцыі свайго бацькі, колішняга партапаратчыка, які дапамог сыну пасля дырэктарства ў школе ўзначаліць аддзел адукацыі аднаго з райцэнтраў. Там чыноўнік стараўся праявіць сябе як толькі мог. Ідэалагічны імпэт здольнага службоўца быў заўважаны і ацэнены належным чынам, у выніку чаго Леанід Аляксандравіч неўзабаве перасеў у крэсла намесніка губернатара. Адтуль ён планаваў перабрацца ў сталічнае міністэрства, але пагарэў на грэшнай справе: аформіў сына на вучобу адначасова ў двух універсітэтах краіны, прычым паўсюль на бюджэтнай аснове. Цудам уседзеўшы ў крэсле намесніка губернатара, Цэбар вырашыў не рызыкаваць сытнай пенсіяй і надалей не ўлазіць у падобныя авантуры. Але душа неўтаймоўнага генератара ідэй патрабавала энергетычнага выйсця. Каб не «перагрэцца», Цэбар выкладваўся на любых нарадах, дзе гадзінамі вучыў падначаленых працаваць з ідэалагічных пазіцый на карысць народа. Асабліва чыноўнік любіў ставіць задачы перад педагогамі, у рабоце якіх, па ўласным меркаванні, разбіраўся лепш, чым міністр адукацыі. І гэта пры тым, што сам прайшоў чарговую атэстацыю толькі з трэцяга разу...

Едучы ў «Вольве» дамоў, Цэбар ужо пракручваў у галаве сцэнарый заўтрашняй калегіі ўпраўлення адукацыі. «Нічога без мяне зрабіць нармальна не могуць, — ці то радаваўся, ці то засмучаўся чыноўнік. — Усюды неабходна мая прысутнасць. Што зробіш, калі коснаязыкі начальнік «аблана» ні на што не здатны. Добрыя кадры на дарозе не валяюцца. Таму даводзіцца працаваць і за яго, і за іншых. Дурнота, вядома ж... Хаця лепш мець тупога падначаленага, чым аказацца пад кіраўніцтвам больш разумнага... Працуем з кадрамі па прынцыпе: чым горш — тым лепш».

Назаўтра на працягу ўсяго пасяджэння калегіі Цэбар няспынна нешта занатоўваў у блакноце, спыніўшыся толькі тады, калі перагарнуў яго апошнюю старонку. Выступаць намеснік губернатара мог гадзінамі, раўняючыся ў аратарскім майстэрстве на камандантэ Фідэля і вялікага сябра Самога Уга Чавеса.

Атабарыўшыся нарэшце за трыбунай, Цэбар, перасмыкнуўшы крацінным тварам, пачаў з галоўнага:

«Нельга забываць, што на носе выбарчая кампанія, ключавую ролю ў якой адыгрываюць дырэктары школ — кіраўнікі выбарчых участкаў. Менавіта ад іх самаахвярнай і старannай працы ў імя светлых ідэалаў Бацькаўшчыны залежаць вынікі галасавання. Апазіцыйныя злыдні, якія імкнуцца дэстабілізаваць грамадства і прадаць краіну Захаду ды расійскім алігархам, спадзяюцца на перамогу свайго дэмакратычнага кандыдата. Скажу прама: нам з такімі дзеячамі не па дарозе. У нас свой шлях, які дзякуючы мудраму кіраўніцтву Самога прывядзе ў рэшце рэшт нашу краіну да росквіту. Ніхто не клапоціцца пра народ так, як клапоціцца Ён. І мы павінны апраўдаць яго чаканні. У гэтым нам дапамогуць энтузіязм і вера ў вышэйшую справядлівасць. Мы абавязаны правесці выбары лепш, чым у іншых абласцях. Яўка ў нейкія 80–90 працэнтаў нашага губернатара не задавальняе. Неабходна ўпэўненая і аглушальная перамога, каб ні ў каго не засталося сумненняў у празрыстасці і сумленнасці выбарчага працэсу. На ўчастках павінна пабываць не менш як 100 працэнтаў насельніцтва вобласці, што гарантуе цвёрда-непахісную перавагу Самога. Упэўнены, пасля такіх вынікаў замежныя назіральнікі-дэмакраты праглынуць свае доўгія языкі і вымушаны будуць нарэшце пагадзіцца з воляй народа».

Цэбар задаволена рохкнуў і паглядзеў у залу, дзе прысутныя паслухмяна занатоўвалі пачутае ў блакноты.

«Падчас выбарчай кампаніі павялічваецца роля ідэалагічнай работы ў рэгіёнах, — працягваў намеснік губернатара. — Хопіць развешваць у школьных музеях лапці ды расстаўляць па кутах чыгункі з верацёнамі ды прасамі. Трэба ствараць музеі, у якіх прасочваецца шлях дзяржавы да росквіту. Вялікае значэнне ў выхаванні моладзі могуць адыграць, напрыклад, музеі хакея, дзе замест старажытнай непатрэбшчыны будуць прадстаўлены клюшкі, шайбы, лыжы, пробы лёду і снегу, партрэты вядомых спарцменаў і іх трэнераў... Пры гэтым асобнае месца ў такіх музеях павінна займаць максімальна поўная інфармацыя пра спартыўныя захапленні і дасягненні Самога, на якога варта раўняцца ўсім школьнікам».

Спартыўную тэматыку Цэбар любіў асабліва, бо яе вельмі любіла вышэйшае кіраўніцтва. Чыноўнік нават з'яўляўся старшынёй рэгіянальнага алімпійскага камітэта па далучэнні народа да розных відаў спорту. У фізічнай падрыхтоўцы абласная «вертыкаль» імкнулася не адставаць ад сталічнай. Губернатар Канстанцін Бубен, напрыклад, калі не ездзіў на сваім «Лэнд Крузеры», круціў педалі веласіпеда (Цэбар, які важыў паўтара цэнтнера, на такі подзвіг быў не здольны), наменнікі захапляліся плаваннем (Цэбар, у якога з-за жывата не былі бачныя трусы, аднойчы ледзь не затапіў палову горада, калі скочыў у басейн), а начальнікі ўпраўленняў з задавальненнем хадзілі на лыжах (нават летам у калідорах аблвыканкама чуўся іх шоргат).

Завяршаючы сваё трохгадзіннае выступленне, намеснік губернатара спыніў увагу на сусветным фінансава-эканамічным крызісе і яго праявах:

«Паўсюль чутны адны нараканні на нізкія заробкі, якія не павышаюцца, і цэны, якія няспынна растуць... Гэта няправільныя і шкодныя паводзіны з боку людзей. Грошай не хапае не толькі простаму народу, але і «вертыкалі». І чыноўнікі пры гэтым не плачуць і не стогнуць. Трэба ўлічваць фінансавую сітуацыю ў краіне. Думаеце, мне хапае на месяц нейкіх пяці–сямі мільёнаў рублёў?! Але вымушаны цярпець — нічога не паробіш. Будуць лепшыя часіны — абавязкова дабавяць, прычым па заслугах. Вось некаторыя зайздроснікі строчаць скаргі ў Камітэт нацыянальнага клопату на нашага губернатара, маўляў, набудаваў сабе, бессаромнік, ажно чатыры катэджы ў прыгарадзе, машыну за 100 тысячаў еўра набыў... Гэтыя зламысныя ананімы зусім не разбіраюцца ў задачах дзяржаўнага будаўніцтва, таму і плявузгаюць абы што. Наш Кіраўнік паставіў задачу аб выкананні жыллёвых праблем, і губернатар актыўна, заўзята і плённа ўвасабляе яе ў жыцці, за што, дарэчы, атрымаў імянны ўчастак у сталічных «Снегірах». Чалавек, можна сказаць, стараецца для народа як для сябе, а на яго бочкі коцяць. Сорамна...»

Цэбар загарнуў апошнюю старонку ў сваім тоўстым блакноце і важна пакрочыў з залы. Наперадзе чакалі нарады ва ўпраўленнях аховы здароўя ды спорту і турызму. Сацыяльная сфера, якую курыраваў намеснік губернатара, патрабавала пільнай увагі і дагляду, бо з'яўлялася прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі.




Малюнак www.akcent.dp.ua



▶ БЫЛІЦЫ

# ПТАХ ЦІ АНЁЛ?

Зьбігнеў Влодзімеж ФРОНЧАК



## Антыгона з Краснагаставу

Сёння Антыгону ставяць у тэатрах Парыжу, Варшавы і Масквы. Мастацтва аўтара Януша Главацкага з'яўляецца ўдалым аднаўленнем сувязяў з драматургіяй вялікага грэцкага трагіка Сафоклеса. Главацкі ў сучасных рэаліях вялікай краіны ўзвеў драму жанчыны, што годна і адважна агаласіла перавагу боскіх правоў над чалавечымі. Падзеі гэтыя не прыдуманыя, а ўзятыя з жыцця... А гісторыя любіць паўтарацца. Аднак, перш чым сітуацыя са старажытнай Грэцыі паўтарылася ў Новым Ёрку, яна разыгралася ў Краснымставе, маленькім мястэчку на Любельшчыне.

Ролю Антыгоны ў краснастаўскай драме адыграла сямнаццацігадовая Рыфка, дачка карчмара. Карчма яе бацькі знаходзілася на любельска-львоўскім шляху каля Ізбіцы. Быў 1915 год, другі год сусветнай вайны. Красныстаў занялі аўстрыйцы. У тыя часы на тых тэрыторыях расперазаліся злодзеі, авантурысты, ашуканцы і звычайныя разбойнікі. Да тых людзей належаў і герой гэтай легенды. Зваўся ён Яська Розвара, і быў дужы як тур. Разбойнічаў на прыгожай рацэ Вепж, часцяком выпіваў у корчмах Замосця, Шчэбжэшына і не прапускаў ніводнага фэсту ў ваколіцы. Кахалі яго, здаецца, усе панны і ўдовы, стралялі вочкамі замужнія, закахалася і Рыфка. Ведала яго добра, бо ў бацькавай карчме бываў частым госцем. Раззухваціўся вельмі Розвара, за нішто лічыў божыя запаветы і акупацыйныя ўлады. Абдзіраў багацеяў, не літаваў бедакоў, здаралася, рабаваў на шляху вайсковыя абозы. Цэлыя вазы! І коней з вупражжу не пакідаў, вядомая справа.

Аўстрыйцы не маглі заплюшчваць вочы на такую дзёрзкасць. Цярпелі Розвару, пакуль абдзіраў сялянаў, памешчыкаў ды карчмароў, але калі працягнуў рукі на вайсковыя грузы, стаў злачынцам, дыверсантам, тэрарыстам, як цяпер бы сказалі прапагандысты. Схапілі яго хутка, менавіта ў карчме Рыфкінага бацькі. Піў там вечарам больш, чым заўсёды, бо гаспадар частаваў адборнымі напоямі і не звягаў пра аплату. Саманадзейны зух не прадчуваў, што ў стайні схаваўся і чакаў яго вайсковы аддзел. Закутага Розвару зацягнулі ў Красныстаў, з ім і ягонага ад'ютанта Болька Рузэчку. Суд быў кароткі, уласна кажучы, яго зусім не было. Камендант сказаў толькі: «Павесіць!».

Да сёння ў Краснымставе паміж турмой і міжгародным вакзалам расце трохсотгадовая ліпа. На ёй зялёная шыльдачка з інфармацыяй, што гэта помнік прыроды. Тады, восемдзесят з нечым гадоў таму, шыльдачкі не было, ліпа стаяла за могілкавым мурам. Цвінтара ўжо няма, там база міжгародных аўтобусаў.

Пад той ліпай паставілі Розвару і Рузэчку. Вешаць іх хутка і таемна не збіраліся. Якраз наадварот. Сагналі з усяго мястэчка людзей, каб запомнілі, што новая ўлада мае цвёрдыя рукі і на літасць ніхто разлічваць не можа. Сярод натоўпу краснастаўцаў стаяў Ян Чвурнуг, дзед Яна Хенрыка Ціхошы, папулярнага паэта з Краснагаставу. Дзед — тады падлетак — перажыў дзве сусветныя вайны і вайну польска-бальшавіцкую, пра атамана Яську Розвару распавядаў яшчэ ў васьмідзясятых гадах бурлівага дваццатага стагоддзя.

Смертнікам надзелі петлі і выбілі з-пад ног зэдлі. Рузэчка роспачна задрыгаў нагамі і знерухомеў, над Розварам парвалася вяроўка. Ускрык радаснага здзіўлення прайшоў праз натоўп; камендант спалатнеў, Розвара лёгка ўсміхаўся.

Ёсць няпісаны закон: калі рвецца вяроўка, смертніку даруецца жыццё. Але была вайна, прытрымліваліся толькі права, выгаднага для мацнейшых. Так што скруцілі шнур зноў, але ён аказаўся кароткім. Не даставаў да галіны. Збянтэжанасці аўстрыйцаў, здавалася, не будзе краю. Разбойнік увесь час усміхаўся. Некалькі дзён таму варажбітка-цыганка сказала яму, што ён не загіне ад чалавечай рукі. Няўжо тая загадкавая варажба спраўджвалася?

— Пасадзіць яго на каня! — Крыкнуў хтосьці з афіцэраў. Жаўнеры імгненна зразумелі сэнс загаду. Коннаму хапала карацейшай пятлі... Каня хлопнулі па задзе, і ён скочыў уперад. На гэты раз шнур вытрымаў. Прароцтва часткова спраўдзілася. У абдымкі смерці разбойніцкага атамана занёс конь.

— Павінен вісець тыдзень! Хаваць забаронена! — Крыкнуў па-нямецку камендант, а перакладчык пераклаў.

Аднак ужо ўначы Розвара быў зняты і пахаваны. Зрабіла гэта Рыфка. Ёй дапамагаў малодшы брацік. Ён, нягледзячы на свой горб, уздзёрся на ліпу, перарэзаў шнур, а Рыфка зацягнула цела нябожчыка на цвінтар і там пахавала. Некаторыя казалі, што магілы не капала, а паклала цела ў склепе нейкай заможнай краснастаўскай сям'і. Таму аўстрыйцы не знайшлі слядоў свежай зямлі. Зрэшты, на пошукі пахаванага не было часу. Трэба было пакараць жывых. Вінаватую хутка схапілі, яна не адмаўлялася ад свайго ўчынку. На жыдоўскую грамаду наклалі кантрыбуцыю. Рыфку пасадзілі пад замок. Паводле адных — у арыштанцкай камеры, паводле другіх — бацька сам зачыніў дзяўчыну ў каморцы. Месца не мае значэння. Несумненна толькі, што замкнутая здзейсніла самагубства. Як Антыгона.

## Манах. Птах ці анёл?

Увесну паехаў я ў Падую, да святога Антонія. Мне паказалі яго хабіт і косці. Не хацелася верыць, што яго няма. Гэта ж апякун няўважлівых, які ўжо сямсот гадоў падкідвае людзям згубленыя рэчы.

З велічэзнага падуанскага храму я выйшаў на маленькі дзядзінец. Пах магноліі запоўніў яго. Куст, а дакладней — цалкам ужо сфармаванае дрэўца, абсыпанае бела-ружовым квеценем. З хвіліну цешыўся незямным водарам. Грэшна падумалася: так павінен пахнуць анёлак пасля купання. І раптам... Высока, за тры метры над зямлёй небяспечна выгнутыя галіны. І там, быццам птушка, учапіўшыся за вяршынку сядзеў манах. Сядзеў, але хацеў спусціцца. І не мог. Немалады ўжо, нават стары, страшэнна перапалоханы. Заўважыў мяне і пачаў крычаць. Я ведаў, натуральна, восем, можа нават пятнаццаць італійскіх слоў, але ніводнага знаёмага не пачуў. Здагадаўся толькі, што ён просіць дапамогі. А я быў адзін, і не мог яго выратаваць.

— Божа! — узмаліўся я, — зрабі яго птушкай.

І мне здалося, што ён каркнуў.

— Можа, у цябе вырастуць крылы... — з надзеяй усклікнуў я. — Вытрывай яшчэ хвілінку. Пацярпі трохі!

Манах няўцямна глядзеў на мяне, і я адчуў сябе ніякавата. А раптам ён пакрыецца пер'ем? Не, быць сведкам цуду мне не па сілах. Я кінуўся ў цёмны калідор кляштара. Трэба было нешта рабіць. Залемантаваў: драбіна, драбіна, дайце драбіну!

Дзіўным рэхам загучалі польскія словы ў цёмным і таямнічым італійскім інтэр'еры. Але да кагосьці даляцелі. Высунулася лысая галава манаха.

— Ваш Шымон Драўнянік хоча яшчэ раз ступіць на зямлю! — закрычаў я.

Мяне не разумелі. Манах бездапаможна развёў рукамі.

— Божа, — прашаптаў я. — Здымі з гэтай Бабілонскай вежы!

Жэстамі паказаў, што трэба драбіна. Маю пантаміму той не зразумеў. Не дзіва. Актор я кепскі. Расчараваны, вярнуўся пад квітнеючае дрэўца.

На бруку стары манах абтрасаў ад пылу ўбранства. Пазнаў мяне.

— Бачыш, сынку, што тут робіцца! — казалі ягоныя вочы.

— Зляцеў?

— А што было рабіць?

На яго стаптаныя сандалі вецер кінуў пёрка з птушыных, а мо анёльскіх крылаў.

## Польскія коні ў Беларусі

З беларускім пісьменнікам Аляксеем Філатавым я пазнаёміўся ва Украіне, у Ковелі, сустракаў яго яшчэ ва ўкраінскім Луцку. У Мінску ж, дзе часам бываю на збіранках пісьменнікаў і журналістаў — ніколі. На маё пытанне наконт адсутнасці на сталічных нарадах абыякава махнуў рукой — туды лягчэй даехаць з Варшавы, чым з беларускай правінцыі — і ад нязручнай гутаркі ўхіліўся.

Нарадзіўся ён у перадваеннай Польшчы пад Уладавай, і там жа пачаў адукацыю. У дзяцінстве, як шмат хто з палякаў, захапляўся чытаннем Сянкевіча. Лёс склаўся так, што застаўся жыць у Савецкім Саюзе, а пасля яго распаду выпала яму жыць у Беларусі, у Берасці.

Гадамі не карыстаўся польскай мовай, але падчас рэдкіх кантактаў з палякамі прыпамінаў вядомыя з дзяцінства прыказкі, выслоўі, звароты.

— Збышак, Збышак Багданец! — Радаваўся, калі маё імя нагадала яму Сянкевічавага героя.

У Луцку, дзе мы ўсю ноч гутарылі, дамагаўся польскіх песень, да слёз расчульваўся, калі мы, неміласэрна фальшывячы, спявалі стары шлягер «Цёк ручай зялёным лесам». Ахвотна і шмат апавядаў. Аб прачытаным, аб людзях, аб сваёй працы. Усё жыццё працаваў на чыгунцы. У часы Савецкага Саюза праваднікам дапяў ажно да Кітая, але бываў і ў Польшчы, пад сваёю Уладавай. Там пачуваўся як дома...

Ягоныя гісторыі былі кароткія, дынамічныя, кожная з прыгожым сюжэтам. Я падумаў было, што ён распавядае свае творы. Калі так, то павінен быць някепскім пісьменнікам. Размаўляў па-расійску, па-беларуску, па-ўкраінску — у залежнасці ад таго, якой нацыянальнасці былі слухачы. Спякотным летам 2010 года, у Ковелі, на начную выпіўку літаратараў прыйшоў са сваім земляком, паэтам Васілём Жуковічам. Алкаголю сабе не шкадаваў, а для кампаніі — пары пісьменнікаў з Украіны і Польшчы — не шкадаваў анекдотаў, цікавых гісторый, бытавых і біяграфічных.

Перад выхадам на пенсію працаваў на рамонце пуцей ля мяжы. У брыгадзе з дванаццаці чалавек. Перад імі знаходзіўся мост праз памежную раку Буг, за ім — Польшча. Буг быццам бы і вялікі, але і малы — людзі ў Польшчы бачныя як на далоні. І не толькі людзі, а і аўтамабілі, сялянскія фурманкі, коні і ровары. Бачыў, як адзін вясковец прывязаў лейцамі да агароджы запрэжаных коней і пайшоў па сваіх справах у гарадскія ўстановы, а мо ў крамы... У гэты час на мосце загудзеў цягнік. Глухім, шмат каму непрыемным водгаласам па рэйках загрымелі колы таварных вагонаў, выклікаючы боль у вушшу. Коні спудзіліся, парвалі лейцы і паімчалі праз мост. Спыніліся на тэрыторыі Беларусі, каля насыпу, дзе працавалі Філатаў з брыгадай.

— Калаціліся ад пярэпалаху, а можа ад нерваў. І не жадалі рушыць з месца! Гаспадар прыйсці не мог, бо — мяжа, але мы, чыгуначнікі, мелі права яе перайсці. Хацелі коней вярнуць, таму пасля пэўных развагаў кожны ўхапіўся за конскую нагу і сантыметр за сантыметрам пасунулі іх у бок Польшчы. І гэтак — праз мост, праз мяжу, у Польшчу, — скончыў Філатаў.

— Колькі вас учапілася сваімі лапамі за конскія ногі? — пацікавіўся худы і флегматычны Жуковіч.

— Як колькі? Васьмёх! Два кані, восем ног, па чалавеку на кожную нагу!

— А астатнія што рабілі? — высвятляў Жуковіч.

— Як — што? — зазлаваў на пытанне Філатаў — Назіралі!

**На тых тэрыторыях расперазаліся злодзеі, авантурысты, ашуканцы і звычайныя разбойнікі. Да тых людзей належаў і герой гэтай легенды**



Пераклад з польскай Паўла Ляхновіча

ЗГАДКІ

# БІЛЕТ НА АРМАГЕДОН

Алесь КОМСІЧ



**Гісторыя, якую я хачу распавесці, выглядае неверагоднай і хутчэй нагадвае эпізод з прыгодніцкага блок-бастэра.**

Але насамрэч гэта рэальная падзея, якая здарылася акурат 10 гадоў таму ў сям'і аднаго з маіх добрых знаёмых — урача адной з мінскіх паліклінік. Памятаю, што паслухаўшы яе тады, я ў які ўжо раз падумаў, што мы мяркуем, а жыццё вызначае... Яно часам ставіць нас у абставіны, якія дасюль мы не маглі прысніць нават у самым жахлівым сне, абставіны, калі трэба рабіць адзіна правільны выбар. Але ніхто не ведае, за якой мяжой пачынаецца такое вымярэнне нашага існавання, калі ад нас саміх, ад нашага выбару ўжо нічога не залежыць.

Калі Віталю — сыну майго знаёмага — 19-гадоваму студэнту Беларускага медыцынскага ўніверсітэта напрыканцы лета 2001 года прапанавалі паехаць на тыдзень у Нью-Йорк па праграме студэнцкага абмену, ён быў, як кажуць, на сёмым небе ад шчасця. Спойнілася ягоная даўняя мара: пабыць у адным з найвялікшых і адметнейшых гарадоў свету, сусветным цэнтры фінансаў, навукі, які ўвабраў у сабе элементы культуры практычна ўсёй чалавечай цывілізацыі.

Прыляцеўшы ў Нью-Йорк, Віталь спыніўся на знакамітай Брайтан Біч, у свайго амерыканскага сябра, якога звалі Арцём — сына эмігрантаў з былога СССР. Праграма была разлічаная на тыдзень, і ён праляцеў як адно імгненне. Віталь быў літаральна перапоўнены ўражаннямі, і яму і ў галаву не прыходзіла, што самае неверагоднае наперадзе...

Дзень 11 верасня мусіў стаць апошнім днём знаходжання ў Нью-Йорку. Віталь з сябрамі збіраўся ўрэшце ў доўгачаканую экскурсію ў адзін з найбагацейшых мастацкіх музеяў свету — Fine Arts Museum. Але перад тым меркаваў наведаць яшчэ адну нью-йоркскую славутасць — своеасаблівы сімвал гэтага гандлёва-фінансавага мегаполіса — знакаміты Сусветны Гандлёвы Цэнтр (СГЦ), што размяшчаўся ў дзвюх найвялікшых у свеце 110-павярховых башнях-хмарачосах вышынёю 412 метраў.

Прачнуўся Віталь чамусьці вельмі рана, быццам нешта разбудзіла. Ледзь раскатурхаў Арцёма. Хлопцы хутка сабраліся і выйшлі з дому ў восем раніцы. Да выспы Манхэтан, дзе месціўся СГЦ, ехаць трэба было на метро, але перад тым Віталь з Арцёмам павінны былі сустрэцца яшчэ з адным сябрам. І той, па словах Арцёма, чалавек дасюль надзвычай педантычны, чамусьці спазняўся. Прачакалі паўгадзіны і, не дачакаўшыся, скіраваліся да метро, згадваючы свайго сябра вострым слоўцам.

Ехаць падземкаю да Манхэтана трэба было каля гадзіны. Калі выйшлі на паверхню, то адразу звярнулі ўвагу на дзіўныя паводзіны мінакоў. Большасць з іх стаялі, бы прыкутыя, на месцы і, задраўшы галовы, глядзелі ўбок якраз тых самых дзвюх башняў СГЦ, куды і мелі патрапіць хлопцы. А з верхніх паверхаў аднаго з хмарачосаў густымі клубамі валіў чорны дым...

Хлопцы далучыліся да натоўпу. Зрэшты, тое, што адбывалася ў СГЦ, напачатку не здзівіла — юнакі і не такое бачылі ў вядомых галівудскіх фільмах-катастрофах. І ў іх, як, відавочна, і ў большасці мінакоў, мільганула думка, што ідуць здымкі чарговага блокбастэра. Рашылі спытаццца ў каго-небудзь, што ж там насамрэч адбываецца, але не паспелі дагаварыць, як пабачылі самалёт, які ляцеў на вельмі нізкай вышыні. Віталь сцвярджае, што і гэта яго тады не здзівіла — чаго не зробіш дзеля эфектных кадраў у кіно! Але раптам самалёт той неяк вельмі ўжо рэальна ўрэзаўся ў другую башню СГЦ. «Кіназдымкі» атрымоўваліся нейкімі занадта праўдападобнымі...

Нешта незразумелае адбывалася і на вуліцах, якія вялі да СГЦ. Па іх са страшэнным візгам імчаліся машыны хуткай дапамогі, пажарныя і выратавальнікі. Цікаўнасць гнала хлопцаў бліжэй да месца здарэння, але ўсе вуліцы туды ўжо аказаліся перакрытымі паліцэйскімі. Нехта з мінакоў у той момант выказваў услых упэўненасць, што гэта хутчэй за ўсё — тэрарыстычныя акты... Нехта пачаў крычаць, што гэта ніякія не тэрарысты, а пачынаецца трэцяя сусветная вайна... Некаторыя з «гледачоў» пачалі плакаць, іншыя маліцца Богу...

Віталь згадвае, што ў яго ў той момант з'явілася ўражанне, быццам бы тыя з мінакоў, у каго былі сотавы тэлефон, усе разам сталі ўдзельнікамі нейкай адной агульнай тэлефоннай размовы. Усе яны нервова крычалі ў трубку нешта амаль адно і тое ж, імкнучыся некаму невядомаму растлумачыць сітуацыю. І здавалася, што гэты Нехта — адзіная істота — і што ён чуе ўсіх адразу, але з-за разнабою меркаванняў аніяк не можа зрабіць высновы, што ж насамрэч адбываецца ў тым навяўленым пекле на выспе Манхэтэн.

І з другога гмаху, як і з першага, паваліў густы дым, а з вокнаў пачалі сыпацца нейкія шчэпкі (як потым аказалася, гэта былі людзі, якія спрабавалі ўратавацца ад полымя). Потым першая башня СГЦ з вялікім трэскам і грукатам пачала прасядаць і хутка склалася, як картачны дамок. Зямля гудзела і дрыжэла пад нагамі.

Часу хлопцы не адчувалі. Ён як бы спыніўся ў нейкім жахлівым атупенні ад страшэннага ціску вялізнай бяды (а што гэта бяда, ужо ніхто не сумняваўся!), якая ўпершыню ў гісторыі абрынулася на гэты адзін з багацейшых і квітнеючых гарадоў свету. Праз нейкае імгненне са страшэнным трэскам пачала асядаць і другая башня СГЦ. Гіганцкія клубы дыму і пылу імкліва пачалі набліжацца да таго месца, дзе стаялі хлопцы. Віталь успамінаў, што менавіта ў гэтыя хвіліны ён з сябрам неяк раптоўна ахапіў нейкі амаль першабытны жах — і яны разам з натоўпам стрымгалоў кінуліся ўцякаць... Пачалі шукаць уваход у метро, але на той час метро паўсюль было перакрытае, ад чаго паніка яшчэ больш узмацнялася.

Самай страшнай у гэтай сітуацыі, як згадвае Віталь, была невядомасць. Бо ніхто тады ўсё ж толкам не разумеў, што насамрэч адбываецца. На адной са станцыяў уваход у метро аказаўся адчыненым. Хлопцы з вялізнай цяжкасцю ўціснуліся ў адзін з вагонаў. Цягнік ішоў вельмі павольна, з вялікай асцярожнасцю...

На Брайтан-біч у рускім рэстаране, куды, ашалелыя ад перажытага шоку, яны зайшлі папіць, ішла трансляцыя расійскага канала НТВ, дзе давалі апошнія навіны пра тэракты у ЗША. Так, цяпер ужо ніхто не сумняваўся, што гэта былі тэракты, прычым выдатна падрыхтаваныя. Стала вядома, што апроч СГЦ моцна пашкоджаны Пентагон — амерыканскае міністэрства абароны, а яшчэ адзін самалёт, які скіроўваўся на атамную электрастанцыю, быў збіты супрацьпаветранай абаронай... Мяркуемая колькасць загінулых магла быць звыш пяці тысячаў чалавек!..

**Ніхто не ведае, за якой мяжой пачынаецца такое вымярэнне нашага існавання, калі ад нас саміх, ад нашага выбару ўжо нічога не залежыць**



І ў той момант да Віталя раптам дайшло, што калі па НТВ перадаюць такое, то ягоныя бацькі ў Мінску таксама ўсё гэта бачаць! І, зразумела (напярэдані Віталь паведаміў ім пра свой намер наведаць СГЦ па тэлефоне), хвалююцца за ягоны лёс. Ён куляй выскачыў з рэстарана і пабег да бліжэйшага тэлефона-аўтамата. У Мінску вечар, і ўсе ягоныя сямейнікі павінны быць дома. Ад хвалявання бацька крычаў у трубку... Віталь паспеў сказаць, што пастараецца вылецець дадому як мага хутчэй — і аўтамат адключыўся. З гэтай хвіліны тэлефонная сувязь ЗША са светам была перарваная...

Вечарам хмары дыму і пылу з месца трагедыі дайшлі і да Брайтан-біч...

Але, каб вылецець заўтра, ды і ўвогуле ў бліжэйшыя дні, як аказалася, не магло быць і размовы — такіх, як Віталь, было вельмі шмат. А пасля катастрофы ўсе рэйсы былі адмененыя. Некалькі дзён прайшлі ў цяжкай невядомасці, што нараджала ў душы страх і безвыходнасць...

Хлопец прыгадаў, як за некалькі дзён да 11 верасня яму прысніўся сон, што быццам бы здарыўся канец свету і ён ніяк не можа вярнуцца дадому з Амерыкі. Сон, як аказалася, быў ледзь не на 100% «у руку». Да Віталя раптам дайшло, якую ролю ў іхным з Арцёмам лёсе адыграў іхны сябра, які «падвёў» іх, спазніўшыся на сустрэчу. Страшна было і падумаць, што магло б быць, калі б яны выехалі на Манхэтан на тыя паўгадзіны раней! Гэтая думка яго проста ашаламіла! Атрымлівалася, што небарака сваёй «неабавязковасцю» выратаваў ім жыццё!

Што ж да вылету дадому, то заставалася толькі чакаць... У касе аэрапорта Віталя запісалі ажно на 24 верасня. Але ён амаль штодзень наведваўся туды і літаральна тэрарызаваў служачых, патрабуючы, каб яго адправілі як мага хутчэй. Ён спасылаўся на тое, што ён студэнт і што ў яго ўжо скончыліся сродкі на пражыванне. Па той жа праграме ў Нью-Йорку разам з Віталем былі яшчэ два хлопцы з Мінска, з якімі ён пазнаёміўся яшчэ на радзіме. Ім неяк пашчасціла раздабыць білеты дадому на 17 верасня. Віталь прыехаў іх праводзіць, і раптам яму паведамілі, што на гэты ж рэйс у Мінск (праз Франкфурт-на-Майне) ёсць адно свабоднае месца. Хлопец куляю памчаўся на Брайтан за рэчамі, але ўсё ж не паспеў — самалёт адлящеў...

Але гэты дзень усё ж аказаўся шчаслівым для яго. Літаральна праз некалькі дзясяткаў хвілін Віталю зноў прапанавалі білет на Мінск праз Вену. Узрадаваны хлопец вылецеў урэшце на радзіму.

У Мінску ён даведаўся, што рэйс праз Франкфурт, на якім ляцелі яго сябры, па нейкіх прычынах затрымаўся. У выніку ён апярэдзіў сяброў на некалькі гадзін...

Ці варта казаць, якой гарачай была сустрэча з роднымі і блізкімі...

Сёння Віталь ужо жанаты чалавек. Працуе, як і бацька, урачом, праўда, не ў Беларусі, а ў Кітаі. Па словах бацькі, хутка павінен наведацца ў госці. Гісторыя, што адбылася з ім 10 гадоў таму, не забываецца і стала сямейным паданнем...

ГІСТОРЫЯ

# ВІЛЕНСКІЯ МЕТАМАРФОЗЫ

Алег АНЦУКЕВІЧ



Вільнюс. 1939 год

## Апошні дзень польскай Вільні

1 верасня 1939 года Нямеччына напала на Польшчу — і пачалася Другая сусветная вайна. Некаторыя фрагменты тых падзей выразна захаваліся ў памяці 9-гадовага хлопчыка. Доктар сацыяльных навук **Алег Мікалаевіч АНЦУКЕВІЧ** (Вільня, Летува) успамінае:

«Жыхары Вільні паступова пачалі абвыкаць да будняў вайны: зацямнення вокнаў па вечарах і горада — па начах; капання равоў у парках і скверах; аб'яваў паветранай трывогі па радыё і гучнагаварыцелях; выцця сірэнаў, налётаў нямецкай авіяцыі і бамбёжак; чэргаў па прадукты ў крамах; разлепленых амаль на кожным куту заклікаў быць пільнымі і выяўляць варожых шпіёнаў і г.д. З кожным днём забеспячэнне насельніцтва прадуктамі сілкавання станавілася ўсё цяжэй. Некаторыя крамы наогул зачыніліся, а ў пакінутых — тавара станавілася ўсё менш. Каб купіць самае неабходнае, даводзілася выстойваць у чэргах.

Ішоў 18-ы дзень вайны. Мая маці ад кагосьці даведалася, што менавіта ў гэты дзень у харчовай краме на вуліцы Віленскай (каля кінатэатра «Геліёс») будуць прадаваць муку. Са мной, 9-гадовым сынам, яна стала ў вялізную чаргу па жаданы прадукт. Крама была зачыненая, але людзі гаварылі, што яе хутка адкрыюць, бо мука ўжо завезеная. Народ цярпліва чакаў. У падобнай невядомасці мы прастаялі некалькі гадзін. І раптам на вуліцы пачаўся нейкі незвычайны рух. Спачатку ў бок «Зялёнага моста» праехалі некалькі вазоў, нагружаных рэчамі; ехалі, мяркуючы па знешнім выглядзе, абшарнікі. Затым праехалі некалькі фаэтонаў мясцовых фурманаў, таксама цалкам загружаных, з відавочна багатымі людзьмі. Чым далей ішоў час, тым жвавей станавіўся рух — і толькі ў адным кірунку. Літаральна адзін за іншым ехалі аўтамабілі, набітыя людзьмі і рэчамі, простыя калёсы. Калі дзень стаў хіліцца да вечара, па вуліцы цякла суцэльная рака транспартных сродкаў, уключаючы веласіпедыстаў.

Публіка ў чарзе здзіўлялася:

— Што гэта дзеецца? Чаму такая маса народу кудысьці едзе?

Стала прыкметна больш паліцыянтаў, афіцэраў. Людзі нічога не маглі зразумець і разгублена глядзелі на гэтую бясконцую працэсію.

Тым часам пачало шарэць. Транспартны струмень паступова стаў памяншацца і неўзабаве зусім спыніўся. Людзі, прастаяўшы ўвесь дзень у чарзе, нарэшце зразумелі, што іх падманулі. Усе пачалі разыходзіцца па хатах. Пайшлі і мы з маці. Па дарозе віленцы абмяркоўвалі незвычайны рух у бок «Зялёнага моста» і выказвалі розныя здагадкі. Часцей за ўсё гаварылася, што ўся гэтая маса людзей накіроўваецца па вуліцы Вількамерскай (цяпер Укмяргес) да летувіскай мяжы, але чаму гэта адбываецца, ніхто не мог зразумець.

Калі мы падышлі да Ратушнага пляца, ужо зусім сцямнела. Але ля Вострай Брамы нешта свяцілася ў агульнай апраметнай цемры. Па Вялікай вуліцы мы падыходзілі бліжэй — і амаль аслупянелі. Уся Вострабрамская вуліца ажно да «Святых Варотаў» была ярка асветленая пражэктарамі, таму было светла, як днём. Уся прастора была запоўнена народам. Усе былі ў прыўзнятым настроі, радасна ўсміхаліся, а пры набліжэнні да «Святых Варотаў» наогул упадалі ў нейкі радасны экстаз. Людзі кідаліся адзін да аднаго, абдымаліся, цалаваліся, спявалі патрыятычныя песні і ўдзячныя малітоўныя гімны. У натоўпе бегалі хлапчукі — разносчыкі газет, і ўсім прапаноўвалі так званы «Dadatek nadzwyczajny» да штодзённай віленскай газеты з ашаламляльнымі навінамі: «Гітлер забіты! Польскія войскі ад абароны перайшлі да наступальных баёў! Саюзнікі высадзіліся ў Польшчы! Чакаюцца вялікія перамены ў палітыцы!» і г.пд. Народ радаваўся: «Перамога! Хвала Войску Польскаму!»...

У капліцы «Святых Варотаў» ішло набажэнства. Прабіцца скрозь жывую сцяну радаснай публікі было не так і проста. Але мы дабраліся амаль да сцэнаў капліцы, калі ксёндз звярнуўся да народа. Даслоўна не памятаю, але сэнс паўтараў загалоўкі газетных публікацый: Італія разарвала саюз з Нямеччынай і ўступае ў барацьбу на баку Польшчы, Англіі і Францыі; Гітлер забіты, у кіраўніцтве Нямеччыны — разброд; нямецкі наступ на Варшаву спынены, паўночная групоўка польскіх войскаў перайшла ў контрнаступленне і рухаецца на Кенігсберг. Гэтыя словы выклікалі ў натоўпе новыя выбухі радасці. Людзі са слязьмі на вачах абдымалі адзін аднаго, цалаваліся, ахопленыя ўсеагульнай весялосцю.

Сяк-так мы прабіліся праз гэты радасны натоўп і выйшлі на пляц, размешчаны перад «Вострай Брамоай». І зноў уразіліся

> Людзі кідаліся адзін да аднаго, абдымаліся, цалаваліся, спявалі патрыятычныя песні і ўдзячныя малітоўныя гімны

апраметнай цемры і нешматлікім мінакам.

Ачмурэлыя ад убачанага і пачутага, па цёмнай і пустэльнай Піўной вуліцы мы паспяшаліся дахаты. Калі падыходзілі да манастыра сясцёр-«візітовак», што на вуліцы Роса, пачулі быццам грымоты. У небе зашугалі ні то маланкі, ні то зараніцы. Маці гучна сказала, што дзіўна назіраць навальніцу ў другой палове верасня. У гэты час нас дагнаў пажылы рабочы і ў адказ на маміныя словы заявіў:

— Пані памыляецца. Гэта не навальніца, а бальшавіцкая артылерыя абстрэльвае прыгарад Вільні.

— Якія бальшавікі? Што вы вярзеце?! — запярэчыла маці.

— Пані не ведае? Бальшавікі яшчэ ўчора перайшлі мяжу Польшчы, і цяпер іх перадавыя часткі знаходзяцца на подступах да Вільні, — «адукаваў» нас пралетар.

На наступны дзень, 19 верасня 1939 года, Чырвоная Армія ўступіла ў Вільню і мы апынуліся ў Савецкім Саюзе.

Хто арганізаваў вышэйапісаную бутафорыю, дакладна не вядома. Магчыма, мясцовыя ўлады, каб адцягнуць насельніцтва ад масавых уцёкаў у Летуву, якія мы назіралі, стоячы ў чарзе? Пасля нідзе і ніколі мне не давялося сустрэць хоць бы якую інфармацыю аб гэтым.

Мяркуючы па аповедах відавочцаў, савецкія танкі з'явіліся на ўскраінах Вільні яшчэ 18 верасня каля 4-5 гадзін дня. Мой знаёмы Юрый Зімніцкі распавядаў, што прыкладна ў гэты час праходзіў па вуліцы Ліпоўка каля праваслаўных могілак. Раптам на вуліцы з'явіліся 2 ці 3 савецкія танкі. Танкіст з першай «баявой машыны» паклікаў мінака і спытаў: «Гэта ўжо Вільня?». Калі Юрый адказаў сцвярджальна, яны развярнуліся і з'ехалі за межы горада.

Потым хадзілі чуткі, быццам бы камандаванне надыходзячай на Вільню групоўкі Чырвонай Арміі прапанавала мясцовым уладам, каб пазбегнуць марнага кровапраліцця, затрымаць наступ на горад да 19-га, каб прадстаўнікі ўладаў ды іншыя антысавецкія элементы маглі спакойна пакінуць горад і межы Польшчы, якой у той час належала Вільня (што і назіралі мы з маці, стоячы ў чарзе). У любым выпадку, аперацыя па заняцці Вільні Чырвонай Арміяй пачалася адразу ж пасля 12 гадзін начы, гэта значыць ужо 19-га, а да гэтага ў горадзе было ўсё спакойна…

## Віленскія метамарфозы

Нягледзячы на ваенны час, яшчэ 18 верасня 1939 года знешне віленцы выглядалі як заўсёды. У цэнтры горада пераважала публіка панскага тыпу, г.зн. мужчыны былі апранутыя ў добрыя гарнітуры і плашчы, многія — у капялюшах; моладзь — у асноўным у гімназічнай форменнай вопратцы; жанчыны — у добрых сукенках, плашчах, паліто, як правіла, у капялюшыках. Працоўнага люду ў цэнтры было мала, але ён адразу ж вылучаўся сярод агульнай масы таннай вопраткай, мужчыны — у кепках, жанчыны — у хустках.

Насельніцтва горада фактычна не ведала яшчэ аб уваходзе на тэрыторыю Польшчы Чырвонай Арміі. Радыёпрымачы былі рэдкасцю, а ад афіцыйных кругоў гэтыя паведамленні не паступалі. Ды «ўладу трымаючыя» ўсё выдатна ведалі, таму ў большасці сваёй масава накіраваліся да летувіскай мяжы. Туды ж падаліся большасць афіцэраў, а таксама паліцыянтаў і высокіх службоўцаў. Застаўшыся без камандавання, салдаты Віленскага гарнізона «растварыліся» ў агульнай масе насельніцтва.

Але для польскай гісторыі патрэбныя былі факты «гераічнай абароны Вільні ад бальшавіцкіх захопнікаў». У старэйшых класах гімназій праводзілася ваенная падрыхтоўка юнакоў па так званым курсе «przysposobienia wojskowego». «Бацькі горада», уцякаючы, далі загад некалькім афіцэрам арганізаваць абарону Вільні сіламі навучэнцаў. Па гэтым «патрыятычным» закліку да начы з 18 на 19 верасня сабралі некалькі соцень 16-17 гадовых падлеткаў, якім раздалі сякія-такія пісталеты, стрэльбы, гранаты, але галоўнай зброяй лічыліся бутэлькі з «палымянай сумессю» супраць танкаў. Сярод «абаронцаў» былі і вучні выпускных класаў гімназій, і студэнты. Але яны хутка сцямілі, што іх проста «падставілі», г.зн. пасылаюць «на ўбой», — і большасць разышлася па хатах.

Тых, хто застаўся, афіцэры размеркавалі групамі па розных пунктах горада, у асноўным па могілках, садах, на гары Бельмонт.

Як толькі пачаўся наступ Чырвонай Арміі, тыя групы пачалі страляць. У некалькіх месцах ім удалося падпаліць пару танкаў. Натуральна, у адказ на страляніну хлапчукоў быў адкрыты агонь усёй моцы надыходзячых воінскіх частак: артылерыйскі, кулямётны. Усе агмені супраціву адразу былі знішчаны. Што сталася з «гора-абаронцамі» Вільні, толкам не ведаю. Хутчэй за ўсё, большасць разбеглася па хатах: была ноч, навучэнцы не былі апранутыя ў ваенную форму. Але многія і загінулі…

Мой 15-гадовы брат раніцай 19 верасня пайшоў да гары Бельмонт паглядзець вынікі баёў. Ад людзей чулі, што там стаіць папалены савецкі танк. Брат убачыў, што «баявая машына» яшчэ дыміцца. Жахлівым быў выгляд вуліцы. На адхонах для сцёку вады ляжалі трупы няшчасных падлеткаў, якіх палітыкі ўцягнулі «ў дарослыя гульні».

Некалькі чырвонаармейцаў стаялі на варце, а вакол сабраўся натоўп жанчын, якія галасілі і спрабавалі адшукаць сваіх дзяцей. Каго знайшлі — патруль дазваляў забраць...

Працяг на стар. 14 (22) ▸

ГІСТОРЫЯ

# ВІЛЕНСКІЯ МЕТАМАРФОЗЫ

Працяг.
Пачатак на стар. 13 (21).

Так фактычна завяршылася «гераічная» абарона Вільні ад бальшавікоў у 1939 годзе. Тым не менш, пазней у польскім друку, у радыё- і тэлеперадачах зрэдку з'яўляліся паведамленні аб гераічнай абароне Вільні сапраўднымі патрыётамі, многія з якіх аддалі жыццё за свабоду Радзімы і тым самым заслужылі навекі ўдзячную памяць будучых пакаленняў Польшчы…

Наступіў новы дзень — 19 верасня. Каля апоўдня бацька ўзяў мяне на шпацыр у горад, каб даведацца, што адбываецца ў цэнтры. Яшчэ не даходзячы да Вострай Брамы, мы былі здзіўленыя ўбачаным. Публіка на вуліцах горада як быццам па ўзмаху чароўнай палачкі цалкам змянілася. Па вуліцах ішлі людзі ў нейкіх латраных куртках, у пацёртых старых ботах, кепках, хоць відаць было, што гэта — былыя гаспадары. Ніводнай жанчыны не было ў капялюшыку, усе — у хустах ці берэтах. Значна больш у цэнтры было і працоўнага люду. Змянілася і хада. Раней публіка панскага тыпу хадзіла не спяшаючыся, прыстойна, з відавочным пачуццём уласнай годнасці. Цяпер жа большасць людзей імкнуліся прайсці незаўважанымі, хуткім крокам, аглядаючыся па баках.

Каля Вострай Брамы мы ўпершыню ўбачылі патрулі народнай міліцыі — прадстаўнікоў гарадской беднаты і пралетарыяту з чырвонымі павязкамі на рукавах і са стрэльбамі. Шмат дзе стаялі «эмкі» савецкіх камісараў. Каля машын збіраліся групкі людзей — распытвалі пра савецкія парадкі. У адказ ім ажыўлена распавядалі аб хуткім хараство новага жыцця.

У цэнтры горада, каля Ратушнага пляца, вялізны натоўп людзей вітаў часткі Чырвонай Арміі. Калі мы падышлі бліжэй, кінулася ў вочы пераважная большасць тут габрэяў. Маладзіцы падносілі салдатам і афіцэрам кветкі, абдымалі і цалавалі іх.

То тут, то там утвараліся імправізаваныя мітынгі, выступалі прамоўцы: віталі Чырвоную Армію. Натоўп хутка павялічваўся і неўзабаве запоўніў увесь пляц і вялікую вуліцу. А па ўсіх асноўных артэрыях горада бесперапынны струменямі ішлі часткі Чырвонай Арміі: танкі, артылерыя, конніца, пяхота.

Патрулі народнай міліцыі затрымлівалі на вуліцы падазроных «рабацяг» з панскімі фізіяноміямі або з ваеннай выправай. Некаторых забіралі і кудысьці адводзілі, іншых — адпускалі. Шукалі ў асноўным пераапранутых афіцэраў і паліцыянтаў.

За адну ноч Вільня быццам перарадзілася. Змянілася ўлада, амаль цалкам змяніўся і твар горада…

## Загадкі сарака дзён беларускай Вільні

У большасці публікацый пра майго бацьку Мікалая Пятровіча Анцукевіча гаворыцца, што ён быў дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі з канца верасня да пачатку лістапада 1939 года. Але ў некаторых крыніцах кіраўніком у той перыяд называецца Барыс Кіт. Дзе ж праўда?

Разабрацца ў гэтым дапамаглі знойдзеныя ў архіве майго бацькі дакументы, якія пацвярджаюць праваты абодвух сцверджанняў.



На вуліцы Вільні ў верасні 1939 года



Летувіскае войска ў Вільні. Кастрычнік 1939 года



Савецкі агітацыйны плакат 1939 года

Пасля гучнага скандалу 1936 года, калі ў беларускай гімназіі раскрылі ячэйку Кампартыі, быў арыштаваны дырэктар навучальнай установы Радаслаў Астроўскі (праз некалькі месяцаў стаў настаўнікам гімназіі ў горадзе Лодзь). Упраўленне адукацыі прапанавала пост кіраўніка Мікалаю Анцукевічу. Польскія ўлады значна актывізавалі дзейнасць у кірунку поўнай паланізацыі нацыянальных меншасцяў. Асабліва заўзята за гэтую справу ўзяўся Віленскі ваявода Бецяньскі. У пачатку 1938/1939 навучальнага года ён выклікаў майго бацьку і прапанаваў яму арганізаваць збор подпісаў бацькоў навучэнцаў беларускай гімназіі пад хадайніцтвам перавесці ўвесь навучальны працэс выключна на польскую мову. Мікалай Пятровіч катэгарычна адмовіўся гэта зрабіць. Ён неадкладна быў звольнены з пасады дырэктара і накіраваны на працу ўглыб Польшчы, у горад Ломжа пад Варшавай (выкладчыкам лаціны ў мясцовых гімназіях — мужчынскай і жаночай). Дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі быў прызначаны У. Кавалевіч, які адразу ж выканаў усе патрабаванні польскіх уладаў.

19 верасня 1939 года ў Вільню ўступіла Чырвоная Армія. На 40 дзён горад стаў сталіцай Заходняй Беларусі. Натуральна, папярэдняга дырэктара беларускай гімназіі вызвалілі ад пасады, а кіраўніком быў прызначаны Барыс Кіт, які яшчэ пры маім бацьку выконваў абавязкі намесніка дырэктара. Малады таленавіты матэматык пасля стаў сусветнавядомым навукоўцам-астрафізікам.

40 дзён беларускай Вільні адзначыліся небывалым уздымам нацыянальнага адраджэння ва ўсіх сферах дзейнасці. Асабліва гэта выявілася ў адукацыі. З усёй Заходняй Беларусі ў Вільню пацякла маса дзяцей, жадаючых вучыцца, у асноўным — юныя прадстаўнікі сельскай беднаты, якой у польскі час платная сярэдняя адукацыя была недаступнай па фінансавых прычынах.

**За адну ноч Вільня быццам перарадзілася. Змянілася ўлада, амаль цалкам змяніўся і твар горада…**

У апошнія дні верасня 1939 года ў Віленскую беларускую гімназію прыехала некалькі тысяч такіх дзяцей, прычым большасць іх была пераросткамі. У гімназіі змушаны былі арганізаваць многа — да 10-ці — паралельных класаў.

Натуральна, у такіх умовах Віленская беларуская гімназія не магла задаволіць усіх жадаючых. Было прынята рашэнне аб адкрыцці ў Вільні Другой беларускай гімназіі. Па хадайніцтве беларускай грамадскасці было даручана арганізаваць яе М. Анцукевічу, адразу ж прызначанаму дырэктарам. Другая Віленская беларуская гімназія размясцілася ў памяшканні былой польскай гімназіі імя Адама Міцкевіча на Дамініканскай вуліцы.

Наплыў навучэнцаў і ў гэтую гімназію таксама быў велізным. Кожны дзень прыбывала ўсё новая і новая моладзь. Трэба было дзесьці размяшчаць гэтых юнакоў і маладзіц. Усе школьныя інтэрнаты былі перапоўненыя. Бацька цэлымі днямі быў заняты размяшчэннем маладых людзей, якія прагнулі ведаў, і арганізацыяй навучальнага працэсу. Трэба было набіраць калектыў настаўнікаў, даставаць школьны інвентар, вырашаць іншыя шматлікія пытанні. Пацверджаннем гэтаму з'яўляюцца копіі дакументаў, якія захаваліся ў майго бацькі:

1. Загад «камісара Культуры і Народнай Асветы тав. Клімава» па арганізацыі навучальнага працэсу ў Другой Віленскай беларускай гімназіі, перададзены Франуком Грышкевічам. Член Кампартыі, пры Савецкай уладзе ён адразу ж заняў высокі пост у Камісарыяце (дзіўна, але быў і апошнім дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі ў гады акупацыі — 1942-1944);

2. Прашэнне дырэктара Другой Віленскай беларускай гімназіі аб аказанні матэрыяльнай дапамогі новай гімназіі і каштарыс неабходных выдаткаў. Мяркуючы па датах, другая Віленская беларуская гімназія была арганізавана ў канцы верасня 1939 года, бо ў пачатку кастрычніка яна ўжо функцыянавала.

28 кастрычніка 1939 года Савецкім Саюзам Вільня была перададзена Летуве. Амаль усе навучэнцы Другой Віленскай беларускай гімназіі і вялікая частка Першай Віленскай беларускай гімназіі тэрмінова з'ехалі дамоў. З сыходам Савецкай улады вялікая частка калектыва Першай Віленскай беларускай гімназіі на чале з яе дырэктарам Б. Кітом пераехала ў Наваградак — у Беларусь. З астаткаў абедзвюх гімназій летувіскімі ўладамі была створана Віленская беларуская трохкласная прагімназія. Дырэктарам яе ў гэты пераходны перыяд да сярэдзіны лістапада 1939 года застаўся мой бацька. Затым улады прызначылі кіраўніком вядомага беларускага палітычнага дзеяча ксяндза Адама Станкевіча.

У ліпені 1940 года ў Летуве была ўсталявана Савецкая ўлада. Мой бацька ізноў узначаліў беларускую ўстанову адукацыі. Мікалай Пятровіч Анцукевіч заставаўся на пасадзе дырэктара Віленскай беларускай прагімназіі да яе ліквідацыі ў сувязі з пачаткам вайны 22 чэрвеня 1941 года і заняццем Вільні нямецкімі войскамі.»

Запісала Таццяна Канапацкая

▸ АГЛЯД

# «ДАВАЙ ЖА ТРЫМАЦЦА ШЧЫЛЬНЕЙ...»: «ДЗЕЯСЛОЎ-53»

ЛеГАЛ




**Новы нумар пачынаецца з паэзіі. Сяргей Законнікаў публікуе цыкл вершаў у ключы нацыянальнай класічнай традыцыі. Творы сучасныя па змесце, але, як на маё меркаванне, часам паўторныя па форме і сутнасці. Хоць прысвечаны У. Някляеву верш «Лямпа» ўжо на пачатку вылучаецца нечаканым (магчыма, і для самога аўтара) падвойным сэнсам і арыгінальнасцю:**

*У коле сябрукоў даволі вузкім*
*Ёсць у мяне таварышка адна.*
*Вытрымлівае творчую нагрузку*
*Не меншую, чым я, за ноч яна.*

Лямпа, вядома. І ў той жа час нельга не пранікнуцца і зябка сцепануцца, чытаючы наступныя (хоць бы не прарочыя!) радкі паэта:

*На сіверы, мудры мой друža,*
*Давай жа трымацца шчыльней...*
*Сціскае шалёная сцюжа,*
*А будзе яшчэ халадней.*

Цяпер — да прозы. Пачынаючы чытаць твор Ігара Бабкова «Партрэт мастака, нябачны ў сутонні», названы ім «раманам-павутой», важна пераадолець раздражненне ад першай яго часткі, якая зацягвае чытача ў каваманную адстароненасць. Тут можна спасылацца і на аўтарскую дэпрэсіўную агляднку на Лао Цзы і на сонную стылістыку Джэймса Джойса. Адным словам, уводная частка твора (намінальна, бо гэты раман няўвднай ніткаю звязаны з папярэднім раманам аўтара «Адам Клакоцкі і ягоныя цені») малаэнергетычная, асцярожна-азнаямляльная (чытачоў — з героямі, аўтара — з чытачом). Усе гэтыя сустрэчы ў кавярні «Хвілінка» містычна асацыіруюцца з вечнасцю. «Некаторыя думалі, што так пераклалі французскарасейскае бістро, іншым чуліся метафізічныя ноткі. Хвілінка, казалі яны, — гэта само чалавечае жыццё, у якое мы патрапляем зусім не велічна, без фанфараў. З няяснымі мэтамі. І дзе кожны спрабуе знайсці штосьці сваё». Твор па сутнасці бессюжэтны, бо ўся яго дзея адбываецца не звонку, а ўнутры чалавечага жыцця. «Гэта была б гісторыя пакалення, што патрапіла ў расколіну між эпохамі.» Пачынаючы з другой часткі чытанне натуральна захапіла мяне, і я ўжо не мог адарвацца да канца твора. Гэта нейкім чынам інтэлектуальная проза, але яе чытанне не вымагае празмернага разумовага напружання, паколькі аўтар абсалютна шчыры і сумленны ў дачыненні са сваімі героямі і чытачом. Складаныя рэчы ён спрабуе тлумачыць, але не наўпрост, а праз іншыя больш даходлівыя рэчы (як у выпадку з баладай Баляслава Лесмяна «Дзяўчына»). Твор выбітны і варты шырокай чытацкай і крытычнай увагі...

Пасля выбітной метафорыкі Ігара Бабова вершы Ірыны Хадарэнкі падаюцца занадта нацыянальна заклапочанымі, іх падрэслен ая ідэйная і палітычная скіраванасць збівае з тропу саму паэтку на шляху да яе светласці Паэзіі. Хоць, вядома, ёсць, і адметныя радкі і строфы...

Як заўжды цікавы і элегантны ў сваіх тэкстах Леанід Дранько-Майсюк. Яго эсэ «У Вільні і больш нідзе» чытэльнае і яснае па стылі і змесце. Неардынарна для нашых гісторыкаў і літаратуразнаўцаў выкладзены аўтарам архіўныя знаходкі пра віленскія грамадоўцаў першай паловы мінулага стагоддзя. Уражваюць іх фінансавыя махінацыі і пературбацыі. Адным словам, купюры мяняюцца, а людзі не надта... Але найбольш уразілі суб'ектыўныя развагі аўтара пра літаратуру і сябе самога ўвогуле.

Паэт з Клеччыны Ігар Кановіч знаходзіцца ў працэсе творчага пошуку і ўнутранага самаўдасканалення. Ці не таму ў гэтай яго публікацыі залішне слоўнага і метафарычнага друзу, які з часам, спадзяюся, прыбярэцца. Аснова ж паэтычная ёсць, і падмурак выкладзены на цвёрдым грунце ўжо запачаткаванага ўласнага жыццёвага вопыту (малады аўтар працуе настаўнікам у вясковай школе).

Навелы Алеся Гізуна пад агульным назовам «Трэцяя рука мастака Рунеевіча» вызначаюцца цёплай і часам ужо падзабытай намі беларускай моваю... Праўда, сама проза аўтара яшчэ не набыла пэўных формаў і не напоўнілася нажытым сюжэтам. Аднак ёсць неаспрэчная здольнасць да творчасці, а не проста пісання. Гэта радуе. Прадчуваю, удачы ў яго яшчэ будуць.

Нізка вершаў Віктара Жыбуля «Мая каляровая рэвалюцыя», на першае чытанне, — неардынарнае версіфікатарства абсурднага і непапраўнага беларускага іраніста. Але відны рубцы вымерана-скроеных і надзейна сшытых вершаў і няма адчування шчырых чалавечых эмоцый, пераживанняў, болю, зрэшты, як і натуральных узрушэнняў і радасці... Занадта ўсё падаецца гульнявым, штучным, выштукаваным хутчэй дзеля слухача, чым для чытача. Можна асобна вылучыць верш «Куча», пра смецце з крупінкамі золата ды варты ўвагі верлібр. Урэшце, не буду з сябе корчыць гэткага літаратурнага цнатліўца, бо навідавоку і тое, што паэт і не разлічваў на класічную ўвагу і патэнтацыю гэтых сваіх тэкстаў. Яны найперш пісаліся з арыентацыяй на пэўную (успрымальную) аўдыторыю. Да ўсяго ж, выдатная мова, змястоўны і дарэчны нашаму часу гумар адназначна выратоўваюць вершы В. Жыбуля ад майго паскуднага іх гнаблення. Часам і да такіх аўтараў нам трэба ўважліва прыслухоўвацца, каб зразумець іх намёкі і падвойны змест...

На жаль, гэтым разам нічым асаблівым, апроч як патугай на арыгінасць, не ўразіла публікацыя Людмілы Рублеўскай. Спроба напісання постсавецкай народнай энцыклапедыі з пэўных слоў і тэрмінаў «Бестыярый майго савецкага дзяцінства» мала падыходзіць да вызначэння «мастацкая проза». Гэта маё расчараванне нумара, зважаючы на заўважны талент ужо добра вядомай пісьменніцы і паэткі. Сваё рэнамэ не варта разменьваць на часовыя дробязі. А магчыма, я вельмі перабіраю ў сваіх патрабаваннях, і такая публікацыя мела б своеасаблівы поспех, скажам, у чытацкай аўдыторыі часопіса «Бярозка».

Па-свойму адметная падборка вершаў Ірыны Бельскай. І ўсё ж, мне падаецца, што ў сваёй пераважнай большасці яе творы занадта паднебныя і туманна-загадкавыя, каб быць дарэшты зразумелымі не адарванымі ад зямлі чытачамі. Адчуванне такой небяспекі паэтам трэба ў сабе выпрацоўваць, каб не пераходзіць за межы «няўлоўнасці гукавой хвалі». Аднак трэба сказаць, што ёсць і ў гэтых вершах свая патаемная магія, гэткі прыцягальны аддалены звон...

Аповед Кірыла Стаселькі «Вечныя дзеці» — гэта не літаратура, а хутчэй каляна вуковы артыкул па дашкольнай псіхалогіі. Творчасць тут яшчэ толькі прачынаецца — дзіця-дзіцём...

Што да вершаў Ганны Грыдзюшкі, то яны мне падаліся нейкімі няскончанымі, недапісанымі, але адназначна, што яны пачатыя, у іх ужо ёсць (закладзена) душа і розум, пры гэтым адчуваецца патэнцыяльная неардынарнасць аўтара.

Найбольш мяне парадавалі пераклады. Асабліва Дзмітрый Серабракоў, які пераствараў на родную мову вядомы, але доўга «забаронны плод» Графа дэ Лотрэамона «Песні Мальдарора». Твор з разраду выбітных і «выклятых». Напісаны ўругвайскім маладзёнам (сынам дыпламата), якога бацька накіраваў на вучобу ў Еўропу. Сапраўднае прозвішча Ісідор Дзюкас. Гэтыя песні — труднае чытанне для ўдумных і мужных, але не для надта гідлівых... Зло і дабро спрадвечнага свету, нязменнасць іх сутнасці, гэтак жа як плоць (цела) і дух (душа) не могуць знайсці агульнае паразуменне і гармонію. Адсюль такія звыродлівыя формы зямнога чалавечага існавання. Аўтар наўпрост кажа магчымаму чытачу: «хай не пакрыўдзіцца чытач, калі мая проза не мае шчасця яму падабацца. Ты думаеш, што я і маю ідэі — гэта адно і тое ж. Гэта, шаноўны чытач, безумоўна, праўда, але праўда частковая».

Сам пераклад выкананы проста адмыслова (кажу гэта, сыходзячы не з арыгінала, а з яго беларускамоўнага аналага).

Бадай, адзіная паэтычная публікацыя ў гэтым нумары, ад якой я атрымаў тое, на што і спадзяваўся — хвіліны поўнага душэўнага захаплення — гэта паэма (? — жанр не пазначаны) Іллі Камінскага «На танцах у Адэсе» ў перакладзе Вальжыны Морт. Сам аўтар пазначаны як амерыканскі паэт 1977 года нараджэння, які ў 1993 годзе эміграваў з Адэсы ў ЗША. Ды гэта не так і важна. Важна, што аўтар (паэт) і паэтка (перакладчыца) засведчылі свой талент загадкава, але без зваротных пытанняў... Тонкая плеўка павуты паміж сэнсам зямнога існавання і вычуваннем чалавечага жыцця засталася непарушанай... Таму з'яўленне твора можна патлумачыць хіба што толькі «незаганным мастацкім зачацем»... Ды і пацвярджэнне таго амаль неаспрэчнае:

*паэзія — гэта я сам. Я супраць сябе.*

І ці не менавіта з гэтай прычыны

*Яму застаецца голас*
*што рашчапляе сутнасць...*

На тым мастацкія творы саступаюць месца іншым літаратурным публікацыям. Сяргей Шапран заканчвае сваё кінадраматургічнае даследаванне творчасці Васіля Быкава. Даволі цікавымі выяўляюцца погляды самога народнага пісьменніка ды іншых вядомых асоб на сцэнарыі фільмаў па яго творах «Пастка» і «Сотнікаў». З публікацыі стэнаграм паседжанняў прасочваецца ўжо тады (пачатак 1960-х — сярэдзіна 70-х) вельмі ж пільнае стаўленне розных дзяржорганаў да творчасці В. Быкава.

У выбраных старонках дзённіка Ніла Гілевіча «Трагічны дзевяноста шосты» шмат нечаканых характарыстык вядомых людзей беларускай культуры і літаратуры, суб'ектыўных, вядома, што пэўным чынам характарызуе і самога Ніла Сымонавіча.

Эсэ Алеся Кіркевіча «Вясна. Анталія. Вялікдзень» (філасофія турэмнага дворыку) надае выданню пульсацыю і дыханне сённяшніх беларускіх дзён. Вось толькі б найхутчэй уваскрэсла і нарэшце спраўдзілася ў беларускай рэчаіснасці наша нацыянальная ідэя.

З імпэтам і жывой цікавасцю прачыталася гутарка Зміцерка Вераса з вядомым паэтам (сёлетнім юбілярам) Генадзем Бураўкіным. Думаю, у прыхільнікаў яго паэзіі надарыўся добры выпадак як мага бліжэй пазнаёміцца і з Бураўкіным-чалавекам. Што праўда, тэкст падаўся трохі задоўжаным.

Алесь Плотка коратка гутарыць з літаратарам Дзмітрыем Плаксам, які жыве ў Швецыі, пра мастацкія пошукі аўтара, якія інтрыгуюць і прывабліваюць чытача.

Падаецца чарговая душэўная гутарка, зробленая Кацярынай Безмацерных з сям'ёй мастакоў Алены Шлегель і Уладзіміра Ганчарука. Незацягнута, шчыра, проста і ў той жа час глыбока. Вось адказ Алены на пытанне: «Што такое існа?»: «Паверхневыя падзеі, якія мы бачым, і нашыя меркаванні аб іх яшчэ не існа. Я думаю, ёсць нейкі вышэйшы парадак рэчаў, недзе там усё выбудоўваецца і мусіць быць так, а не інакш. Вось гэта, напэўна, блізка да існы. Але яна для нас закрытая, бо слабы чалавечы розум. Мы можам толькі інтуітыўна калі-некалі адчуваць яе. Уся надзея на ўнутраны духоўны зрок, з дапамогай якога можна прыадкрыць фіранкі над вялікімі таямніцамі».

Друкуецца заканчэнне літаратуразнаўчага артыкула крытыка Аляксея Рагулі «Сярод лесу, сярод поля — у цэнтры Еўропы» (пра эстэтыку і сацыялогію прозы Генрыха Далідовіча).

Следам — цёплы водгук Марыны Весялухі на новую кніжку маладога пісьменніка Сяргея Календы «Іржавы пакой з белымі шпалерамі».

У чарговы раз крытычна выставіўся і аўтар гэтага агляду са сваімі няпэўнымі і палемічнымі «тэзісамі да ненапісанай рэцэнзіі» на зборнік вершаў Віталя Рыжкова «Дзверы, замкнёныя на ключы». Аднак на думку аўтара опуса, суб'ектыўнасць яго погляду на творчасць таленавітага паэта дае падставу для больш шырокага розгаласу пра яго дэбютную кніжку — як пра неардынарную з'яву ў сучаснай беларускай літаратуры ўвогуле.

На сканчэнні — шчыры сяброўскі ўспамін-рэквіем Алеся Бакача пра свайго адышоўшага таварыша па пяры Яна Збажыну. Не заўжды мы, на жаль, уважныя да выбітных людзей пры іх жыцці. Занадта запознена да нас прыходзіць разуменне, што хоць з імі і няпроста, але без іх — яшчэ горш... Як напісаў у сваім афарызме гэты баранавіцкі паэт і пісьменнік (шмат у чым, па словах А. Бакача, падобны да вобраза Гервасія Вылівахі з «Ладдзі роспачы» Уладзіміра Караткевіча): «Мы ўсе родам з вар'яцкага дому, дзе размовы хворых тояць філасафічную глыбіню, а паводзіны лекараў нагадваюць тыранію». Шкада, яшчэ адзін беларус не здолеў спраўдзіць дадзены яму Богам талент.

Канчаткова ж закругляе публікацыі чарговага нумара анатацыйная рубрыка «Дзеяпіс» пра новыя найбольш адметныя выданні недзяржаўных выдавецтваў нашай краіны.

Чытайце ды маракуйце, бо, не зважаючы на суб'ектыўную крытычнасць гэтага майго агляду, дзякаваць Богу, у часопісе ёсць што пачытаць і над чым задумацца.

БІБЛІЯТЭКА

# «НАША ЎСЁ»

**Чвэрць брытанцаў чытаюць кнігі «напаказ», а 20-гадовыя расійцы лічаць любімым пісьменнікам Пушкіна…**

Газета «Daily Mail» друкуе вынікі даследавання, паводле якога сярэдні брытанец мае ў сваёй хатняй бібліятэцы каля 80 кніг, якія ніколі не чытаў, але змяшчае іх у кніжную шафу, каб падацца больш разумным. Апытанне Клуба віна і кніг Lindeman выявіла: чацвёра з дзесяці брытанцаў трымаюць сваю хатнюю бібліятэку толькі напаказ. І 57 адсоткаў апытаных аддаюць перавагу класіцы на кніжных паліцах.

Кніга, пра якую жыхары Туманнага Альбіёна найбольш хлусяць, што чыталі, — раман «Пыха і перадузятасць» Джэйн Остэн. За ёй ідуць «Валадар пярсцёнкаў» Дж. Р.Р. Толкіна, «Джэйн Эйр» Шарлоты Бронтэ і «Гары Потэр» Дж. Роўлінг.

Каля 23 адсоткаў брытанцаў з'яўляюцца ў грамадскіх месцах менавіта з «правільнай» кнігай. І зноў у лідэрах — «Пыха і перадузятасць». А вось сярод тых папулярных «папсовых» аўтараў, чые кнігі 47 адсоткаў брытанцаў ні ў якім разе не паказалі б публіцы, — аўтаркі «жаночых» раманаў Сафі Кінсэла, Джэкі Колінс, Хэлен Філдзінг, Даніэла Стыл і іншыя. Эксперт выдання лічыць, што ва ўсім вінаваты сацыяльны этыкет, які ёсць неад'емнай часткай «брытанскасці».

У Расіі ж 40 % дарослага насельніцтва летась наогул не прачытала ніводнай кнігі. Занепакоенасць гэтым фактам нядаўна выказаў прэм'ер-міністр гэтай краіны Уладзімір Пуцін.

Даследніцкі цэнтр расійскага партала Superjob.ru высветліў, каго чытаюць і лічаць любімым пісьменнікам астатнія 60 % расійцаў у розных узроставых катэгорыях.

Як паказалі вынікі даследвання, расійскія чытачы аддаюць перавагу расійскай класіцы, прынамсі яны самі кажуць пра гэта. Так, ва ўзроставай катэгорыі 18-20 гадоў самым чытаным аўтарам (18%) апынуўся… Аляксандр Пушкін. За ім ідзе Фёдар Даставскі (14 %), на трэцім месцы — Міхаіл Булгакаў. Практычна аднолькавую колькасць галасоў (5-6%) набралі Мікалай Гогаль, Леў Талстой, Антон Чэхаў, Міхаіл Лермантаў.

Моладзь ад 20 да 29 гадоў сваім самым любімым пісьменнікам называе Дастаеўскага (16 %), 15 % любові расійцаў набраў аўтар «Майстра і Маргарыты», тройку лідэраў замыкае Аляксандр Пушкін (13 %). Чэхаў і Талстой прыцягваюць 5 % чытацкай аўдыторыі. Адзін з прыхільнікаў пракаментаваў свой выбар наступным чынам: «Некалькі томікаў Л.М.Талстога чытаюцца на адным дыханні, яшчэ і гумар спецыфічны».

У пакалення 30-39 гадовых расійцаў у лідэры зноў выходзіць Аляксандр Пушкін, 13 % рэспандэнтаў называюць яго любімым пісьменнікам. Адзін з апытаных у гэтай катэгорыі тлумачыць: «Чаму Пушкін? Таму што ён — наша ўсё!». Наступным ідзе Міхаіл Булгакаў — 12 %, трэцім — Фёдар Дастаеўскі (10 %). За імі — Талстой (8%), Чэхаў (7 %), Гогаль (4 %). Па 3 % чытацкай любові атрымалі Акунін, Пікуль і Лермантаў.

Пакаленне 40-гадовых абірае Чэхава і Булгакава (па 11 %). Другое месца дзеляць аўтары «Залатой рыбкі» і «Вайны і міру» (па 9 %). За імі ўслед — Дастаеўскі (8 %), Гогаль (5 %), а таксама Пікуль, Бунін і Купрын (па 3 %).

Рэспандэнты ва ўзросце старэй за 50 гадоў найбольш любяць Антона Чэхава (13 %), Льва Талстога (11 %) і Аляксандра Пушкіна (10 %). Каментары гэтай групы чытачоў: «Талстой Леў Мікалаевіч. Буйна, маштабна, ёміста..», «Аляксандр Сяргеевіч Пушкін — на дзіва сучасны!». Наступную пазіцыю займаюць Булгакаў і Дастаеўскі (па 7 %), Гогаль і Бунін (па 4 %.). Прыкладам, каментар аднаго з чытачоў : «Гогаль. Чычыкавых дагэтуль паўкраіны».

Але калі паглядзіш на досвед суседзяў блізкіх і не дужа, хочацца і ў сваіх чытачоў запытацца: «Як часта яны прыкідваюцца, што чытаюць кнігі?». І каго з любімых беларускіх аўтараў назавуць дваццацігадовыя? Купалу, Коласа ці, можа быць, Мележа?..

**Юля Цімафеева**

ЗНАХОДКІ

# НЕВЯДОМЫ РАМАН АРТУРА КОНАН ДОЙЛА

**Першы раман брытанскага пісьменніка сэра Артура Конана Дойла «Аповед Джона Сміта» (The Narrative of John Smith), які раней не друкаваўся, апублікавала Брытанская бібліятэка.**






Рукапіс напісанага 130 гадоў назад яшчэ да знакамітых апавесцяў і апавяданняў пра следчага Шэрлака Холмса «Аповеда Джона Сміта» захоўваўся менавіта ў яе фондах. Кошт 144-старонкавай кнігі ў цвёрдай вокладцы, даступнай у анлайн-краме Брытанскай бібліятэкі, складае 9,95 фунтаў стэрлінгаў (прыкладна 15,3 даляра ЗША).

Аповед у кнізе вядзецца ад імя 50-гадовага «абывацеля з уласнай думкай», які прыкаваны да стула падаграй і выкладае свае меркаванні ды погляды аб усім — ад рэлігіі і літаратуры да вайны — праз дыялогі са сваімі гасцямі і наведвальнікамі.

Як адзначала раней куратар аддзела сучасных рукапісаў Брытанскай бібліятэкі Рэйчэл Фос, раман быў напісаны ў 1883-1884 гадах, аднак рукапіс згубіўся на пошце па шляху да выдаўца. Пісьменніку давялося аднаўляць яго па памяці. Рукапіс, што трапіў у распараджэнне бібліятэкі, абрываецца на шостым раздзеле…

Знакаміты пісьменнік сэр Артур Конан Дойл (Sir Arthur Conan Doyle) нарадзіўся 22 траўня 1859 года ў сталіцы Шатландыі Эдзінбурзе. З 1876-га па 1881 год ён вывучаў медыцыну ў Эдзінбургскім універсітэце. Падчас вучобы пачаў пісаць кароткія аповеды, першы з якіх быў апублікаваны, калі Дойлу было 20 гадоў.

Скончыўшы вучобу, будучы пісьменнік пачаў прыватную медыцынскую практыку, аднак не закінуў літаратурную творчасць. Менавіта ў перапынках паміж прыёмам пацыентаў Артур Конан Дойл і напісаў свой першы раман — «Аповед Джона Сміта».

Сусветную вядомасць А. К. Дойлу прынеслі, як вядома, дэтэктыўныя раманы пра Шэрлака Холмса. Першы аповед з серыі — «Скандал у Багеміі» — быў надрукаваны ў 1891 годзе.

Літаратура была для Дойла не толькі захапленнем, але і добрай крыніцай прыбытку. Але разам з галоўнай справай яго жыцця заставалася і навуковая дзейнасць.

З часам слава Холмса пачала злаваць яго стваральніка. У многіх чытачоў Артур Конан Дойл стаў асацыявацца з яго героем-дэтэктывам. Усе іншыя кнігі аўтара, нават больш значныя і часам цікавейшыя, не прыцягвалі ўвагу публікі.

Вярнуўшыся ў Лондан пасля адпачынку ля Рэйхенбахскага вадаспаду, пісьменнік вырашыў «забіць» свайго героя. І неўзабаве ў часопісе «The Strand» з'явілася навэла, у фінале якой Холмс гіне ў сутычцы з аўтарытэтам лонданскага злачыннага свету прафесарам Марыярці, зваліўшыся ў прорву Рэйхенбахскага вадаспаду.

Пасля гэтай «навіны» дваццаць тысяч падпісчыкаў адмовіліся ад часопіса, які друкаваў прыгоды Шэрлака Холмса. Натоўпы з лозунгамі «Вярніце нам Холмса!» штодня збіраліся вакол офіса рэдакцыі. Дойлу сталі тэлефанаваць невядомыя з пагрозамі: калі Шэрлак Холмс не будзе ўваскрэшаны з мёртвых, яго бессардэчны стваральнік адправіцца за ім...

Аднак «апошняй кропляй» для аўтара стаў ліст брытанскай каралевы. Па непацверджаных чутках, яна напісала Конан Дойлу, што смерць Шэрлака Холмса — толькі хітры ход. У выніку пісьменніку давялося «ажывіць» персанажа...

Вяртанне Шэрлака Холмса адбылося ў красавіку 1894 года ў апавяданні «Пусты дом».

З тых часоў легендарны следчы стаў для брытанцаў не менш рэальным, чым яго стваральнік. За апошняе стагоддзе ён паспеў абзавесціся домам, помнікам, сталічным рэстаранам у яго гонар ды шматлікімі фан-клубамі… Холмса нават прынялі ў ганаровыя члены Каралеўскага таварыства хіміі.

…Конан Дойл вярнуўся да медыцынскай практыкі у 1900 годзе і ў якасці хірурга ваенна-палявога шпіталя адправіўся на англа-бурскую вайну.

Памёр ён 7 ліпеня 1930 года ад сардэчнага прыступу.

**Паводле www.rian.ru ды іншых сеціўных крыніцаў**

КОНКУРСЫ

# ДА 120–ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Віцебскае абласное аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў абвесціла літаратурны (твораў класічных формаў) конкурс для моладзі, прысвечаны 120-годдзю з дня народзінаў Максіма Багдановіча.**



Творы можна дасылаць на электронны адрас konkursbagdanovich@gmail.com да 1 снежня 2011 г.

Абвяшчэнне вынікаў адбудзецца 10–11 снежня ў Мінску.

# «ПРАЙДЗІСВЕТАЎ» «ПЕРАТВОР»

**Часопіс «ПрайдзіСвет» ды Ініцыятыўная група «Kate&Osia» абвяшчаюць конкурс перакладаў са славянскіх моў (балгарская, польская, расійская, сербская, славацкая, чарнагорская, чэшская, харвацкая, украінская) на беларускую.**

Для перакладу прапаноўваюцца апавяданні наступных аўтараў:
Елена Алексиева, Алек Попов (Балгарыя);
Jan Balaban, Hana Pachtova (Чэхія);
OljaSavicevicIvancevic (Харватыя),
DavidAlbahari (Сербія);
Таня Малярчук, Олег Шинкаренко (Украіна);
Jana Benova, Vaclav Pankovcin (Славакія);
NataszaGoerke, WojciechKuczok (Польшча);
Татьяна Замировская, Кирилл Дубовский (Беларусь, расійская мова).

**Умовы конкурса:**

Удзельнічаць могуць усе ахвотныя.

Тэксты, прапанаваныя для перакладу, можна спампаваць на электроннай старонцы часопіса «ПрайдзіСвет».

Кожны ўдзельнік можа выбіраць, з якой мовы, якога аўтара і якія апавяданні ён будзе перакладаць (моў, аўтараў і апавяданняў можа быць некалькі).

Апошні тэрмін для адпраўкі перакладаў — 4 снежня 2011 г. у 23 гадзіны 45 хвілін. Пераклады дасылайце на электронны адрас: rada@prajdzisvet.org, пазначыўшы ў тэме «Ператвор». У э-мэйле пазначце, калі ласка, сваё імя і прозвішча, горад/вёску, прафесію/навучальную ўстанову.

Паважанае і кампетэнтнае журы не будзе да абвяшчэння вынікаў ведаць удзельнікаў конкурса, бо кожны з удзельнікаў будзе зашыфраваны.

Пераможцаў чакае слава! А таксама публікацыі, прызы і павага ўдзячных чытачоў.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 4 ЛІСТАПАДА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія). Заключная серыя.
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**12.10** Камедыя «Зладзейка» (Расія).
**14.00** Відэафільм АТН «Чэрвеньская восень» цыклу «Зямля беларуская».
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм.
**16.05** Меладрама «Смяцяр» (Расія).
**17.55** Меладраматычны серыял «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Прэм'ера. Містычны трылер «Час ведзьмаў» (ЗША).
**23.55** Дзень спорту.
**00.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Легендарнае кіно ў колеры. «Цырк».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**23.25** «Наша Беларашa».
**00.00** Баявік «Падлоўчы».
**01.50** Начныя навіны.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Акулы ў Малібу». Аўстралія, 2009 г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Ашуканцы».
**11.40** «Прошаная вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: ток-шоў «Такі лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Блізняк». Францыя, 1984 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Расійскія покерные турніры» («Russian Poker Series»).
**00.20** Фільм «Адліга». ЗША - Канада, 2009 г.
**01.50** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.10** «Чаклун і Румба» («Беларусьфільм»).
**10.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.
**12.30** Кінаспробы.
**13.00** Час футболу.
**13.45** Гераіка-прыгодніцкі фільм «Карона Расійскай імперыі, ці Зноў няўлоўныя» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**16.10** Жаночая ліга.
**17.15** Медычныя таямніцы.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** Трагікамедыя «Звар'яцелая дапамога» (Расія).
**00.25** Канцэрт «Eurythmics. Peacetour».

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.20** Мультфільмы.
**07.55** Фільм «Старэйшы сын».
**10.20** «Люба, браткі! 200 гадоў пасля».
**12.00** Фільм «Жанчыны».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.15** «Уся Расія».
**14.30** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі».
**17.45** Навіны - Беларусь.
**17.55** Фільм «Афіцэры».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.35** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт А.Разэнбаума.
**22.55** Навіны - Беларусь.
**23.05** Фільм «Кандагар». 2010 г.

НТВ

**06.40** «Прафесія-рэпарцёр».
**07.10** «Разбор палётаў».
**08.00** Сёння.
**08.20** «І зноў добры дзень!».
**09.20** «Увага: вышук!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суда».
**12.10** «Суд прысяжных».
**13.10** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.05** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**19.00** Сёння.
**19.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.25** Прэм'ера. Фільм «Смерш. Легенда для здрадніка».
**00.00** Баявік «Снайпер».

EUROSPORT

**09.30** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Кароткі танец. Пекін (Кітай).
**10.45** Снукер. PTC (Players Tour Championship). Дзень 3-і.
**11.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**12.00** Live. Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. Дзень 1-ы.
**13.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Мужчыны. Кароткая праграма. Пекін (Кітай).
**14.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Жанчыны. Кароткая праграма. Пекін (Кітай).
**14.45** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Пары. Кароткая праграма. Пекін (Кітай).
**16.00** Live. Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. Дзень 1-ы.
**17.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Кароткі танец. Пекін (Кітай).
**18.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Мужчыны. Кароткая праграма. Пекін (Кітай).
**18.50** Конны спорт. Часопіс.
**19.20** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**19.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Канада.
**20.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Канада.
**21.30** Live. Бокс. Турнір Bigger's Better. Партугалія.
**23.45** Вось дык так!!!
**00.00** Покер. Каны (Францыя).
**01.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.15** Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. Дзень 1-ы.
**02.15** Вось дык так!!!

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** Басанож па свеце.
**08.00** «Малая Масква», серыял: 3 серыя.
**08.50** «Сонечная дзіда», серыял: 10 серыя.
**09.15** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.45** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**10.20** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**11.00** Басанож па свеце (спазнавальная праграма).
**11.25** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**12.10** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.40** «Сонечная дзіда», серыял: 10 серыя.
**13.05** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**13.30** «Малая Масква», серыял: 3 серыя.
**14.20** «Супраць забыцця. След дыктатараў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**15.50** Басанож па свеце.
**16.20** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**17.00** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 9 серыя.
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**18.50** Маю права.
**19.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Невядомая Беларусь: «Дзень памінання», дак. фільм, 2011 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** «Костка», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**23.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**23.25** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

## 5 ЛІСТАПАДА, СУБОТА

**06.25** Існасць.
**06.50** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Канцэрт.
**09.40** Каробка перадач.
**10.10** Культурныя людзі.
**10.50** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**12.10** Драма «Каліна чырвоная» (СССР).
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Сямейная камедыя «На цвярозую галаву» (ЗША).
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** «Славянскі базар-2011».
**21.00** Панарама.
**21.50** «Тармазны шлях». Адмысловы рэпартаж АНТ.
**22.00** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**23.15** Драма «Гульні розуму» (ЗША).
**01.40** Дзень спорту.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** Фільм «Пакроўскія вароты».
**14.15** «Хвіліна славы. Мары спраўджваюцца!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. « Тры волаты і Шамаханская царыца».
**17.35** Прэм'ера. «Адмысловае заданне».
**18.50** «Адзін супраць усіх».
**19.30** АНТ прадстаўляе: «Абмен жонкамі».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Балеро».
**22.35** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.15** Прэм'ера. Фільм «Генсбур. Каханне хулігана».

**07.00** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.30** «Анфас».
**07.45** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.35** «Чыстая праца».
**10.20** «Мінск і мінчане».
**10.50** Фільм «Блізняк». Францыя, 1984г.
**12.50** «Прыгоды дылетанта».
**13.25** Фільм «Раба кахання». СССР, 1975г.
**15.15** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Арол і рэшка». Расія, 1995г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Аднойчы ў Вегасе». ЗША, 2008г.
**22.05** «Зорны рынг».
**23.20** «Покер дуэль».
**00.10** Фільм «Вайна». Расія, 2002 г.
**02.15** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.20** Жансавет.
**08.00** Дача здароўя.
**08.45** Тэлебарометр.
**08.50** Гераіка-прыгодніцкі фільм «Карона Расійскай імперыі, ці Зноў няўлоўныя» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**11.20** Серыял «Маргоша» (Расія).
**15.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Прамая трансляцыя.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Містычная меладрама «Прадчуванне» (ЗША).
**23.05** Фантастычны баявік «Вавілон нашай эры» (ЗША- Францыя-Вялікабрытанія).

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Фільм «Кандагар». 2010 г.
**08.45** Прэм'ера. «Наш любімы Аркадзь Райкін».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Уся Расія».
**12.20** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу». Працяг.
**17.30** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Выратаваць мужа». 2011 г.
**23.55** «Дзяўчаты».

НТВ

**07.30** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Акадэмія прыгажосці».
**09.25** «Гатуем».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія дзеці».
**14.10** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**19.00** Сёння.
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**22.30** Прэм'ера. Фільм «Плябан-2».
**00.10** Фільм «Небяспечная сувязь».

EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Адвольны танец. Пекін (Кітай).
**11.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. Дзень 2-і.
**12.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Мужчыны. Адвольная праграма. Пекін (Кітай).
**13.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Жанчыны. Адвольная праграма. Пекін (Кітай).
**14.30** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Пары. Адвольная праграма. Пекін (Кітай).
**16.00** Live. Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. Дзень 2-і.
**17.00** Вось дык так!!!
**18.00** Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 48 кг. Парыж (Францыя).
**20.00** Live. Настольны тэніс. Кубак свету. Камандныя спаборніцтвы. Дортмунд (Германія).
**22.30** Live. Бокс. Чэмпіянат свету па версіі WBF.
**00.00** Цяжкая вагавая катэгорыя. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 56 кг. Парыж (Францыя).
**01.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Румынія.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**08.20** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 9 серыя.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.10** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**09.35** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.00** Маю права.
**10.20** Форум (ток-шоу): «Іншая Беларусь».
**11.10** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.35** МакраФон: «Троіца», фільм-канцэрт: ч. 2.
**12.05** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**12.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.40** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 9 серыя.
**13.05** Калыханка для самых маленькіх.
**13.35** МакраФон: «Троіца», фільм-канцэрт: ч. 2.
**14.05** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**14.30** «Костка», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**16.00** Маю права.
**16.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**16.30** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.00** «Каханне, здрада, жарсць», серыял, 2003 г., Аўстрыя: 3 серыя.
**17.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Чаму дэмакратыя? 7 серыя: «Жалезныя лэдзі Ліберыі».
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.30** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**19.35** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**20.30** Беларускія лёсы: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Наўцёкі», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**23.35** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**00.20** Аб'ектыў.

## 6 ЛІСТАПАДА, НЯДЗЕЛЯ

**07.15** «Беларусь адкрытая свету». Канцэрт.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Здароўе.
**10.15** Да цешчы на бліны.
**10.50** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**12.10** Баявік «Белае сонца пустэльні» (СССР).
**13.55** Прэм'ера. «Слуцкія паясы - знакі лесу». Дакументальны фільм.
**14.30** «Набіраючы вышыню». Відэастужка АТН.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Залатаючы восень Рагачова» цыклу «Зямля беларуская».
**15.45** Дакументальны цыкл «Дыскаверы» (ЗША).
**16.35** «Беларусь адкрытая свету». Канцэрт.
**18.05** Суперлато.
**18.55** Прэм'ера. Драма «Ваўкі» («Беларусьфільм»).
**21.00** Панарама тыдня.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
**22.30** XVIII Мінскі міжнародны кінафэст «Лістапад-2011». Адкрыццё.
**23.45** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**00.45** Псіхалагічны трылер «1408» (ЗША).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.45** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.45** Новы «Ералаш».
**13.15** Камедыя «Каўказская палонніца, ці Новыя прыгоды Шурыка».
**14.45** Прэм'ера. «Ігар Талькоў. Зрынуты ў баі».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.40** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Гонар нацыі».
**22.30** Драма «Рабства».
**00.40** Камедыя «Утаймаванне свавольных».

**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.05** «Аўтапанарама».
**09.35** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.30** «Вялікі сняданак».
**11.10** Фільм «Аднойчы ў Вегасе». ЗША, 2008 г.
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.35** Фільм «Гары, гары, мая зорка». СССР, 1969 г.
**15.35** Ток-шоў «Такі лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе. Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Спакуса». ЗША - Францыя, 2001 г.
**22.50** Змяшаныя адзінаборствы. Матчавая сустрэча Беларусь - Азербайджан.
**23.50** Фільм «Час развітання». Францыя, 2005 г.
**01.15** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.05** Фантастычны баявік «Вавілон нашай эры» (ЗША- Францыя-Вялікабрытанія).
**07.55** «Правы чалавека».
**08.10** Дабравест.
**08.35** Мір вашай хаце.
**08.45** Гаспадар.
**09.20** Тэлебарометр.
**09.25** Містычная меладрама «Прадчуванне» (ЗША).
**11.20** Кінаспробы.
**11.55** Страсці па культуры.
**12.40** Серыял «Маргоша» (Расія).
**16.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**19.25** Камедыя «Самая абаяльная і прывабная» (СССР).
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.45** Гістарычны дэтэктыў «Вершнік з імем Смерць» (Расія).
**23.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга.

**РОССИЯ**

**07.00** «Пакой смеху».
**07.50** Фільм «Выратаваць мужа». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама».
**12.35** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу». Працяг.
**17.40** «ХА». Маленькія камедыі.
**18.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Алена». 2010 г.
**23.10** «Адмысловы карэспандэнт».

**НТВ**

**07.30** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія дзеці».
**14.15** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**19.00** Сёння.
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**22.20** Прэм'ера. «Уй, НА-НА!» Шок-шоў.
**00.20** Фільм «Выйсці замуж за генерала».

**EUROSPORT**

**07.00** Live. Аўтаспорт. Чэмпіянат свету. Кітай. Раўнд 21.
**08.00** Live. Аўтаспорт. Чэмпіянат свету. Кітай. Раўнд 22.
**09.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Жанчыны. Адвольная праграма. Пекін (Кітай).
**10.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Пары. Адвольная праграма. Пекін (Кітай).
**11.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету. Кітай. Раўнд 22.
**12.00** Live. Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. «Залаты» этап.
**13.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Паказальны выступ. Пекін (Кітай).
**15.00** Live. Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. «Залаты» этап.
**16.00** Live. Марафон. Нью-Йорк (ЗША).
**19.00** Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 53 кг. Парыж (Францыя).
**20.00** Бокс. Турнір Bigger's Better. Партугалія.
**21.00** Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 62 кг. Парыж (Францыя).
**23.00** Мотаспартыўны часопіс.
**23.15** Ралі. Ралійная серыя IRC. Кіпр. Агляд.
**23.45** Настольны тэніс. Кубак свету. Камандныя спаборніцтвы. Дортмунд (Германія).
**01.45** Марафон. Нью-Йорк (ЗША).
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды».
**07.45** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**08.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял, 2003 г., Аўстрыя: 3 серыя.
**08.50** «Сонечная дзіда», серыял: 10 серыя.
**09.20** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.15** Чаму дэмакратыя? 7 серыя: «Жалезныя лэдзі Ліберыі».
**11.10** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.35** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**12.20** Два на два (тэледыскусія).
**12.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.15** Калыханка для самых маленькіх.
**13.40** Беларускія лёсы: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**14.10** «Каханне, здрада, жарсць», серыял, 2003 г., Аўстрыя: 3 серыя.
**14.55** «Наўцёкі», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**16.50** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Малая Масква», серыял: 4 серыя.
**18.05** Два на два (тэледыскусія).
**18.35** «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 5 серыя.
**19.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Дакументальная гадзіна: «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.05** Фільматэка майстроў: «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікабрытанія.
**00.20** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.30** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**01.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Бабруйск:(8 029) 628 75 01, Вольга
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга
Слуцк 8-044 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня
Всего

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

НОВЫ ЧАС

www.novychas.org

ЦІКАВА

# КАДАФІ — НОВЫ ЧЭ ГЕВАРА?

Алег НОВІКАЎ

**Кадафі памёр, а справа яго жыве, як мінімум, у сеціве. Як жа сустрэла пракадафісцкая інтэрнэт-супольнасць інфармацыю пра забойства свайго куміра?**

Аматары Джамахірыі дастаткова моцна падстаўлены ў інтэрнэце. Можна нават казаць пра нейкі феномен кадафаманіі, якая апошнім часам ахапіла сеціва.

Натуральна, існуе шэраг сайтаў дзяржаўных лівійскіх СМІ, кшталту Libyan Jamahiriya Broadcasting Corporation. Некаторыя з іх не працуюць, аднак некаторыя працягваюць распавядаць пра тое, што квітнеючая Лівія стала ахвярай сусветнай змовы.

Другая крыніца альтэрнатыўнай інфармацыі пра вайну ў Лівіі — сайты арганізацый, якія ў мірны час займаліся вывучэннем «Зялёнай кнігі». З пачаткам вайны яны аўтаматычна ператварыліся ў інфармацыйна-каардынацыйныя цэнтры. Штаб гэтага руху, які называецца «Сетка супраціву за наўпроставую дэмакратыю і Лівійскую Джамахірыю», зараз месціцца ў Брусэлі. Яго каардынатарам з'яўляецца сціплы выкладчык Люк Мішэль. Пры гэтым тэксты ён піша эмацыйныя: «Мы адпрэчваем вяртанне ў Лівію старых дэманаў мінулага, якіх палкоўнік Кадафі выгнаў яшчэ сорак гадоў таму: фашызм, рэакцыйны ісламізм, панаванне манархістаў і партыйных карупцыянераў, замежны шпіянаж і раскраданне нацыянальнага багацця».

Акрамя таго, існуе шмат нізавых калектыўных або індывідуальных ініцыятыў. «Рэдактары» такіх сайтаў галоўным чынам робяць дайджэсты навінаў з фронту і даюць наведвальнікам права выказаць усё, яны думаць пра палітычны момант, у форме каментара.

Аналіз зместу каментараў дазваляе лёгка намаляваць сацыяльны партрэт сярэдняга прыхільніка Кадафі, прынамсі ў нашых постсавецкіх шыротах. Гэта моладзь левых поглядаў або больш дарослыя людзі, якія грамадзянскую вайну ў Лівіі праектуюць на сітуацыю ў сваіх краінах. Яны сімпатызуюць Кадафі, паколькі ён выступае супраць усяго сусветнага палітыкуму, уключаючы кіраўніцтва іх краіны. Такім чынам, праяўляючы салідарнасць з Кадафі, можна паказаць дулю ў кішэні Пуціну, Мядзведзеву, Януковічу і г.д.

Нарэшце, самая простая форма праяўлення любові да Кадафі — стаць сябрам старонак за Кадафі, якіх шмат у сацыяльных сетках. Тут абсалютны рэкорд паставілі сербы. Старонка Support for Muammar al Gaddafi from the people of Serbia на Facebook мае каля 77 тысяч сяброў.



Раней людзям паказвалі лядоўню з Кадафі, а цяпер — лядоўню, дзе ляжаў Кадафі

Пачатак мінулага тыдня не прадвяшчаў трагедыі. Інтэрнэттусоўка кадафістаў хутчэй знаходзілася ў прыўзнятым настроі. Апошнія зводкі баёў пад Сіртам і спроба паўстання лаялістаў у Трыпалі разглядаліся як доўгачаканы пералом у кампаніі. Час ад часу на сайтах з'яўляліся навіны гістарычнага маштабу.

Так, 14 кастрычніка ў Жывым журнале можна было даведацца пра тое, што «Лівійскі супраціў нечакана для мяцежнікаў атакаваў іх пазіцыі ў сталіцы. Байцы лівійскага войска захапілі і знішчылі склад, на якім была зброя, дастаўленая агрэсарамі. Потым былі блакаваныя буйныя дарогі, а таксама шаша на аэрапорт. Лівійскія патрыёты прасоўваюцца да Зялёнага пляца (Цэнтральная плошча ў Трыпалі)! Мяцежнікі ў разгубленасці».

Ніякага працягу і развязкі навіны такога кшталту не атрымлівалі, аднак асаблівай увагі на гэта не звярталі. Падтрымлівалі высокі дух і незвычайныя забаўкі. Да прыкладу, сайт Kaddafi.ru правёў сярод чытачоў апытанне: які заходні горад павінен быць першым аб'ектам ракетнага ўдару лівійскай арміі? Падводка была наступная: «Рада бяспекі ААН упершыню санкцыянавала вайну супраць краіны, якая ні з кім не ваюе, не ўяўляе ніякай пагрозы міжнароднаму свету і бяспецы — Лівіі. Мы лічым, што Лівія павінна адказаць агрэсарам іх жа зброяй». Натуральна, у кастынгу гарадоў, якi, на думку кадафістаў, трэба бамбіць першымі, перамог Нью-Ёрк — 47 працэнтаў.

Тым больш шакуючай для кадафістаў стала навіна пра захоп у палон, а пасля смерць правадыра.



Чытаючы каментары, разумееш — для шмат каго гэта была сапраўдная асабістая трагедыя. «Уключыла тэлевізар і... Карацей, ледзь не страціла прытомнасць, а навіны не змаўкаюць. Усе такія, нягоднікі, радасныя, што Кадафі забіты. Сяджу, выю, але паўтараю: не веру, не веру… Не разумею… Кадафі, ты павінен перамагчы гэтых пачвараў!!! Як жа я іх усіх ненавіджу! Перамогі вам, лівійцы!!!» — піша на форуме на сайце http://za-kaddafi.ru нехта Алена.

Наступнай рэфлексіяй пасля шоку стала ідэя, што навіна пра смерць Кадафі — гэта fake (англ.: фальшывая навіна) або плётка, якую спецыяльна запусцілі паўстанцы і саюзнікі. Знайшлося мора доказаў на карысць гэтай тэорыі.

Вось тыповая дэканструкцыя натаўскай інфармацыйнай праваказыі: «Падобна, сцэнар «смерці» Кадафі, мяркуючы па ўсім, пісаў той жа натаўскі сцэнарыст, які пісаў сцэнар «смерці» бен Ладэна. Паверыць у гэты натаўскі сюжэт ужо хоць бы таму цяжка, што з ваеннага пункта гледжання ні самому палкоўніку Кадафі, ні яго сынам не было ніякага сэнсу знаходзіцца ў Сірце. За той час, які прайшоў з пачатку вайны супраць Лівіі, натаўцы, безумоўна, знайшлі двайніка палкоўніка Кадафі, каб падсунуць яго даверлівай публіцы гэтак жа, як яны падсунулі двайніка бен Ладэна».

Каб вывесці натаўцаў на чыстую ваду, нават праводзілі эксперыменты: «Бачыў сёння гэту фотку (фотаздымак з забітым Кадафі). Уразіла якасць здымка. Тэлефонаў з такой камерай, хутчэй за ўсё, даўным-даўно няма ў жывых. Тым больш здымак зроблены, відавочна, пры дзённым асвятленні. У мяне ў хаце валяецца Samsung, яму 7 гадоў. Дык вось, здымкі з яго аказаліся ў 100 разоў выразней. Так што ўсё гэта падман».

Паступова грамадства змірылася з думкай, што паказаны ў рэпартажы «Аль-Джазіры» нябожчык і ёсць правадыр Зялёнай рэвалюцыі. Цяпер кадафісцкі свет галоўным чынам займаецца тым, што пагражае помстай. Часам гэта робіцца нават у паэтычных формах. Вось верш маладой марксісткі Франчэскі:

*«Пусть торжествует агрессор победу —*
*Пиррова будет победа ему.*
*Ждет поджигателей злая расплата,*
*Прокляты янки за эту войну».*

Відавочна, што ніякай сур'ёзнай базы пад такога кшталту пагрозамі няма. Можна было б прагназаваць, што феномен кадафаманіі проста знікне сам па сабе. Аднак тэндэнцыі ў палітычным жыцці Лівіі сведчаць, што Кадафі на доўгі час прапісаўся ў інтэрнэце і ў грамадскай дыскусіі. Прычына таму — трэнды ў самой Лівіі.

Вялікім плюсам для працягу справы Кадафі стала наяўнасць у паўстанцкім Нацыянальным лівійскім савеце фракцыі ісламістаў. Як вядома, савет ужо абвясціў пра тое, што новае заканадаўства краіны будзе складацца на базе шарыяту. Такі вектар развіцця падзей не можа не выклікаць трывогі ў іншых суседніх дзяржаў, якія змагаюцца з ісламістамі. Яны хоць зараз гатовыя даць кадафістам прытулак. Так, на тэрыторыі Алжыра знайшлі прытулак не толькі сябры сям'і Кадафі, але таксама ўрадавы тэлеканал, які распачаў свае вяшчанне ў эфіры. Пішуць пра тое, што ў Алжыр сышла вялікая група вайскоўцаў. Такім чынам, супрацьстаянне ў Лівіі працягваецца, а з ім будзе падагравацца інтарэс да асобы палкоўніка і яго тэорый. Некаторыя культуролагі нават прагназуюць, што ў перспектыве культ Кадафі зможа пасунуць культ Чэ Гевары.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Тым часам у беларускім урадзе не хаваюць таго, што рост коштаў працягнецца. Ужо заяўлена пра падвышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі і кошты праезду ў грамадскім транспарце. З дня на дзень чакаецца чарговы скачок цэнаў на бензін. У такіх умовах спадзявацца на тое, што кошты апусцяцца ці хоць бы стабілізуюцца не даводзіцца. Таму бізнэсмэны закладваюць будучы рост курсу долара ў кошт закупленых тавараў. У выніку атрымліваецца замкнёны круг — дэвальвацыя правакуе кошты, а высокія кошты спрыяюць дэвальвацыі. І цяпер кіраўніцтву краіны трэба прымаць меры па стабілізацыі коштаў на ўнутраным рынку. У адваротным выпадку дэвальвацыю беларускага рубля не спыніць.

**«Deutche Welle» (Германія)**

КДБ дазволілі ўсё. Па-сутнасці, гэта гісторыя пра вандраванне ў часе ў асобна ўзятай краіне. Па аб'ёму паўнамоцтваў спецслужбаў Беларусь хутка пачне сур'ёзна нагадваць СССР 1930-х. Парламент краіны цяпер разглядае папраўкі да закона «Пра органы дзяржаўнай бяспекі», якія дазволяць чэкістам пры любой нагодзе ўзломваць кватэры, затрымліваць апазіцыянераў і выконваць «іншыя даручэнні прэзідэнта». Кажуць, апазіцыю не забаронена зараз нават расстрэльваць.

**«Новое время» (Расія)**

Падзеі ў эканоміцы Беларусі могуць стаць паваротным пунктам для мясцовага малога і сярэдняга бізнэсу. Эканамічная палітыка, мяркуючы па ўсім, будзе змяняцца на карысць павелічэння магчымасцяў для беларускага прадпрымальніцкага класа, у якога ёсць энергія і жаданне працаваць і зарабляць. Пытанне толькі ў дакладным размеркаванні роляў у адносінах дзяржава—бізнэс, якое было б накіравана на рашэнне адзінай задачы па выхаду з крызісу.

**«Обзор» (Літва)**

Лукашэнка, чым вучнем па частцы жадання заставацца ва ўладзе любым коштам з'яўляецца Пуцін, выкруціцца, але не аддасць Расіі кантроль над галоўнымі беларускімі актывамі. Нават калі Расія ўсё ж зломіць на другім дзясятку гадоў барацьбы за беларускія актывы «бацьку», ніякія «белтрансгазы» і «беларуськаліі» эканамічнай і палітычнай магутнасці расійскай уладзе неададуць. Еўразійскі саюз — ідэя, запазычаная Пуціным у Назарбаева, — падобна, становіцца праектам, з якім дробнакаліберны савецкі чэкісцкі клерк хоча ўвайсці ў гісторыю. Задача грандыёзная: ашукаць гісторыю і законы быцця, двойчы ўвайсці ў адну і тую ж раку, стварыць імперыю з прабіркі.

**«Газета.Ру» (Расія)**

Дарэчы, больш за ўсё насцярожыла вельмі энергічная падтрымка ідэі Уладзіміра Пуціна пра стварэнне Еўразійскага саюзу з боку Аляксандра Лукашэнкі. Улічваючы тое, што сёння адбываецца з дэмакратыяй і эканомікай у Беларусі, усё гэта не можа не насцярожваць. Таму што, калі аб'ядноўваюцца не дзяржавы і народы, а дыктатары і аўтарытарныя рэжымы, гэта заўсёды прыводзіць да кепскага выніку.

**«Рэспубліка» (Казахстан)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГРУЗІЯ. ГЛАБАЛЬНАЯ ПАЦЯПЛЕННЕ СУПРАЦЬ РАСІЙСКАГА ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

Нядаўняе рашэнне карлікавай ціхаакіянскай Рэспублікі Вануату прызнаць незалежнасць Абхазіі, здаецца, не на жарт перапалохала афіцыйны Тбілісі. У рэгіён Ціхага Акіяна накіравана спецыяльная грузінская дыпламатычная місія, якую ўзначаліў сам Грыгол Вашадзэ, міністр замежных спраў. Яго задача зразумелая — не дапусціць працягу тэндэнцыі, калі астраўныя дзяржавы прызнаюць Абхазію і Паўднёвую Асецію ў надзеі атрымаць нейкі бонус ад Масквы. Літаральна на працягу аднаго тыдня міністр сустрэўся з калегамі з шэрагу краін — Палау, Кірыбаці, Папуа — Новая Гвінея і г.д. Калі меркаваць па афіцыйнай інфармацыі, яго задачай было праінфармаваць візаві пра грузінскі падыход да праблемы акупаваных тэрыторый. Цікава, што ў расійскай прэсе навіну пра вояж Вашадзэ ўспрынялі як знак перамогі расійскай дыпламатыі. Адзінае, што турбуе расійскіх аматараў абхазскага і асецінскага сепаратызму, — глабальнае пацяпленне. Па словах экспертаў, у перспектыве Вануату можа пагрузіцца на дно акіяну. Калі да гэтага часу ніхто іншы не прызнае Сухумі і Цхінвалі, можа атрымацца вялікі канфуз.

**Паводле грузінскай прэсы**

### ВЕНГРЫЯ. У ДЫРЭКТАРА-ГОМАСЭКСУАЛІСТА ЗАБІРАЮЦЬ ТЭАТР

Прагрэсіўная грамадскасць Венгрыі арганізавала збор подпісаў у абарону Роберта Алфелдзі, дырэктара папулярнага «Новага тэатру». Ужо год Роберта атакуюць сябры правай нацыяналістычнай партыі «За лепшую Венгрыю» («Йоббік»). Спачатку нацыяналісты абвінавацілі яго ў антыпатрыятычным рэпертуары, а цяпер арганізавалі кампанію, у цэнтры якой нетрадыцыйная сэксуальная арыентацыя дырэктара. Актывісты «Йоббік» нават заклікалі публіку называць тэатральнага кіраўніка не Роберт, а Раберта. І, здаецца, на гэты раз правым удалося дабіцца свайго. Мэр Будапешта, сябра правацэнтрысцкай партыі «Fidesz», які ўплывае на выбар кандыдатур на пасаду дырэктараў муніцыпальных тэатраў, прапанаваў зняць Алфелдзі. Адначасова яму прапанавалі на замену двух чалавек. Адзін з гэтага тандэму — Іштван Чурка, лідар руху венгерскіх антысемітаў. Такая прапанова выклікала пратэст венгерскай асацыяцыі тэатральных артыстаў. Зараз яны дружна збіраюць подпісы ў абарону Роберта.

**Паводле французскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ФРАНЦУЗЫ СУПРАЦЬ АЭС

25 тысяч чалавек адгукнуліся на заклік шэрагу грамадскіх экалагічных арганізацый і кандыдатаў ад левых партый, якія выступілі за спыненне эксплуатацыі французскіх АЭС. Францыя, нагадаем, з'яўляецца краінай, якая найбольш залежыць ад мірнага атаму. Атамныя станцыі даюць амаль 70 працэнтаў усёй электраэнергіі. Не дзіўна, што доўгі час за адмову ад АЭС выступалі толькі радыкальныя экалагічныя групоўкі. Нават Зялёныя былі вельмі асцярожныя ў сваіх патрабаваннях. Аднак падзеі на Фукусіме паступова змянілі баланс сіл. Увесну 77 працэнтаў французаў выступілі за тое, каб неадкладна пачаць працэс паступовага закрыцця атамных аб'ектаў. Маніфестацыі адбыліся прыкладна ў дзесяці гарадах. Найбольшая мела месца ў Рэне, дзе сабраліся 15 тысяч чалавек. Далучылася да гэтых пратэстаў і Эва Жалі — кандыдат Зялёных на прэзідэнцкіх выбарах 2012 года. У сваім выступе на мітынгу ў Рэне яна заявіла, што «дамінаванне АЭС у электрычнай індустрыі не стане перашкодай, каб за 20 гадоў цалкам пазбавіцца ад атамных станцый». Эва таксама заклікала да стварэння сталага полюсу палітычных сіл, якія выступаюць за такую альтэрнатыву. Парадаксальна, аднак адзінай салідная партыяй, якая можа падтрымаць Зялёных, ёсць правы Нацыянальны фронт. Пасля аварыі на Фукусіме яго лідар Марына Ле Пэн таксама асудзіла стаўку на атам.

**Паводле французскай прэсы**

### РАСІЯ. МЯДЗВЕДЗЕЎ ХОЧА ЗМАГАЦЦА З ІНШАПЛАНЕЦЯНАМІ



Прадстаўнік прэзідэнта РФ па пытаннях Сістэм супрацьпаветранай абароны (ССА) Дзмітрый Рагозін прыдумаў, як рэагаваць на сістэму ССА, якую ствараюць ЗША ў Еўропе. Яго ідэя мае назву «Сістэма стратэгічнай абароны Зямлі» і выступае за стварэнне сумеснай сістэмы супрацьпаветранай, супрацьракетнай і касмічнай абароны. У перакладзе на нармальную мову сістэма будзе накіравана супраць магчымых пагроз для Зямлі з космасу, — астэроідаў, камет і, як піша Рагозін, «іншых іншапланетных целаў». Кантроль над зямной ССА мяркуецца перадаць ААН. Сэнс усёй гэтай фантастыкі ў тым, каб РФ магла рэагаваць на ідэю амерыканскай ССА без «страты твару». Канцэпцыя ўжо была прадстаўлена Мядзведзеву, і вельмі зацікавіла кіраўніка дзяржавы. Застаецца дадаць, што персанаж расійскага касманаўта Льва Андропава, які ратуе Зямлю ў фільме «Армагедон» вельмі камічны. Ён з'яўляецца на экране, як правіла, у вушанцы, з гаечным ключом і бутэлькай гарэлкі.

**Паводле расійскай прэсы**

ІНІЦЫЯТЫВА

# ЕТА: ЯШЧЭ НЕ МІР

*Алег НОВІКАЎ*




**Тэрарысты баскскай нацыяналістычнай арганізацыі ЕТА абвясцілі, што складаюць зброю, і прапанавалі дыялог іспанскаму ўраду. Здаецца, Мадрыд не гатовы выкарыстаць гістарычны шанс.**

«ЕТА заяўляе пра поўнае прыпыненне вайсковай актыўнасці», — пра гэта паведамілі тры чалавека ў масках на відэа, якое з'явілася на сайтах газет «Gara» і «Berria». Такім чынам, фармальна, закончыўся апошні вайсковы канфлікт у Еўрасаюзе. Баскскія нацыяналісты, якія 46 гадоў змагаліся за суверэнітэт краю з дапамогай бомбаў і куль, зараз кажуць, што гатовыя «жыць дружна». «У Краіне Баскаў пачынаецца новая палітычная эра. Не гвалт і рэпрэсіі, а дыялог павінен вызначаць правілы новага палітычнага цыклу», — гаворыцца ў адным з фрагментаў заявы.

Такая заява чакалася. Нагадаем, што апошнім часам у баскскім нацыяналістычным руху тон задаюць прыхільнікі паўночна-ірландскай мадэлі рашэння канфлікту — дыялог, стаўка на мірны палітычны працэс. Сама капітуляцыя ЕТА стала лагічным працягам міжнароднай мірнай канферэнцыі, якая адбылася ў Сан-Себасцьяна ў мінулы ўік-энд.

Да гэтага мерапрыемства баскі рыхтаваліся доўга і ўпарта. У выніку ў Сан-Себасцьяна сабралася вельмі прэзентабельная кампанія (дастаткова сказаць, што адным з удзельнікаў сустрэчы быў экс-сакратар ААН Кофі Анан). Па выніках канферэнцыі была агучана так званая своеасаблівая дарожная карта вырашэння канфлікту. Графік прымірэння наступны. Спачатку ЕТА складае зброю. Пасля Мадрыд і Парыж пачынаюць мірны дыялог з тэрарыстамі, але абяцаюць пры гэтым «паважаць свабоду жыхароў Краіны Баскаў». Праект прымірэння падтрымалі былы прэм'ер Тоні Блэр і былы амерыканскі прэзідэнт Джымі Картэр.

**План уключае стварэнне інстытуту баскскага грамадзянства і ўступленне Краіны Баскаў у склад Еўрасаюзу. Прычым раздаваць баскскія пашпарты збіраюцца не праз сто гадоў, а ўжо ў 2015-м**

ЕТА аператыўна выканала інструкцыю падпісантаў. У сераду, 23 кастрычніка, была распаўсюджана згаданая вышэй заява пра прыпыненне ўзброеных акцый.

А вось Мадрыд і Парыж пакуль не спяшаюцца прыслухоўвацца да парадаў падпісантаў дэкларацыі.

Хасэ Луіс Радрыгес Сапатэра, цяперашні прэм'ер ад Сацыялістычнай рабочай партыі (PSOE), назваў заяву сепаратыстаў «перамогай дэмакратыі, закону і розуму». Аднак пры гэтым ён падкрэсліў, што «іспанцы здольныя будаваць дэмакратыю без дапамогі тэрарыстаў». Такая пазіцыя часткова тлумачыцца тым, што кандыдатам PSOE на хуткіх выбарах будзе былы міністр унутраных спраў Альфрэда Перэс Рубалькаба, які зрабіў сабе імя на праследзе баскскага экстрэмісцкага падполля. Нядзіўна, што Рубалькаба паспрабаваў запісаць капітуляцыю ЕТА ў свой актыў, заявіўшы, што гэта следства яго геніяльнай паліцэйскай стратэгіі.

Важнай таксама з'яўляецца думка правай апазіцыі, якая мае добрыя шансы вярнуцца пасля прызначаных на 20 лістапада выбараў да ўлады. Старшыня Народнай партыі (PP) Марыяна Рахой назваў удзельнікаў канферэнцыі ў Сан-Себасцьяна тымі, «хто падтрымлівае ЕТА». Тое, што ЕТА пайшла на міравую, для Рахоя проста «добрая навіна». Своеасаблівым нашым адказам Чэмберлену стала праядзенне пад патранажам кансерватараў канферэнцыі родных — ахвяраў тэрору ЕТА. Як і трэба было чакаць, вынікам канферэнцыі стала рэзалюцыя ў духу «мачыць у сарціры».

Такая агрэсіўная рыторыка фаварыта кампаніі, здавалася, сведчыць пра бесперспектыўнасць пачатку дыялогу. Больш таго, народнікі ўсур'ёз збіраюцца вярнуцца да пытання забароны партыі «Bildu» (нядаўна зарэгістраваная партыя левых баскскіх нацыяналістаў), якая, на іх думку, выконвае функцыі палітычнай вітрыны ЕТА.

Нават калі Мадрыд пагодзіцца з рэзалюцыяй канферэнцыі ў Сан-Себасцьяна, паўстане шмат тэхнічных праваых пытанняў. Асобны пункт тэксту дэкларацыі тычыцца прымірэння бакоў. Аднак што гэта значыць на справе? Нават фармат дэкларатыўнага фармальнага прабачэння за былыя грахі выклікае цяжкасці. Каяцца павінныя не толькі тэрарысты, якія за паўстагоддзя забілі каля 800 чалавек, аднак і дзяржава. Як вядома, у 1980-я гады пры кабінеце іншага сацыяліста, Філіпа Гансалеса, дзейнічалі чорныя эскадроны — «Група антытэрарыстычнага вызвалення» (GAL), якая тайна выкрадала і забівала баскскіх актывістаў.

Па-другое, не зразумела, што рабіць з баскамі, якія асуджаны за ўдзел у нацыяналістычным руху. Сёння прыкладна 800 вязняў такога кшталту раскіданыя па розных турмах Іспаніі. Калі казаць пра канчатковае прымірэнне, то іх трэба таксама выпускаць.

Нарэшце, ёсць самае балючае пытанне: якім можа быць вынік дыялогу? У нядзелю ў Більбаа прайшла 50-тысячная дэманстрацыя нацыяналістаў, якія ясна выказаліся за тое, што ім патрэбна. «Independencia!» («Незалежнасць!»), — скандаваў натоўп. Не думаецца, што такія лозунгі зразумеюць у іспанскіх дзяржаўных колах. Кажучы іншымі словамі, дыялог, пра які так мараць баскі, з самага пачатку падаецца асуджаным на фіяска з-за палюснасці поглядаў актораў.

Аднак эксперты просяць песімістаў не адчайвацца, а дачакацца вынікаў выбараў. Калі «народнікі» не атрымаюць у Картэсах большасць, іх урад будзе залежыць ад падтрымкі дэпутатаў малых партый. Гэта ў тым ліку дэпутаты з умеранай Баскскай нацыяналістычнай партыі (PNV), што могуць распачаць някепскі гандаль сваімі мандатамі.

25 кастрычніка Інькга Уркулю — старшыня PNV — прадставіў публіцы амбіцыйны план атрымання Краінай Баскаў статусу асацыяванай дзяржавы ў складзе Іспаніі. План таксама ўключае стварэнне інстытуту баскскага грамадзянства і ўступленне Краіны Баскаў у склад Еўрасаюзу. Прычым раздаваць баскскія пашпарты нацыяналісты збіраюцца не праз сто гадоў, а ўжо ў 2015-м. На думку аўтараў праекту, цяпер існуюць усе падставы для рэалізацыі праекту. Перш за ўсё, таму, што палітычную павестку руху за незалежнасць Краіны Баскаў упершыню будуць вызначаць не тэрарысты, а нармальныя канструктыўныя партыі. Так што застаецца дачакацца 20 лістапада і яго наступстваў у іспанскай палітыцы.

Таксама не выключана, што ідэю дыялогу ў перспектыве ўсё ж падтрымаюць сацыялісты. Тое, што наступныя выбары яны прайграюць, з'яўляецца тайнай Палішынеля. І пасля запраграмаванай электаральнай катастрофы ў апараце сацыялістаў чакаюцца вялікія кадравыя ракіроўкі і карэкціроўка палітычнай праграмы. Гэта, магчыма, будзе тычыцца і баскскага блоку. Патксі Лопес, кіраўнік баскскай секцыі PSOE, выступіў за тое, каб сацыялісты падключыліся да дыялогу, паколькі «могуць застацца на перыферыі працэсу».

КАМЕНТАР

# РУСКІЯ ІДУЦЬ

**4 лістапада Расія святкуе Дзень расійскага адзінства, які па сутнасці ператварыўся ў свята расійскіх нацыяналістаў. Па ўсёй Расіі пройдуць так званыя «Рускія маршы», якія патэнцыйна могуць закончыцца новымі пагромамі. Пра значэнне «Рускага маршу» для снежаньскіх думскіх выбараў журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з маскоўскім палітолагам Дзмітрыем Кастэнкам.**




***— «Рускі марш» стане першай акцыяй пасля беспарадкаў фанатаў на Манежнай плошчы. Гэты факт надае мерапрыемству асаблівы каларыт?***

— Безумоўна. Інакш бы напярэдадні 25 кастрычніка не былі агучаныя тэрміны, якія пракурор запрасіў для фігурантаў справы пра тыя беспарадкі. Усяго па гэтай справе праходзяць 5 чалавек, якім пагражае ад 3 да 8 гадоў. Такія тэрміны — прыкмета замоўленага характару працэсу. Аднак і без фанатаў нацыянальнае пытанне ў Расіі ў апошні час вельмі абвастрылася. У верасні 2011 года за лозунг «Россия для русских» выказвалася каля 20% насельніцтва. 52% адзначалі імклівы рост нацыяналістычных настрояў. Гэта дадзеныя «Левада-цэнтра». У дадатак толькі закончылася справа байца без правіл Расула Мірзоева, які нанёс «цяжкія цялесныя пашкоджанні» студэнту Івану Агафонаву. Удар прафесійнага спартоўца быў прычынай смерці маладога чалавека. У ліку тых, хто паручыўся за Мірзоева, былі прэзідэнт Дагестана і значная частка дэпутатаў Народнага сходу рэспублікі. Толькі рэакцыя грамадства прымусіла ўлады пакінуць спартсмена пад вартай. Не паспелі пасадзіць Мірзоева, як уся Масква пачала казаць пра студэнта Глеба Харытонава. 21 кастрычніка яго збілі ў метро каўказцы за тое, што ён спрабаваў абараніць ад іх дзяўчыну.

***— Чаму нацыянальнае пытанне стала актуальным менавіта за апошні год?***

— Ёсць старыя прычыны: у Крамлі, з аднаго боку, дазваляюць лаяльным палітструктурам і СМІ прапаганду нацыяналістычных ідэй, але, з іншага боку, не дапускаюць ніякай нізавой актыўнасці ў гэтым накірунку. Як папярэджваюць эксперты, гульня з тэмай нацыяналізму можа прывесці да страты ўладамі кантролю ў гэтым пытанні. Што на вачах, дарэчы, і адбываецца. Следствам рэалізацыі такога паліттэхналагічнага прыёму стала ўнікальная з'ява росту этнічнай самасвядомасці сярод вялікаросаў. Упершыню ў гісторыі людзі адносяць сябе да рускіх не па прынцыпу мовы або культуры, месца пражывання, а па крыві. У сваю чаргу, гэта імкліва стварае праблему інтэграцыі людзей іншых нацый у грамадства і эліту.

***— Што разумеюць самі нацыяналісты пад лозунгам «Россия для русских»?***

— Я, думаю, што ўсё абмяжоўваецца імперскім міфам і геапалітычнымі апетытамі. Па ідэі нацыяналістаў, «Рускаму маршу» ў гэтым годзе, апроч колькаснага вымярэння, трэба нарэшце надаць вымярэнне палітычнае. Гэта значыць, што ва ўсіх гарадах Расіі, дзе пройдзе марш, трэба абраць дэпутатаў у Савет Зямлі Рускай, які павінен стаць прадстаўнічым органам рускай нацыі. Па-сутнасці, падобная неадэкватнасць рэсурсаў і забабонаў адлюстроўвае слабую палітычную надбудову нацыяналістаў. Акрамя таго, што іх лідары ўвесь час сварацца, спецслужбы кантралююць іх, каб яны не перайшлі мяжы нейкага клубу. Фюрэраў нацыяналістычных аб'яднанняў часта імкнуцца ізаляваць пад рознымі падставамі: так, у мінулы панядзелак на Дзмітрыя Дзёмушкіна была распачата справа па артыкулу «Заклікі да масавых беспарадкаў».

***— Ці не могуць ва ўмовах арганізацыйнай слабасці нацыяналістычнага руху гэту ідэю эксплуатаваць вялікія думскія партыі?***

— Так. Абаперцыя на нацыяналістаў спрабуюць практычна ўсе партыі, якія ўдзельнічаюць у снежаньскіх выбарах у Дзярждуму. Перш за ўсё, гэта, натуральна, ЛДПР, на ўсіх мерапрыемствах якой закранаецца нацыянальная тэма. 10-мільённым тыражом выпушчана брашура лідара ЛДПР Уладзіміра Жырыноўскага «Рускія, цвярдзей погляд!». Аднак яшчэ больш месца прысвяціллі гэтай тэме камуністы. Яны хочуць вярнуць у пашпарт графу «нацыянальнасць». Акрамя таго, камуністы прапануюць вярнуць прынцып, які дзейнічаў у савецкі час, усталявання нацыянальнасці дзіцяці па нацыянальнасці яго бацькоў.

***— Нечакана апошнім часам у расійскіх правых колах набыў папулярнасць лозунг: «Хопіць карміць Каўказ!». Яго аўтары выступаюць за тое, каб Расія пакінула Каўказ каўказцам.***

— Наколькі я разумею, размова не ідзе пра тое, каб цалкам адпусціць Каўказ. Выступаюць за скарачэнне датацый рэгіёну да сярэднерасійскага ўзроўню. Тут, вядома, ёсць свае праблемы. Толькі 11 суб'ектаў федэрацыі не атрымліваюць датацый з цэнтру, і скарачэнне датацый адавочна справакуе крызіс у якім-небудзь з рэгіёнаў. Аднак далёка не ўсе правыя гатовыя адмовіцца ад каланіяльных тэрытарыяльных захопаў. Гэта не кладзецца ў логіку рэстаўрацыі імперыі. І тут мы маем абсалютна новую з'яву, калі простыя людзі ў большасці ратуюць за поўны выхад Каўказу са складу РФ, а нацыяналісты — не. Па-сутнасці, гэта такая новая форма расійскага нацыяналізму — нацыяналізм без імперскай настальгіі. Гэта нешта новае ў нашай палітычнай культуры.

***— Партыя «Адзіная Расія» таксама разыгрывае нацыяналістычную карту?***

— У іх таксама ёсць спробы выкарыстоўваць нацыяналістычныя настроі электарату. Гэта робіцца, напрыклад, за кошт Кангрэсу рускіх абшчынаў (КРО) — палітычнага праекту вядомага нацыяналіста Рагозіна. Кангрэс не ўвайшоў у пуцінскі Грамадскі народны фронт, аднак на днях заявіў, што падпіша спецыяльную дамову аб супрацоўніцтве з адзінароссамі. Што тычыцца афіцыйнай пазіцыі ўлады, то прэзідэнт Мядзведзеў неаднаразова забараняў палітычным сілам эксплуатаваць нацыянальную тэму. Аднак у рэальнасці справа трошкі іншая. Як пажартаваў адзін палітолаг, Крэмль раздае ліцэнзіі на эксплуатацыю нацыяналізму. Калі нацыяналізм наўпрост не пагражае тандэму, то яму дазваляюць казаць: «Россия для русских!».

***— Як ліберальная супольнасць ставіцца да ўздыму нацыяналістычных настрояў? Раней, як вядома, былі спробы зрабіць з правымі адзіны антыпуцінскі фронт.***

— Такія кансультацыі сапраўды мелі месца, аднак не верыцца, што нейкі нацыяналіст пойдзе на саюз з Нямцовым або Касьянавым, за якімі ў нацыяналістычным асяроддзі замацаваўся імідж нейкіх масонаў, габрэяў і г.д. У сваю чаргу, маскоўскі ліберал з этычных прычын ніколі не будзе братацца з фашыстам. Мяркую, што Крэмль баіцца іншага — каб лідары нацыяналістаў не падтрымалі лозунг Трыумфальнай плошчы, дзе збіраюцца дэмакраты. Тыя заклікаюць да байкоту парламенцкіх выбараў, што вельмі небяспечна для паліттэхналагічных гульняў у Крамлі. Масавую няяўку можна растлумачыць як пратэст супраць задуманай на прэзідэнцкіх выбарах ракіроўкі Мядзведзеў — Пуцін. Таму трэба чакаць ад Крамля нейкіх крокаў або правакацый з мэтай таго, каб і далей падтрымліваць бездань паміж дэмакратамі і нацыяналістамі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЮЛІЯ ЦІМАШЭНКА



Лідар украінскай апазіцыі чакае рашэння апеляцыйнага суда. Калі суд пакіне ў сіле папярэдні прысуд, то Юлія адправіцца за краты. Праўда, самі прыхільнікі Цімашэнка ўсё менш вераць у апраўдальны вердыкт. Як кажуць у партыі «Бацькаўшчына», трэба рыхтавацца да таго, што Цімашэнка стане ўкраінскім Хадаркоўскім. Аднак на гэтым кепскія навіны для лэдзі Ю. не скончыліся. У сям'і яе адзінай дачкі Яўгеніі таксама праблемы. Яна больш не жыве з брытанскім рокерам Шонам Карам. Сам Шон цяпер знаходзіцца на радзіме — у Вялікабрытаніі, дзе рыхтуецца да свайго канцэртнага турнэ, і вяртацца ва Украіну пакуль не збіраецца. 2 кастрычніка сужэнцы адсвяткавалі «чыгуннае» вяселле — 6 гадоў у шлюбе. Апошні раз Жэню і Шона бачылі разам 24 жніўня, калі Шон прыехаў на матацыкле пад Лук'янаўскую турму, каб падтрымаць цешчу. Разрыў шлюбу можа парушыць планы некаторых апазіцыянераў зрабіць Жэню Цімашэнка новым лідарам аранжавых.

### ГЕРМЕС БІНЭР



Губернатар аргенцінскай правінцыі Санта-Фэ, кандыдат у прэзідэнты Аргенціны ад Партыі сацыялістаў і кааліцыі Шырокі фронт аднаўлення на выбарах 23 кастрычніка прайграў прэзідэнту Крысціне Кіршнер, якая прадстаўляла рух перaністаў. Ён набраў 17 працэнтаў, а Крысціна — 53. Аднак вынік галасавання можна лічыць сенсацыйнай перамогай для Бінэра. Ён заняў другое месца, набраўшы больш галасоў, чым прадстаўнік Радыкальнага грамадзянскага саюза Рауль Рыкарда Альфансін, у якога 11 працэнтаў. Такім чынам, упершыню ў сучаснай гісторыі краіны была парушана формула палітычнага супрацьстаяння, калі на ўсіх выбарах перaністы змагаліся з радыкаламі. Цяпер галоўнай сілай апазіцыі нечакана для ўсіх сталі сацыялісты. Сацыялістычная партыя Аргенціны існуе аж з 1896 года і з'яўляецца сябрам Сацінтэрну. Аднак сацыяльны папулізм Эвы Перон у 1940-я гады пазбавіў іх статусу вядучай левай партыі. Такой партыяй сталі перaністы. І толькі на пачатку гэтага стагоддзя сацыялісты вярнуліся ў вялікую палітыку.

### ВІКТАР ОРБАН



Лідар кансерватыўнай партыі «Fidecz», прэм'ер Венгрыі, як высветліла прэса, моцна паўплываў на выніка парламенцкіх выбараў у Польшчы. Усё дзякуючы Яраславу Качыньскаму, правадыру кансерватыўнай партыі «Права і Справядлівасць». Ён заявіў, што ў выпадку перамогі краіна прачнецца ў Будапешце. Тая фраза моцна паўплывала на выбар палякаў, паколькі вынікі палітыкі Орбана вельмі супярэчлівыя. Ён праводзіць нацыянал-папуліцкі курс, канфліктуючы з прэсай і інтэлігенцыяй. Затое ў Венгрыі Орбана любяць. Інакш бы Венгерскі інстытут сляпых не зрабіў гіпсавую маску з твару прэм'ера, якую цяпер дэманструюць у адным з пакояў інстытуту. Такім чынам, па словах адміністратара, задаволеныя патрабаванні сляпых венграў, якія не могуць з-за праблем са зрокам пабачыць нацыянальнага лідара. Затое цяпер яны могуць прынамсі памацаць контуры яго фізіяноміі. У згаданым інстытуце да маскі твару прэм'ера з ранку да вечара цягнецца вялікая чарга.

З НАГОДЫ

# КАМУНІЗМ — ТРАГЕДЫЯ XX СТАГОДДЗЯ

29 кастрычніка грамадзянская супольнасць Беларусі адзначае як дзень Памяці ахвяр палітычных рэпрэсій. У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў Мінскай унутранай турме НКУС («амерыканцы») было расстраляна больш за 100 выбітных прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, а ўсяго за 1937 год у сталіцы Беларусі было пакарана смерцю больш як 80 тысяч чалавек.

А 30 кастрычніка 1974 года з ініцыятывы ўдзельніка праваабарончага руху ў СССР, палітвязня Краніда Любарскага ды іншых вязняў мардоўскіх і пермскіх лагераў упершыню быў абвешчаны Дзень палітвязня. Яго адзначылі сумеснай галадоўкай і запальваннем свечак у памяць пра бязвінна загінулых. З таго часу штогод 30 кастрычніка адбываліся галадоўкі палітвязняў.

З гэтай нагоды прапануем артыкул вядомага гісторыка Ігара Кузняцова.


Карціна «Сталінскія рэпрэсіі». Мастак Ігар Абросаў

Ігар КУЗНЯЦОЎ

**Сярод трагедый, што страсянулі сусвет у XX стагоддзі, рэальны камунізм — грандыёзны феномен эпохі, якая распачалася ў 1917 годзе і скончылася ў Маскве ў 1991-м, — займае адно з самых значных месцаў. Нарадзіўся ён раней за фашызм ды нацызм і перажыў іх на шмат гадоў, закрануўшы чатыры кантынента.**

Каб захаваць уладу, камуністычныя рэжымы пераходзілі ад злачынстваў адзінкавых, ад разні абмежаванай, выкліканай абставінамі, да злачынстваў масавых, да тэрору як сродку кіравання.

Злачынствы камунізму — гэта злачынствы супраць духу, супраць культуры наогул і нацыянальных культур у прыватнасці. Гэта масавыя забойствы людзей, гібель мужчын, жанчын, дзяцей.

Расправа ажыццяўлялася самымі рознымі спосабамі: расстрэл, павешанне, утапленне, забіванне да смерці; смерць у выніку штучна выкліканага голаду, пакіданне ахвяры на волю лёсу і забарона аказваць ёй дапамогу; дэпартацыя — смерць падчас транспартавання (перасоўванне пешкі ці ў непрыстасаваных вагонах), у месцах высылкі і прымусовых прац (знясільваючая праца, хваробы, недаяданне, холад). Выкарыстоўваліся таксама баявыя атрутныя рэчывы, арганізоўваліся аўтамабільныя катастрофы.

Агульная колькасць забітых набліжаецца да ста мільёнаў.

Прыроду гэтых злачынстваў вызначае артыкул 6 Статуту Нюрнбергскага трыбунала, у якім згадваюцца тры асноўных іх віды: супраць міру, ваенныя злачынствы, злачынствы супраць людскасці. Даследуючы ў сукупнасці злачынствы, здзейсненыя ленінска-сталінскім, а затым і іншымі камуністычнымі рэжымамі, мы сустракаемся з гэтымі трыма катэгорыямі.

Паняцце злачынства супраць людскасці ўключае шэраг дакладна вызначаных злачынстваў. Самым характэрным з іх з'яўляецца генацыд. Генацыд не заўсёды бывае таго тыпу, які абрынулі нацысты на габрэяў і цыган, — яго ахвярамі могуць стаць і сацыяльныя групы. У кнізе рускага гісторыка-сацыяліста Сяргея Мельгунова «Чырвоны тэрор у Расіі», выдадзенай у Берліне ў 1924 годзе, прыводзіцца інструкцыя, якую даў адзін з першых шэфаў Надзвычайнага камітэта Лацiс сваім памагатым: «Мы не вядзём вайны супраць канкрэтных асобаў, — піша Лацiс 1 лістапада 1918 года. — Мы нішчым буржуазію як клас. Не шукайце на следстве матэрыялу і доказаў таго, што абвінавачаны дзейнічаў словам ці справай супраць савецкай улады. Першае пытанне, што вы мусіце яму задаць, якога ён паходжання, выхавання, адукацыі ці прафесіі. Гэтыя пытанні і павінны вызначыць лёс абвінавачанага».

Бальшавікі вырашылі знішчыць фізічна, надаўшы гэтаму законную форму, любую апазіцыю, любы супраціў, хай нават і пасіўны, іх уладзе. Знішчэнню падпадалі не толькі палітычныя, але і сацыяльныя групы, такія, як дваранства, буржуазія, інтэлігенцыя, духавенства, а таксама групы прафесійныя — армейскія і флоцкія афіцэры, чыны жандармерыі і г.д.

Раскулачванне 1930–1932 гадоў было паўторам расказачвання ў значна большых маштабах. Здзейсненае па загаду Сталіна, яно праводзілася пад афіцыйным лозунгам: «Ліквідацыя кулацтва як класу».

Класавы генацыд у чымсьці сыходзіцца з генацыдам расавым: галодная смерць дзяцей кулака, ахвяр сталінскага рэжыму, «цягне на вагах» столькі ж, колькі галодная смерць габрэйскага дзіцяці ў гета, ахвяры рэжыму нацысцкага. Знак роўнасці паміж двума гэтымі фактамі ні ў якім разе не закранае выключнасці «асвенцымскага феномену»: мабілізацыі сучасных тэхнічных сродкаў для наладжвання самага сапраўднага «прамысловага працэсу» — будаўніцтва «фабрыкі знішчэння» з выкарыстаннем газу і крэмацыйных печаў.

Але падкрэслім усё ж адну асаблівасць шмат якіх камуністычных рэжымаў: сістэматычнае выкарыстанне голаду як зброі — улада імкнецца ўзяць пад кантроль усе наяўныя харчовыя запасы і праз сістэму рацыянавання (часцяком даволі складаную) пераразмяркоўваць іх у залежнасці ад «заслуг» тых ці іншых суб'ектаў.

Метады, пушчаныя ў ход Леніным і ўзведзеныя ў сістэму Сталіным, не толькі падобныя да метадаў нацыстаў, але з'яўляюцца іх папярэднікамі. Нацысты былі шмат у чым пераймальнікамі камуністаў.

Рудольф Гес, арганізатар і камендант лагера ў Асвенцыме, пакінуў знамянальнае сведчанне: «Кіраўніцтва Імперскай Бяспекі загадала даставіць камендантам лагераў досыць падрабязную дакументацыю, якая тычыцца рускіх канцэнтрацыйных лагераў. Сведчанні відавочцаў, уцекачоў з гэтых лагераў, далі нам ясную карціну ўмоў тамтэйшага жыцця. Варта асабліва падкрэсліць, што шлях, абраны рускімі для знішчэння цэлых папуляцый, палягаў у выкарыстанні людзей на катаржных працах».

Аднак той факт, што маштабы і метады масавага гвалту былі ўпершыню ўведзеныя камуністамі, і нацысты маглі толькі пераняць гэты досвед, не азначае ўсё ж, што можна ўсталяваць прамую сувязь паміж прыходам бальшавікоў да ўлады і з'яўленнем нацызму.

На мяжы 1920-х і 1930-х гадоў ГПУ паклала пачатак метаду ўстанаўлення квотаў: кожная вобласць, кожны раён павінны былі арыштаваць, выслаць ці расстраляць пэўны працэнт асобаў, якія належаць да «чужых сацыяльных груп». Гэты працэнт спускаўся зверху як партыйная дырэктыва. Вар'яцтва планавання і ўліку, манія статыстыкі захапілі не толькі сферу эканомікі, але і вызначылі тактыку і стратэгію тэрору.

З 1920 года бальшавікі сталі ўжываць гэтыя статыстычныя, нават сацыялагічныя метады: ахвяры адбіраліся па строга вызначаных крытэрах, на падставе анкет, запаўнення якіх ніхто не мог пазбегнуць.

Той жа самы «сацыялагічны» метад ужываўся Саветамі пры арганізацыі масавых высылак з Балтыйскіх дзяржаў і акупаванай часткі Польшчы ў 1939–1941 гадах. Перавозка высланых у таварных вагонах — абавязковая дэталь такіх акцый — падавалася настолькі важнай, што ў 1943–1944 гадах, у самы разгар вайны з нацыстамі, Сталін палічыў магчымым адклікаць з фронту тысячы вагонаў і дзясяткі тысяч салдат спецыяльных войскаў НКУС, каб у самы кароткі тэрмін правесці масавую дэпартацыю народаў Каўказа.

Думка пра падабенства нацызму і камунізму ў тым, што датычыцца іх метадаў знішчэння людзей, шмат каму можа падацца блюзнерскай. Але гэта толькі на першы погляд. Удар наносіцца не столькі па канкрэтнай асобе, колькі па групе людзей. Гэта група, вызначаная дзеячамі тэрору як «варожая», з'яўляецца часткай грамадства, і, паводле логікі генацыду, яна выкараняецца менавіта як група. І тады механізмы сегрэгацыі і адрынання, уласцівыя «класаваму таталітарызму», становяцца дзіўна падобныя на метады «расавага таталітарызму».

Жудасць вымагае тлумачэння. Сталін і Гітлер. Гром авацый у СССР і Германіі, пераўтвораных у філіялы НКУС і гестапа. Мільёны жыццяў, якія страцілі сэнс і цану. І смерць, якая стала штодзённасцю, універсальным спосабам вырашэння праблем паміж чалавекам і ўладай.

Ці быў сэнс у гэтых крывавых спектаклях? Чаму яны карысталіся такім поспехам у сучаснікаў? Ці ёсць мяжа тэрору, перайшоўшы праз якую тыраны перастаюць прыцягваць суграмадзян, ці ў генацыду, як і ў дасканаласці, няма межаў? Пра што думалі, што адчувалі тыя, хто галасаваў за дыктатараў, не ведаючы — ці ведаючы? — што заўтра апынецца ў камеры катаванняў? У што верылі дзясяткі мільёнаў, якія чакалі вырашэння свайго лёсу ў той час, калі мільёны ўжо былі знішчаныя ва ўсіх на вачах? Ці магчымы іншы канец дыктатуры, акрамя смерці самих дыктатараў? І, нарэшце, самае важнае і самае цяжкае пытанне: дзе шукаць гарантыі, што ўсё гэта не паўторыцца зноў?

Думка, якая спрабуе зразумець, што здарылася з нашай (ды і не толькі з нашай) краінай, як зачараваная, застывае перад падрабязнасцямі крывавага тэрору, шматзначнымі лічбамі стратаў і злавеснымі постацямі забойцаў. Гнеў і страх паралізуюць нас, і замест аналізу мы чуем праклёны.

Тут патрэбна не навука, тут патрэбен свой Нюрнберг. Але асудзіць тэрор і паставіць помнікі яго ахвярам і тым, хто змагаўся супраць злачынстваў, недастаткова. Помнікі можна знішчыць, можна забыць, каму яны пастаўлены. Толькі аналіз, разуменне і публічнасць могуць сарваць з таталітарнай улады яе містычнае покрыва і даць калі не гарантыю, то шанец на тое, што мінулае не вернецца.

Любая стабільная ўлада таму і стабільная, што псіхалагічна яна задавальняе шмат каго. Каб зразумець уладу, а не толькі вінаваціць яе, неабходна ўсвядоміць, якія нашы запатрабаванні задавальняліся такім паталагічным чынам.

Без гэтага які-небудзь новы энтузіяст таталітарызму зможа ўваскрэсіць яго пад нязвыклым абліччам, і мы занадта позна зразумеем, што забароны на алкаголь і курэнне могуць не так моцна адрознівацца ад знакамітай трубкі і любові да добрых грузінскіх вінаў. Безумоўна, важна зразумець, што «Сталін памёр учора», але яшчэ важней распазнаць, чаму Сталін «жывы» і сёння.

Нацысты планавалі пабудаваць сваё будучае грамадства на аснове «чысціні расы», камуністы — на аснове пралетарыяту, вычышчанага ад усякай «буржуазнай брыдоты». Пераробка двух грамадстваў задумвалася ў падобнай манеры, нават калі крытэры пазбаўлення ад непажаданых і былі рознымі.

Калі план прызначаны для ажыццяўлення ў сусветным маштабе, а нейкая частка чалавецтва абвяшчаецца нявартай гэтага новага ідэальнага свету, то адрозненне ад нацызму толькі ў адным: тут — страты (класы), там — раса.

Нельга таксама не звярнуць увагу на дзіўны кантраст. Пераможцы 1945 года законна паставілі ў цэнтр свайго прысуду нацызму яго злачынствы, і асабліва генацыд габрэяў. З тых часоў на гэту тэму напісаныя сотні кніг, знятыя дзясяткі фільмаў. Аднак няма такога кшталту даследаванняў камуністычных злачынстваў.

Калі чалавека зняважылі страхам, прынізілі яго права быць чалавекам — пра гэта прынамсі неабходна памятаць. Страта чалавечай годнасці мае дзве стадыі. Спачатку чалавек прымае зняваґу як непазбежнасць, потым — наогул забывае, што яго зняважылі. Гэта значыць, успрымае зняваґу як штосьці належнае.

Менавіта з такой меркай трэба ставіцца да таго, што ў Беларусі забываліся і забываюцца злачынства сталінізму, — як да знішчэння пачуцця нацыянальнай годнасці цэлага народа. Няўжо знішчэнне чужога народа — злачынства, а свайго ўласнага — палітычны перагіб, тэарэтычная памылачка?

Ёсць у Крымінальным кодэксе артыкул пра адказнасць за ўтойванне злачынстваў. Паводле яго можна абвясціць злачынцам, да прыкладу, маці, якая не змагла данесці на роднага сына як на «ворага народа». Але затое ні разу гэты артыкул не датычыўся да ўладу маючых асобаў, калі тыя хавалі злачынствы сваіх папярэднікаў.

Міжнародную канвенцыю пра неўжывальнасць тэрміну даўнасці да ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва падпісала і наша краіна. І, значыць, няма ім тэрміну даўнасці. Значыць, злачынна хаваць дакументы пра гэтыя злачынствы, злачынна хаваць месцы масавых расстрэлаў і пахаванняў. Не пачалавечы гэта…

ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ

# ЯЗЭП СТАБРОЎСКІ — ЛЕТАПІСЕЦ ВАЙНЫ

Сяргей ЧЫГРЫН

**З абвяшчэннем мабілізацыі 17 ліпеня 1914 года і ў адпаведнасці з сакрэтным прадпісаннем камандзіра трэцяй грэнадзёрскай артылерыйскай брыгады на выпадак вайны за №675, выдадзенай у 1913 годзе, у войска быў мабілізаваны і Язэп Стаброўскі (1870–1968) са Слоніма.**


Язэп Стаброўскі


Вайсковы агляд

Той самы Язэп Стаброўскі, які вучыўся ў Полацкім кадэцкім корпусе, а потым працягваў вучобу ў Александрыйскім артылерыйскім вучылішчы, дзе пазнаёміўся з будучым вядомым рускім пісьменнікам Аляксандрам Купрыным.

Той самы Язэп Стаброўскі, які перапісваўся з Львом Талстым. А ў час ганення Талстога царскім урадам, напісаў яму шчырае пісьмо ў падтрымку пісьменніка, здзівіўшы гэтым учынкам сваіх палкавых саслужыўцаў.

Той самы Язэп Стаброўскі, які падчас службы на Каўказе вёў баі з Шамілём.

Той самы Язэп Стаброўскі, які даслужыўся да палкоўніка, меў шмат ордэнаў і медалёў, які скончыў Маскоўскі археалагічны інстытут і Вышэйшыя археалагічныя курсы пры Самарскім універсітэце, быў членам-карэспандэнтам Віленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага таварыства і сябрам Яраслаўскага археалагічнага таварыства.

Той самы Язэп Стаброўскі, які восенню 1924 года арганізаваў у Слоніме выставу старадаўніх дакументаў і кніг, якія збіраў шмат гадоў і якая выклікала вялікую цікавасць у наведвальнікаў, асабліва сярод моладзі. Пасля яе закрыцця ўвесь сабраны археалагічны матэрыял і каштоўную калекцыю вырабаў каменнага веку Язэп Стаброўскі паклаў у аснову гісторыка-краязнаўчага музея, які расчыніў дзверы перад слонімскімі наведвальнікамі 20 верасня 1929 года.

Той самы Язэп Стаброўскі, які прызнаны яго землякамі самым знакамітым слонімцам XX стагоддзя.

Але гэта ўсё будзе пазней. А тады, з пачаткам Першай сусветнай вайны, Язэп Стаброўскі прыступіў да фарміравання 55-й артылерыйскай брыгады, якую і ўзначаліў.

Вайну ён сустрэў на паўночна-заходнім тэатры баявых дзеянняў. Нямецкія войскі наступалі на Маладзечна, а аўстрыйцы — у раёне г. Сокал. Каб не трапіць у акружэнне, рускія арміі, у ліку якіх была і 55-я артылерыйская брыгада Язэпа Стаброўскага, пачалі адступаць. Пра гэта ён успамінаў: «І вось усе атрады, якія знаходзіліся на плацдарме каля ракі Раўкі ў Польшчы, пачалі ўцякаць, бо германа-аўстрыйскія войскі не паспелі нам адрэзаць адступленне, і мы, паражняком, без баявых прыпасаў, якіх не хапала, без адпачынку, прайшлі і праехалі 900 км і дасягнулі мястэчка Турэц Мінскай губерні, дзе і размясціліся на зімоўку…».

Адной з галоўных прычын такога развіцця падзей Першай сусветнай вайны Язэп Стаброўскі называў шпіёнскую дзейнасць, якая была разгорнута немцамі на фронце і ў тыле арміі Расійскай імперыі. «Усім было вядома, што рускі фронт быў перапоўнены афіцэрамі нямецкай нацыянальнасці і прытым на вышэйшых камандных пасадах», — пісаў Язэп Стаброўскі ў сваіх запісах, якія захоўваюцца ў Слонімскім раённым краязнаўчым музеі. Ён узгадвае пра двух затрыманых пры яго непасрэдным удзеле шпіёнах. Адзін быў вельмі ветлівы, і нават перад простымі салдатамі здымаў капялюш, што яго і выдала. Як аказалася пасля затрымання, ён даўно знаходзіўся ў вышуку. Другога позна вечарам Стаброўскі сам заўважыў. Невядомы чалавек размаўляў з салдатамі. Яго затрымалі, але ніякіх дакументаў пры ім не знайшлі, акрамя аднаго рубля, які Стаброўскі ўзяў як рэчавы доказ і пад канвоем адправіў затрыманага да каменданта штаба корпусу. Аказалася, што нумар рубля быў яго канспірацыйным нумарам. Пазней шпіёна адправілі у камендатуру Варшаўскай крэпасці.

Калі 55-я артылерыйская брыгада знаходзілася каля горада Блонь недалёка ад Варшавы, адной з найважнейшых праблемаў, якія паўсталі перад Стаброўскім, было наладжванне сувязі, што пастаянна перарывалася. Кабель часта абразалі спецыяльна падрыхтаваныя людзі. Аднойчы вайскоўцы затрымалі яўрэя з Блоні, які хацеў перарэзаць тэлефонны кабель. За гэта яго расстралялі. Але ўсё роўна тэлефонныя кабелі псавалі. Тады Стаброўскі загадаў узяць трох закладнікаў — равіна, настаўніка і аднаго простага яўрэя — і папярэдзіў, што, калі выпадкі абрыву тэлефоннай сувязі будуць мець працяг, заложнікі будуць расстраляныя. Мясцовыя жыхары накіравалі да Стаброўскага дэлегацыю з прапановай дазволіць ім ахову тэлефоннай лініі. Язэп Стаброўскі адпусціў заложнікаў, ахоўнікам жа з мясцовых жыхароў выдаў спецыяльныя нумары, якія насыліся на вопратку. З таго часу тэлефонная сувязь больш не псавалася.

У баі з немцамі на рацэ Раўка пад Баржынёвым 18 мая 1915 года Язэп Стаброўскі быў атручаны ўдушлівым газам. Але яго ўдалося выратаваць. У лістападзе 1915 года ён прымае актыўны ўдзел у баях каля Баранавіч, у 1916 годзе — у баявых дзеяннях каля возера Нарач.

Загадам №3307 галоўнакамандуючага арміяй Заходняга фронту Язэп Стаброўскі быў узнагароджаны ордэнам Святога Раўнаапостальскага князя Уладзіміра 4 ступені, да якога дадалі яшчэ мячы і каснік. 7 чэрвеня 1916 года ён атрымаў званне палкоўніка рускай арміі, а яго 55-я артылерыйская брыгада была перайменавана ў 55-ы паркавы артылерыйскі дывізіён. У канцы 1916 года Язэп Стаброўскі атрымаў яшчэ адзін ордэн Святога Раўнаапостальскага князя Уладзіміра 3 ступені, а таксама ордэн Святой Ганны другой ступені з мячамі.

У войску Язэп Стаброўскі знаходзіўся аж на да красавіка 1918 года. А калі пайшоў у адстаўку, вярнуўся ў родны Слонім і да канца жыцця займаўся краязнаўствам.

У гады Першай сусветнай вайны Язэп Стаброўскі не толькі ваяваў, але вёў запісы і фатаграфаваў будні салдат, жахі вайны, людское гора. А калі прыехаў у Слонім, то зрабіў адмысловы альбом са здымкамі. Гэты альбом ён назваў «Крывавым следам». Ён налічвае 300 фотаздымкаў. Кожны здымак Стаброўскі падпісваў, рабіў невялікі каментар. Альбом Язэпа Стаброўскага зберогся да сённяшніх дзён. Ён захоўваецца ў Слонімскім раённым краязнаўчым музеі імя Язэпа Стаброўскага.

Фотаздымкі Першай сусветнай вайны Стаброўскага — гэта дакументальныя сведкі нашай нялёгкай гісторыі. Некаторыя з іх прапануючы чытачам «Навага часу».


У акопах


Чыстка акопаў гідрасульфатам пасля газавай атакі


Снарады







**Новы Час**
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1102

Падпісана да друку 28.10.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.